Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Літаратура і Мастацтва

№ 51 (2942)
22 снежня 1978 г.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

Выдаецца з 1932 г.
Цана 8 кап.



ПАЛЕССЕ...

Той, хто не быў тут, шукае пры сустрэчы вядомыя на цэлы свет краявіды — балоты, грэблі, джунглі вербалозаў і аеру. Шукае, бо такім увайшло яно ў нашы душы са старонак Коласа і Мележа, з легендаў і паданняў самога народа пра гэты край, гэту зямлю.

Сёння, паквітаўшыся з горкай мінуўшчынай, Палессе творыць свой новы дзень — спеліць буйны колас там, дзе гібелі адвеку балоты, пампуе нафту з глыбінь. Шчаслівая, радасная яго хада, звонкая, галасістая яго песня.

Не здзіўляйцеся, не пабачыўшы тых балот. Вы здзівіцеся светлай яве Палесся. Яно чакае новых сваіх песняроў.

УКАЗ ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА САВЕТА СССР

АБ УЗНАГАРОДЖАННІ ГЕНЕРАЛЬНАГА САКРАТАРА ЦК КПСС, СТАРШЫНІ ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА САВЕТА СССР, МАРШАЛА САВЕЦКАГА САЮЗА, ДВОЙЧЫ ГЕРОЯ САВЕЦКАГА САЮЗА ТАВАРЫША БРЭЖНЕВА ЛЕАНІДА ІЛЬЧА ОРДЭНАМ ЛЕНІНА І ТРЭЦІМ МЕДАЛЁМ «ЗАЛАТАЯ ЗОРКА»

За выдатныя заслугі перад Камуністычнай партыяй і Савецкай дзяржавай ва ўмацаванні эканамічнай і абароннай магутнасці Савецкага Саюза ў гады Вялікай Айчыннай вайны і ў пасляваенны перыяд, за нястомную працу ў барацьбе за мір і ў сувязі з днём нараджэння ўзнагародзіць Генеральнага сакратара ЦК КПСС, Старшыню Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР, Маршала Савецкага Саюза, двойчы Героя Савецкага Саюза таварыша **Брэжнева Леаніда Ільіча** ордэнам **Леніна** і **трэцім медалём «Залатая Зорка»**.

Першы намеснік Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР В. КУЗНЯЦОЎ.
Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР М. ГЕАРГАДЗЕ.

Масква, Крэмль.

19 снежня 1978 г.

ВЫЛУЧЭННЕ ПРАДСТАЎНІКОЎ

у састаў выбарчай камісіі па выбарах у Савет Нацыянальнасцей Вярхоўнага Савета СССР дзесятага склікання ад Беларускай ССР

У рэспубліцы пачалося вылучэнне прадстаўнікоў у састаў выбарчай камісіі па выбарах у Савет Нацыянальнасцей Вярхоўнага Савета СССР ад Беларускай ССР.

Настройшчыцу Мінскага вытворчага аб'яднання «Інтэграл» імя XXV з'езда КПСС, Героя Сацыялістычнай Працы Я. В. САЛАУЕВУ рэкамендавалі ў састаў выбарчай камісіі рабочыя, інжынерна-тэхнічныя работнікі і служачыя гэтага прадпрыемства.

На расшыраным пасяджэнні Прэзідыума Беларускага Рэспубліканскага савета прафсаюзаў вырашана вылучыць у састаў камісіі старшыню Белсаўпрофа М. Н. ПОЛАЗАВА.

Галоўны рэдактар Беларускай Савецкай Энцыклапедыі, народны паэт БССР, лаўрэат Ленінскай прэміі, Герой Сацыялістычнай Працы П. У. БРОЎКА рэкамендаваны ў састаў камісіі ад Саюза пісьменнікаў БССР.

Вылучэнне кандыдатаў у састаў выбарчай камісіі па выбарах у Савет Нацыянальнасцей Вярхоўнага Савета СССР ад Беларускай ССР працягваецца.

БЕЛТА.

У ГАСЦЯХ ГРУЗІНСКАЕ КІНО

Да 60-годдзя БССР і Камуністычнай партыі Беларусі Саюз кінематаграфістаў БССР арганізуе цыкл сустрэч з дзеячамі кінамастацтва братніх рэспублік.

Чарговымі гасцямі рэспубліканскага Дома кіно сталі грузінскія рэжысёры Лео Бакрадзе і лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Грузіі Эльдар Шангелая. Яны паказалі свае новыя фільмы. Дакументальная стужка А. Бакрадзе «Небам апантаны» расказала пра дзіўнага чалавека, 85-гадовага рамантыка Аляксея Уладзіміравіча Шчывукова, які яшчэ ў час маладосці сканструяваў махалёт — лятальны апарат з махаючымі крыламі. Па розных прычынах вынаходніку не ўдалося выпрабаваць машыну ў паветры. Нядаўна ён падарыў махалёт кутаісскім школьнікам з надзеяй, што хто-небудзь з іх давядзе да канца мару яго юнацтва.

Мастацкі фільм Шангелая «Мачаха Саманішвілі» атрымаў Галоўны прыз XI Усесаюзнага кінафестывалю ў Ерэване.

У праграму паказу быў таксама ўключаны мультыплікацыйны фільм «Мужычкі».

У абмеркаванні фільмаў прынялі ўдзел беларускія кінематаграфісты, крытыкі, гледачы.

ШЛЯХ ДА ПЕРАМОГІ

Варшаўскае выдавецтва «Чытэльнік» выпусціла ў свет у перакладзе на польскую мову аповесць Васіля Быкава «Яго батальён». Вядомы сучасны пісьменнік Войцэх Жукроўскі рэцэнзуе яе на старонках газеты «Трыбуна люду». Аўтар спасылаецца на асабістыя сустрэчы і гутаркі з В. Быкавым у Гродне і на «шляхах Міцкевіча» ў Беларусі. Ён прыгадвае тое вялікае ўражанне, якое зрабілі на польскага чытача папярэднія выданні такіх твораў, як «Альпійская балада», «Дажыць да світання», апавяданні аб подзвігу салдата на пярэднім краі і ў тыле ворага. Пра «Яго батальён» В. Жукроўскі гаворыць так: «Кніга напісана з пераканаўчай прастатой, багатай мовай... Такую кніжку мог напісаць толькі салдат і чалавек з вялікай сілай сумлення і гарачым сэрцам». Рэцэнзент адзначае высокую якасць перакладу, зробленага Уладзімірам Ківі́льшам так, што ствараецца ўражанне, быццам аповесць была напісана па-польску.

Б. ГУК.

ВІНШУЕМ З УЗНАГАРОДАЙ!

За плённую літаратурную дзейнасць і ў сувязі з васьмідзесяцігоддзем з дня нараджэння Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР узнагародзіў пісьменніка **АЛЯКСЕЕВА** Мікалая Іванавіча Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

ПРЭМ'ЕРЫ

Беларускі дзяржаўны акадэмічны тэатр імя Якуба Коласа паказаў прэм'еру спектакля, прысвечанага 60-годдзю БССР і Кампартыі Беларусі, — гераічную драму «Кастусь Каліноўскі» Уладзіміра Караткевіча. Рэжысура лаўрэата прэміі Ленінскага камсамола Беларусі Валерыя Мазынскага (асістэнт рэжысёра — Сямён Кохан), аўтар сцэнаграфіі — Аляксандр Салаўёў (мастак па касцюмах — Алена Смірнова), музыка Сяргея Картэса.

На здымку: у ролі Кастуся Каліноўскага заслужаны артыст БССР Уладзімір Куляшоў.

Фота К. СЯМЕНАВА.

МУЗЫЧНЫ ФЕСТЫВАЛЬ ЮНЫХ

У пачатку снежня ў Віцебску праходзіў дзіцячы фестываль беларускай музыкі, прысвечаны 60-годдзю БССР і Кампартыі Беларусі.

Свята музыкі выйшла далёка за межы абласнога цэнтра. Горад над Дзвіной прымаў гасцей з дзіцячай музычнай школы № 44 г. Масквы, музычных школ Смаленска, Ціраспаля (Малдаўская ССР), Лубны (Украінская ССР), Магілёва. Тысячы дзяцей у школах гэтых гарадоў спаборнічалі за права паездкі ў Віцебск.

Старанна падрыхтаваліся да музычнага свята юныя віцябчане, гаспадары фестывалю. Гэтаму папярэднічалі адборачныя выступленні, справаздачныя канцэрты.

Выключна багата была прадстаўлена на фестывалі харавая музыка. У дзень адкрыцця ў выдатным выкананні дзіцячых хораў Віцебска прагучалі дзесяткі цікавых сачыненняў, якія прадэманстравалі велізарныя магчымасці гэтага жанру.

У канцэртнай зале Віцебскага музычнага вучылішча выступілі цымбальны аркестр, аркестр рускіх народных інструментаў, ансамблі, дзесяткі юных салістаў на самых розных музычных інструментах.

Разам з выступленнямі юных музыкантаў адбыліся канцэрты выкладчыкаў дзіцячай музычнай школы № 44 г. Масквы для працоўных абласнога цэнтра.

Правядзенне дзіцячага музычнага свята ў Віцебску — яркая падзея музычнага жыцця горада напярэдадні слаўнага юбілею рэспублікі і Кампартыі Беларусі.

Л. ПРЫГУН.

ДЗІЦЯЧАЙ БІБЛІЯТЭЦЫ — 25 ГАДОЎ

Гэтымі днямі дзіцячая бібліятэка № 2 горада Мінска адзначае свой 25-гадовы юбілей. Звыш ста тысяч экземпляраў кніг мае яна ў сваіх кнігасховішчах. Бібліятэка рэгулярна арганізоўвае літаратурныя вечары і канферэнцыі, прысвечаныя важнейшым падзеям нашай Радзімы, гістарычным датам, юбілеям пісьменнікаў, праводзіць сустрэчы з літаратарамі, вучонымі, ветэранамі войнаў, з Героямі Савецкага Саюза і Героямі Сацыялістычнай Працы.

На сустрэчах у сценах бібліятэкі пабывалі ў свой час Я. Маўр, А. Якімовіч, В. Вітка, С. Шушкевіч, Э. Агняцвет і іншыя пісьменнікі.

Дваццаць пяць гадоў нязменна працуе загадчыкам бібліятэкі Аляксандра Лісоўская. Яна з вялікай любоўю адносіцца да прапаганды кнігі. Бібліятэка на вуліцы Кузьмы Чорнага стала вядомай і папулярнай.

С. ЯФІМАЎ.

РАДЫЁФЕСТЫВАЛЬ АБЛАСЦЕЙ

Беларускае радыё праводзіць фестываль абласцей рэспублікі, прысвечаны 60-годдзю БССР і Кампартыі Беларусі. Мэта фестывалю — шырэй азнаёміць слухачоў з важнейшымі гістарычнымі падзеямі, з вялікімі сацыяльнымі зменамі, што адбыліся на тэрыторыі Беларусі за гады Савецкай улады. Ужо прайшлі радыёдні Брэсцкай, Віцебскай, Гродзенскай і Гомельскай абласцей.

У праграме радыёфестывалю шмат увагі надаецца паказу культурнага жыцця рэспублікі. Так, у час радыёфестывалю Брэсцкіны ў эфіры прагучаў спектакль Брэсцкага абласнога драматычнага тэатра імя Ленінскага камсамола «Брэсцкая крэпасць» па п'есе К. Губарэвіча, музычная праграма «Я песню Брэсту прысвячаю» і канцэрт удзельнікаў мастацкай самадзейнасці «Мы—з Брэстчыны».

Шмат цікавых праграм пачулі слухачы, калі праходзіў радыёдзень Віцебскай вобласці. Яны змаглі пазнаёміцца са спектаклем І. Шамякіна «Снежныя зімы» ў пастаноўцы тэатра імя Я. Коласа, зрабіць завочнае падарожжа ў мемарыяльны музей Героя Савецкага Саюза М. Ф. Шмырова—Бацькі Міная, у абласны філіял Акадэміі навук БССР. У перадачы «Ад берагоў Дзвіны» прагучалі вершы маладых паэтаў Віцебшчыны.

У радыёднях Гродзенскай і Гомельскай абласцей было таксама шмат пазнавальнага з культурнага жыцця горада і вёскі. У літаратурна-музычных кампазіцыях «Як Нёмана хвалі» і «Песні лунаюць над Сожам» прагучалі вершы паэтаў Гродзеншчыны і Гомельшчыны. Аб літаратурным жыцці гэтых абласцей расказалі пісьменнікі Ю. Голуб і М. Даніленка.

Наперадзе — наступныя ўдзельнікі фестывалю: Магілёўшчына і Міншчына.

В. НІКАЛАЕЎ.

ТЭМАТЫЧНАЯ, ЮБІЛЕЙНАЯ

У Гомелі, у выставачнай зале, адкрылася юбілейная выстаўка мастакоў вобласці. На ёй прадстаўлены работы апошняга часу, якія мастакі прысвячаюць 60-годдзю роднай рэспублікі і Кампартыі Беларусі.

На выстаўцы можна пазнаёміцца з творамі самых розных жанраў. Звяртаюць на сябе ўвагу карціны В. Ягорава. Адна з іх «У Палацы піянераў» прысвечана шчаслівому дзяцінству, расказвае пра вялікія магчымасці для творчасці, што раскрыты перад савецкай дзятвой. Хвалююць гледача палотны Н. Палякова, М. Казакевіча, Д. Алейніка і іншых мастакоў. Выклікаюць цікавасць работы А. С. і А. І. Осіпавых. Мастакі працягваюць слаўную традыцыю славутай палехскай школы. Палюбіліся і запомніліся наведвальнікам выдатна аформленыя іхнія шкатулкі і роспісы.

Даволі поўна прадстаўлены на выстаўцы партрэтны жанр. Тут варта адзначыць творы Л. Арэшкі, Б. Кузняцовай, М. Ягоравай...

Не застаюцца па-за ўвагай работы гравёра В. Дзенісенкі, братоў керамістаў П. і В. Фей, плакаты А. Отчыка і іншыя творы.

Фальклор і сучаснасць

У Мінскім музычным вучылішчы імя М. Глінкі адбылася міжрэспубліканская тэарэтычная канферэнцыя па тэме «Фальклор у сучасным музычным мастацтве народаў СССР».

Сама тэма «Фальклор і сучаснасць» — адна з галоўных у музыказнаўстве апошніх гадоў. Агульныя і індывідуальныя рысы развіцця народнага мастацтва і іх узаемаадносіны, жыццё фальклору ў практыцы прафесійных і самадзейных калектываў кожнай рэспублікі, у сцэнічных, аратарыяльных, сімфанічных творах кампазітараў розных нацыянальных школ — аб гэтым вялі гаворку на адкрыцці канферэнцыі намеснік міністра культуры БССР М. П. Шаўчук, вядомы беларускі фалькларыст В. І. Елатаў, кіраўнік дэлегацыі Масквы В. У. Базарнава. Аб гісторыі і развіцці фальклору, аб народных калектывах сваіх рэспублік на працягу чатырох дзён расказвалі дэлегаты з Арменіі, Грузіі, Літвы, РСФСР і інш. Фальклорны ансамбль Мінскага музычнага вучылішча вельмі ўдала праілюстраваў даклад «Фальклор Беларусі»: з артыстызмам былі выкананы беларускія песні, паказаны шлюбны абрад (на здымку).

Агульную цікавасць выклікала тэма «Нацыянальная кампазітарская школа 70-ых гадоў і фальклор». У сённяшняй музыцы ідзе бурны працэс абнаўлення зместу, формы, выразных сродкаў, які спарадзіў новыя праблемы суадносін традыцыйнага і наватарскага, захавання індывідуальна-нацыянальнага характару твораў і г. д. Характарызуючы нацыянальныя рысы кампазітарскіх школ, дакладчыкі адзначалі адзіныя і агульныя для ўсёй савецкай музыкі ідэйныя прынцыпы: народнасць, але з новым падыходам да фальклору; дэмакратызм, але пазбаўлены спрашчэнняў у адносінах з слухачом; засваенне класічных традыцый рускага савецкага і перадавога заходняга мастацтваў, але з «папраўкай» на сучаснасць. Гутарка гэта працягвалася на сустрэчы з беларускімі кампазітарамі В. Войцікам, А. Мдзівані, Л. Захлеўным, У. Дарохіным.

Госці з саюзных рэспублік пазнаёміліся з гісторыяй Мінска і Беларусі, пабывалі ў Хатыні; слухалі ў філармоніі справаздачны канцэрт вышэйшых і сярэдніх мастацкіх навучальных устаноў, прысвечаны 60-годдзю БССР і Кампартыі Беларусі. Закрыццё канферэнцыі было адзначана канцэртам лепшых выканаўцаў — навучэнцаў Мінскага музычнага вучылішча імя М. Глінкі, вечарам інтэрнацыянальнай дружбы.

Н. КРУКОЎСКАЯ,
Фота аўтара.

У РЭДАКЦЫЮ ГАЗЕТЫ «ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА»

Дазвольце праз вашу газету выказаць сардэчную падзяку ўсім сябрам, таварышам, арганізацыям, установам, якія павіншавалі мяне ў сувязі з шасцідзесяцігоддзем і ўзнагароджаннем ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

Кастусь КІРЭЕНКА.

«РЭЧАНЬКА» ВЯРНУЛАСЯ З ГАСТРОЛЯЎ

З кожным годам пашыраецца канцэртная і творчая геаграфія народнага жаночага вакальнага ансамбля «Рэчанька» (мастацкі кіраўнік П. Кірэйцаў) Палаца культуры Гомельскага ўпраўлення бытавога абслугоўвання насельніцтва.

«Рэчанька» заваявала шырокую папулярнасць, любоў і павагу сярод шматлікіх аматараў самадзейнага мастацтва сваёй самабытнай манерай выканання рускай класікі, цікавых і складаных твораў савецкіх і зарубежных аўтараў, самадзейных кампазітараў Гомельшчыны і асабліва беларускіх народных песень.

Мастацкі кіраўнік П. Кірэйцаў напісаў для ансамбля больш чым дваццаць песень, якія гучалі не толькі на Гомельшчыне, але і далёка за яе межамі— у Чарнігаве, Кіеве, Мінску, Маскве, Смаленску, Брэсце, Ленінградзе, у Чэхаславакіі.

І вось толькі што ансамбль вярнуўся з гастрольнай паездкі па Сібіры, дзе самадзейныя артысты далі каля сарака канцэртаў, на якіх пабывала больш за 7 тысяч чалавек. Самадзейныя артысты выступалі перад будаўнікамі чыгункі Сургут-Урэнгой, нафтавікамі Саматлора, у гарадах і пасёлках Нижневартаўск, Хамінэй, Тарка-Сале, Тур-пе.

А. КОНЧЫЦ.

У ДОМЕ ЛІТАРАТАРА

15 снежня адбыўся ўрачысты вечар пісьменніка, генерал-маёра ў адстаўцы Мікалая Аляксеева, прысвечаны яго 80-годдзю. Вечар адкрыў народны пісьменнік БССР Іван Шамякін. Юбіляра віншавалі Іван Чыгрынаў, Мікалай Кругавых, Барыс Сачанка, Леанід Прокша, Аляксей Кулакоўскі. З цёплымі прывітаннямі да юбіляра звярнуліся суворавуцы, піянеры, прадстаўнікі Чырванасцяжнай Беларускай ваеннай акругі, артысты мінскіх тэатраў.

У заключэнне выступіў М. Аляксееў.

19 снежня прайшоў творчы вечар Івана Грамовіча, на якім выступілі пісьменнікі Іван Шамякін, Алесь Бачыла, Артур Вольскі, Алесь Савіцкі, Аляксей Русецкі. Гумарыстычныя і лірычныя навелы, а таксама ўрыўкі з твораў пісьменніка прачыталі артысты мінскіх тэатраў.

На вечары выступіў Іван Грамовіч.

ТВОРЧЫЯ ВЕЧАРЫ

СЕННЯ АМАЛЬ ВА УСІХ ТЭАТРАХ рэспублікі нясуць галоўную службу акцёры, якія лічаць сябе вучнямі народнага артыста БССР прафесара Д. Арлова. Яму належыць вялікая роля ў станаўленні і творчым развіцці Рускага тэатра БССР імя М. Горкага, мастацкім кіраўніком якога ён з'яўляўся. Прыкметны след пакінуў гэты майстра і ў мастацкім кінематографе, дзе стварыў яркія вобразы. Аб гэтым гаварылі ўдзельнікі вечара, прысвечанага 75-годдзю Дзмітрыя Аляксеевіча, што адбыўся ў Доме работнікаў мастацтваў у Мінску. Выступалі калегі Д. Арлова па сцэне, яго вучні, крытыкі. Былі паказаны сцэны са спектакляў купалаўцаў, Рускага тэатра БССР і Рэспубліканскага тэатра юнага гледача. Дэманстраваліся фрагменты з фільмаў «Гадзіннік спыніўся апоўначы» і «Надпіс на зрубе». Вёў вечар заслужаны дзеяч мастацтваў БССР В. Карпілаў.

ЁСЦЬ ТАКОЕ ПАНЯЦЦЕ — «акцёр-коласавец». Ёмістае і акрэслене. Калі глядзіш спектаклі з удзелам народнай артысткі БССР З. Канапелькі, адчуваеш сэнс і дух яго вельмі выразна. З нагоды дня нараджэння актрысы ў Доме работнікаў мастацтваў адбыўся яе творчы вечар, які меў пэўную праграму і называўся «Мая неспакойная сям'я». Кандыдат мастацтвазнаўства Т. Гаробчанка, якая вяла праграму, сябры і калегі юбіляра ахарактарызавалі ўклад Зінаіды Ігнатаўны ў тэатральнае мастацтва і яе грамадскую дзейнасць, памаглі актрысе паказаць галерэю вобразаў з яе вялікага рэпертуару.

НАМ ПІШУЦЬ

ГОМЕЛЬСКІ АБЛАСНЫ ДОМ РАБОТНІКАЎ АСВЕТЫ правёў пасяджэнне педагагічнай секцыі — сустрэчу выкладчыкаў музыкі і спеваў з самадзейнымі кампазітарамі Гомельшчыны. Сваімі творчымі планамі падзяліліся самадзейныя кампазітары Н. Велікоўіч, П. Кірэйцаў, В. Копыл. Затым выступілі хормайстар народнай капэлы настаўнікаў У. Курылін, які нядаўна стажыраваўся ў хоры імя Пятніцкага і дзіцячым хоры Цэнтральнага тэлебачання і радыё, і старэйшы кіраўнік мастацкай самадзейнасці Гомеля К. Карнілаў.

А. ЖЫЖНЕЎСКІ.

НА ПРАЦЯГУ ПЯЦІ ДЗЁН перад працоўнымі ардэнаноснай Віцебшчыны дэманстраваў сваё майстэрства Любускі ансамбль песні і танца з Зялёнагурскага ваяводства Польскай Народнай Рэспублікі. Самадзейныя артысты выступілі з канцэртамі ў Віцебску, Полацку, Новалукомлі, Гарадку. Больш за тры тысячы чалавек пазнаёміліся з самабытнымі песнямі і танцамі зямлі любускай.

У свабодны ад выступленняў час артысты з Зялёнай Гуры азнаёміліся з гістарычнымі мясцінамі Віцебшчыны, наведалі абласны краязнаўчы музей і музей Героя Савецкага Саюза М. П. Шмырова. Яны былі прыняты ў абласным і гарадскім камітэтах партыі.

А. РУСАКОЎ.

У КЛУБЕ ПАСЁЛКА БЯРЭЗІНСК Маладзечанскага раёна адкрылася чарговая мастацкая выстаўка работ майстроў народнай творчасці. На ёй прадстаўлены творы розных жанраў выяўленчага мастацтва, графікі, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Звяртаюць на сябе ўвагу работы М. Шчалканогава, Р. Абразея, Б. Няхайчыка, А. Унаткіна, А. Глускага, А. Свірскага.

У МАЛАДЗЕЧНЕ АДКРЫЛАСЯ ВЫСТАЎКА твораў народнага мастака БССР і РСФСР, ганаровага акадэміка Акадэміі навук БССР Вітольда Каэтанавіча Бялыніцкага-Бірулі. Выстаўку арганізавалі Дзяржаўны мастацкі музей БССР, бюро тэхнічнай эстэтыкі мэблевай фабрыкі, Маладзечанскі гарадскі аддзел культуры.

В. БАБЕЙ.

ФІЛОЛАГ— У ФІЛОЛАГАЎ

Нядаўна ў гасцях у студэнтаў беларускага аддзялення філалагічнага факультэта, супрацоўнікаў кафедры беларускага мовазнаўства Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя А. М. Горкага быў прафесар Карлавага універсітэта (Прага) Вацлаў Жыдліцкі — вядомы славіст і перакладчык, нястомны прапагандыст беларускай літаратуры ў Чэхаславакіі. Разам з ім прыйшлі беларускія пісьменнікі Я. Брыль і П. Макаль.

Усхвалявана пачынае размову прафесар Ф. Янкоўскі. Прыгадваюцца суровыя дні вайны, эпізоды партызанскага жыцця, барацьбы. Менавіта тады сустрэўся ён упершыню са славакамі і чэхамі, пачуў гучанне славацкай і чэшскай моў. Пасля вайны Ф. Янкоўскі — вучоны, пісьменнік— з вялікай увагай сочыць за навуковымі, культурнымі поспехамі братніх народаў. Паявіліся новыя сябры, знаёмыя...

Працягваючы пачатую размову, Я. Брыль падкрэслівае, што беларуская літаратура гучыць зараз на многіх мовах свету. Але найбольш папулярна яна ў нашых сяброў-славян.

— Сённяшні наш госць,— гаворыць ён,— прафесар Вацлаў Жыдліцкі пераклаў на чэшскую мову многія творы беларускіх пісьменнікаў. Сярод іх — «Людзі на балоце» І. Мележа, «Сэрца на далоні» І. Шамякіна, «Дзікае паляванне караля Стаха», «Нельга забыць», «Хрыстос прызямліўся ў Гародні» У. Караткевіча, «Дажыць да світання» В. Быкава, «Мсціжы» І. Пташнікава, кнігу народнай памяці «Я з вогненнай вёскі...»...

В. Жыдліцкі ўжо некалькі разоў наведваў Мінск, і вось — новая сустрэча. Першыя ж словы, сказаныя госцем на добрай беларускай мове, прыемна ўразілі аўдыторыю. Госць расказаў пра культурныя сувязі паміж ЧССР і БССР, якія ўвесь час узмацняюцца.

— Чарговая сустрэча з Беларуссю для мяне надзвычай дарагая,— сказаў В. Жыдліцкі. —Я набыў новых сяброў... Падарожнічаў, любаваўся дзівоснай вашай прыродай. Гэты час быў напоўнены і плённай працай, творчымі дыскусіямі з беларускімі пісьменнікамі, вучонымі, шчырымі, цёплымі гутаркамі, накшталт сённяшняй, са студэнтамі, выкладчыкамі. Дзякуючы гэтаму я глыбей пазнаў культуру вашага народа.

Шмат цікавага даведаліся прысутныя і з выступлення П. Макаля, які неаднаразова быў госцем славакаў і чэхаў.

М. АЛЯХНОВІЧ,
М. ЯЛЕНСКІ.

ЗБОР ТВОРАЎ АЛЕСЯ ЯКІМОВІЧА

Падпісчыкі атрымалі першую кнігу трохтомнага збору твораў вядомага беларускага дзіцячага пісьменніка, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі БССР Алеся Якімовіча. У яе ўвайшлі аповесці «Перамога», «Базылёў курган», «Адкуль ліха на свеце», «Кастусь Каліноўскі». Прадмову «Шчодрае сэрца пісьменніка» напісаў кандыдат філалагічных навук Іван Разанаў.

Гэта ўжо другое выданне збору твораў А. Якімовіча. Першае ў двух тамах выйшла ў 1967 годзе.

МУЗЕЙ У ІНТЭРНАЦЕ

У адным з холаў інтэрната № 10 Мінскага трактарнага завода, размешчанага ў маляўнічым месцы беларускай сталіцы ў мікрараёне Серабранка, адкрыўся музей карцін маладых рабочых. Тут экспануюцца семдзесят работ юнакоў і дзяўчат, якія свой вольны час аддаюць пэндзлю і мальберту.

Цікавы жывапіс у трактараздводцаў Яўгеніі Палтын і Віктара Асташонка. На прадстаўленых палотнах — жыццё завода. Вось толькі некалькі назваў іх работ — «Ідзе сталь», «Заводская прахадная», «Інжынер Ільюхіна», «Экспедытар Марына Ліпская». Дарэчы, В. Асташонак на грамадскіх пачатках з'яўляецца кіраўніком студыі, у якой займаюцца 15 аматараў выяўленчага мастацтва.

Удзельнікі студыі рабочыя Таццяна Кавалёва, Валянціна Урбановіч, Іван Клачкоў і іншыя лепшыя свае карціны падаравалі музею інтэрната.

А. ПРОЦЬКА.

НОВЫЯ ФАРБЫ МАНЕЖА

Гучыць сумная мелодыя. На што скардзіцца музыка, пра што расказвае яна? Пра цяжкую долю беларускага народа? Пра спрадвечную мару «людзьмі звацца»? Павольна ідзе стары сейбіт, нетаропка робіць ён сваю няхітрую, адвечную і, можа, самую галоўную на зямлі справу. Сее. Жыта? А мо— зерні гневу народнага?

З гэтых, магчыма, крыху мінорных таноў пачынаецца новая праграма-агляд мінскага цырка «Маладосць мая, Беларусь», прысвечаная 60-годдзю БССР і Камуністычнай партыі Беларусі.

Здавалася б, паказаць гісторыю рэспублікі за 60 год на манежы—задума даволі рызыкоўная. Але калі гаварыць пра самую відовішчнасць, дык можна ўпэўнена сказаць, што цырку з яго пастаянным імкненнем да шырокіх, маштабных пастановак, з яго каласальнымі рэзервамі эмацыянальнага ўздзеяння на аўдыторыю, пад сілу ажыццяўленне гэткай задачы.

Сапраўды, падпарадкаванае задуме рэжысёра (аўтар сцэнарыя і пастаноўшчык агляду У. Арлоў) дзеянне ўвесь час пераносіцца з манежа пад купал цырка, у глядзельную залу альбо на кінаэкран. Пастаянная змена па-цыркавому ўмоўных дэкарацый і касцюмаў артыстаў, эфектнае асвятленне, цудоўная аранжыроўка сучасных і народных беларускіх мелодый— усё гэта стварае ўражанне вялікага свята.

Поспех пастаноўкі, вырашанай выключна цыркавымі сродкамі (у ёй няма слоў), у многім залежыць ад індывідуальнага майстэрства артыстаў. І тут выйгрышнай і вельмі ўдалай знаходкай рэжысёра з'явілася тэма жаніха і нявесты. Тэма гэта чырвонай ніткай праходзіць праз увесь спектакль: шумная, яркая, каларытная сцэна вяселля, дзе мы сустракаемся з юнымі, прывабнымі Жаніхом і Нявестай (артысты Т. і Г. Бандарчукі), і нарэшце, акрабатычны эцюд, які ўспрымаецца як гімн цудоўнаму і вечнаму пачуццю.

Наогул цікавых, па-рэжысёрску дакладна пастаўленых і пакцёрску таленавіта выкананых сцэн у спектаклі шмат. Гэта ў першую чаргу такія фрагменты, як «Вставай, страна агромная!», «Пераможцы», «Танцпляцоўка», «Касманаўты»... Ёсць, канечне, і некаторыя хібы, расцягнутасці, нематываваныя пастановачныя хады. Аднак усё ж не яны вызначаюць у цэлым жывое, цікавае і яркае відовішча. І, калі ўжо гаварыць пра ўдачы, дык відавочная з іх, на наш погляд, удзел у спектаклі маладых беларускіх клоунаў Ф. Гулевіча і А. Варанецкага, іх нацыянальныя каларытныя вобразы хлопцаў-беларусаў, іх пазітыўны, шчыры і добры гумар робяць прыкметны ўплыў на спектакль, дадаючы да яго якраз тое, чаго мы так часта не бачым у аналагічных пастаноўках—жвавасць. І што асабліва характэрна, іх рэпрызы надзвычай арганічна ўплятаюцца ў тканіну спектакля — быццам спецыяльна для яго напісаныя.

А. РОСІН.

На здымку: клоуны Ф. Гулевіч і А. Варанецкі.

Фота А. ДЗМІТРЫЕВА.

Васіль МАКАРЭВІЧ

Беларусь мая...

Аблокі
За кужаль бялей.
Далеч наліта
Сінечаю...
Беларусь мая,
Твой юбілей
На небе гадоў
Высвечвае!

Каб ён
Задыякам гарэў,
Дату б між зорак
Высекчы!
Шэсцьдзесят год,
Як дрэў,
За тваімі плячамі
Высяцца.

На зайздрасць
Мінулых вякоў,
Свету наўздзіў,
Па-сталаму
Шэсцьдзесят год тарпоў
На ніве стагоддзя
Пастаўлена.

Удалеч зірні з-пад рукі,
Між іх,
Вятрамі асмужаных,
Ёсць годы-працаўнікі
І годы — змаганцы мужныя!

Насунуўшы нізка брылі,
Нідзе не губляючы пільнасці,
Яны то ў агні брылі,
То ў рэках
Ледзь не тапіліся.

А колькі працята
Гадоў
Вайны рыкашэтным
Пошчакам!..
Самоцяцца годы удоў,
Світаюць годы-падпольшчыкі!

Прымружся ў светлай журбе:
За часу смугой,
За датамі,
Плугі валакуць на сабе
Полем годы-аратыя.

Сталіца
Ці кут глухі —
Не спасавалі, не схібілі,
Ўзнімалі гады-лемяхі
Праўды людское
Скібіны.

Развагі мудрай
Стае!
Рэспубліка ў летнім пошугу,
Гады, яны ўсе — твае,
Ад першага
І да апошняга!

Яны для цябе, як сыны,
З абсіваранымі губамі,
Годы вайны,
Цаліны,
Лукомля і годы БАМа.

Душу сваю
Радасцю ці наталю?
І юныя і ссутуленыя
Усе шэсцьдзесят год
Тулю,
І зноўку да сэрца
Прытульваю!

●

Пасвячэнне — рытуал свяшчэнны! —
На вачах бацькоў, таварышоў.
Сам стаіш - у маладым свячэнні,
Быццам на Эльбрус ты узышоў.

Пасвячэнне — сэрца прысвячэнне
Подзвігам бясстрашным і гадам.
Трэба? Ў час світальны ці вячэрні
Ты жыццё аддай і не гадай!

Пасвячэнне — хіба адрачэнне
Ад бароў і ад былых сяброў?
Гэта і дынастый адраджэнне,
І збліжэнне ўсіх мацерыкоў.

Пасвячэнне — мэты набліжэнне!
І яно патрэбна сёння нам,
Як зямлі раскручанай —
вярчэнне,
І як сонца — маладым барам!

●

СЯБРУ

Тугія цёплыя пялёнкі.
І галасісты, як знарок,
З іх, нібы з круглае палонкі,
Свяціўся ўсмешлівы сынок.

Якой угледзіла хвілінай,
І усяго за ноч адну
Хвароба страшная спаліла
І апранула у труну?..

І не труна, а проста трунка
Яго павезла да усіх.
А бацьку млосна,
бацьку трудна.
І ўжо ні выдых,
і ні ўздых.

Ах, пекла дня!
Ах, болю пекла!
Хоць іх зусім не варушы.
Смерць усё роўна як адсекла
У чалавека паўдушы.

А боль засне, то зноў прачнецца
І стане мучыць, як са зла.
Не ў чалавека,
ў чалавецтва
Каго ты, хіжая,
ўзяла?

Каб крыкнуць —
сілы ўжо не мае.
Адно што з вейка, як з ляза,
Сплыве балючая, нямая,
Агнём налітая сляза.

Калі б упала на магілу —
Пясок да века б прапякла.
І разбудзіла б,
ажывіла
Яго маленькага сынка!..

●

То знікаў, то недзе блізка віўся
Прывідам нябачным, незямным,
Покуль назусім не пасяліўся
Боль мой у паўшар'і галаўным.

Біты шлях ці сцежка палявая —
Быццам з апраметнай глыбіні,
Выплывае, грозна выплывае
Боль мой невыносны галаўны.

Колькі там да роднага парога?
Радасць і бяда —
адной чаргой!
Людзі, маці, доўгая дарога,
Ад чаго такое,
ад чаго?

Можа, гэта бацькава кантузія,
Што з апошняй не прыйшоў вайны,
І яна мяне нясцерпна тузае
Болем невыносным галаўным?..

А, магчыма, ўсе мерыдыяны
Там, дзе смерч бушуе агнявы,
Навылёт прайшлі неспадзявана
Цераз два паўшар'і галавы?

Я схіляю голаў ніжай, ніжай.
Аднаго жадаю і прашу:
Хай вам, злыдні, сэрцы боль праніжа,
Лютым зрэнкам зазірне ў душу!

Што вы бамбасховішчы рыхтуеце
І вакцыны нейкую бурду!
Уратуйце, добрыя, ўратуйце,
Адвядзіце ад зямлі бяду!

Каб на шэрым котлішчы стагоддзя
Не ўзышлі густыя палыны...

Ціха! Боль памалу адыходзіць,
Боль мой невыносны галаўны...

Алесь ВЕЧАР

Пачатак дарогі

Яшчэ не закрыты вайне ўсе дарогі, —
Ілгуць, што баяцца савецкіх пагроз,
І процьма звычайнай
і атамнай зброі
Яшчэ не спыняе свой жудасны рост.
На захадзе ўзахап імкнуцца пісакі
На нашу краіну звяглівa брахаць.
У іхняй брахні разбярэцца не ўсякі,
Аматараў шмат кінуць цень на наш шлях.
Вядома даўно,
што не ўсім даспадобы
Савецкага ладу высокі закон —
Усюды падтрымліваць сілу свабоды,
Вайну і варожасць
трымаць пад замком.
Нам ленінскі геній
раскрыў іх прыроду,
Пануючых класаў цяжкую віну.
Ваююць здаўна
між сабою народы,
Але ж не яны пачынаюць вайну.
Спазналі ўсю праўду
ў Расіі тым часам.
Гісторыя выйшла на працу з мятлой.
І масы сказалі
пануючым класам:
— Не трэба нам цемры,
хай будзе святло!
Хай будзе усюды Вялікі Кастрычнік!
Бязмежная радасць мільёнаў людзей
Самім накіроўваць
працэс гістарычны
Для шчасця грамадства,
касмічных надзей.
Улада багатых была над прадоннем.
Паны ратавалі яе карані.
Прыдумалі праўду
стрымаць на кардоне
Сярод беларускіх лясоў і раўнін.
Было, што на захадзе ўладу іх зверглі.
На доказ я памяць сваю валаку —
«Савецкая ўлада стварылася ў Венгрыі» —
Такую весць Леніну
слаў Бела Кун.
Тады ў дынамізме жыццёвага віру
Асіліць вайну мы, на жаль, не змаглі,
Паклоннікі войн
і стваральнікі міру
Ізноў ішлі ў бой
на ўзарванай зямлі.
І мір на планеце
сваю перамогу
Святкуе над доўгай і цяжкай вайной.
І ворагі міру
ўжо болей не могуць
Аблытваць народы імглой і маной.
Нам кажуць,
што войны вяліся спрадвеку.
Мы кажам, спрадвеку былі і паны.
Ім трэба хлусіць
аб правах чалавека,
Якому даюць толькі права вайны.
На ўзроўні высокім ідуць дыялогі,
Мір нельга працоўным здаваць на сезон.
Нялёгкі быў гэты пачатак дарогі,
Пачатак дарогі ў эпоху без войн.



Зімовы ранак.

Фотаэцюд І. АБРАЎЦА.

ШЧАСЛІВАЯ ДОЛЯ МАСТАЦТВА

АБ'ЯДНАНЫ ПЛЕНУМ ПРАЎЛЕННЯЎ ТВОРЧЫХ САЮЗАЎ РЭСПУБЛІКІ

60 БССР і КПБ

Творчая інтэлігенцыя рупліва і патрабавальна аглядае зробленае ва ўсіх галінах літаратуры і мастацтва, рапартуе народу і партыі аб плёне сваёй дзейнасці, якая жывіцца і натхняецца ленінскімі ідэямі і праходзіць пад кіраўніцтвам ленінскай партыі. Аб народнасці і партыйнасці, аб рэалістычнай школе і вялікіх традыцыях у беларускім савецкім мастацтве і літаратуры гаварылі ўдзельнікі ўрачыстага аб'яднанага пленума праўленняў творчых саюзаў рэспублікі, які адбыўся 14 снежня г. г.

Уступным словам пленум адкрыў лаўрэат Ленінскай прэміі, Герой Сацыялістычнай Працы, народны пісьменнік Беларусі Максім ТАНК.

На пленуме выступілі першы сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў БССР, народны пісьменнік рэспублікі І. ШАМЯКІН, старшыня праўлення Саюза мастакоў Беларусі, заслужаны дзеяч мастацтваў БССР В. ГРАМЫКА, сакратар праўлення Саюза журналістаў Беларусі, рэдактар «Сельской газеты» А. КОЛАС, старшыня прэзідыума праўлення Беларускага тэатральнага аб'яднання, народны артыст БССР М. ЯРОМЕНКА, намеснік старшыні праўлення Саюза кампазітараў Беларусі, заслужаны дзеяч мастацтваў БССР І. ЛУЧАНОК, старшыня праўлення Саюза архітэктараў Беларусі, заслужаны архітэктар БССР І. БОУТ, сакратар праўлення Саюза кінематаграфістаў Беларусі кінарэжысёр А. КАРПАЎ, сакратар праўлення Саюза мастакоў Беларусі, народны мастак СССР М. САВІЦКІ, эканаміст калгаса «Беларусь» Ляхавіцкага раёна Н. ДРАЧАН, народны артыст СССР Р. ЯНКОЎСКІ, заслужаны дзеяч мастацтваў БССР, кінарэжысёр В. ДАШУК, слесар-інструментальшчык вытворчага аб'яднання «Інтэграл» А. ПАРАХНЕВІЧ, намеснік начальніка Палітычнага ўпраўлення Чырванасцяжнай Беларускай ваеннай акругі М. ШАПАЛІН, кіраўнік майстэрні інстытута «Мінскпраект», лаўрэат Ленінскай прэміі архітэктар Ю. ГРАДАЎ, студэнтка Мінскага інстытута культуры С. ЯФРЭМАВА.

У рабоце пленума ўдзельнічалі сакратар ЦК КПБ А. Т. КУЗЬМІН, намеснік Старшыні Савета Міністраў БССР Н. Л. СНЯЖКОВА, загадчыкі аддзелаў ЦК КПБ С. Я. ПАЎЛАЎ і А. Л. ПЕТРАШКЕВІЧ.

Матэрыялы з пленума чытайце на стар. 5—12.

ШЛЯХ ВЕЛІЧНЫ, ШЛЯХ ГІСТАРЫЧНЫ

Уступнае слова лаўрэата Ленінскай прэміі, Героя Сацыялістычнай Працы, народнага паэта Беларусі Максіма ТАНКА

Сярод многіх слаўных гераічнымі і працоўнымі подзвігамі дат, якімі так багата наша жыццё, і 1978 год застанецца ў памяці народа як першы год дзеяння новай Канстытуцыі, год новага паспяховага ажыццяўлення рашэнняў XXV з'езда КПСС, далейшага ўмацавання магутнасці нашай краіны, і як юбілейны, шчодры здабыткамі год нашай рэспублікі і Камуністычнай партыі Беларусі.

Мінула шэсць дзесяцігоддзяў з тых векапомных дзён, калі дзякуючы перамозе Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі, здзейсненай пад кіраўніцтвам партыі бальшавікоў на чале з яе геніяльным стратэгам і правадыром Уладзімірам Ільічом Леніным, працоўныя Беларусі разам з усімі братнімі народамі і пры іх дапамозе скінулі са сваіх плеч векавое ярмо няволі, устанавілі Савецкую ўладу і ўпершыню сталі паўнапраўнымі гаспадарамі на сваёй зямлі, выйшлі на шырокі шлях будаўніцтва новага жыцця, велізарнейшых сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў, барацьбы за светлую будучыню.

Шэсцьдзесят гадоў у жыцці народа не такі ўжо вялікі перыяд часу. І сёння шчаслівае пакаленне нашай моладзі можа даведацца не толькі са старонак гісторыі, твораў мастацтва, літаратуры, але яшчэ пачуць з вуснаў многіх жывых удзельнікаў слаўных рэвалюцыйных падзей і аб легендарным залпе «Аўроры», і аб тых дзесяці днях, якія пахіснулі свет і абвясцілі аб нараджэнні новага, самага справядлівага грамадскага і палітычнага ладу. Пачуць аб героях грамадзянскай вайны і першых пяцігодак, аб несмяротных подзвігах савецкага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны і ў пасляваенныя гады. Сапраўды, па свайму значэнню гэта шасцідзесяцігоддзе з'яўляецца цэлай эпохай, якая пераканаўча засведчыла правільнасць і жыццяздольнасць геніяльных ленінскіх прадвызначэнняў і прадбачанняў у вырашэнні ўсіх праблем як сацыяльных, так і нацыянальных.

Велізарнейшая заслуга Леніна, гаварыў таварыш Леанід Ільіч Брэжнеў, у тым, што ён распрацаваў праграму сацыялістычнага вырашэння нацыянальнага пытання. Гэта праграма здзейснена.

З сонечнай вяршыні юбілейнай даты перад намі раскрываюцца бясконцыя далячыні пройдзеных намі дарог, і мы ўсё глыбей усведамляем значэнне сённяшняга свята. Бачым веліч спраў, якія здзейсніў наш народ пад кіраўніцтвам сваёй Камуністычнай партыі. Мы па праву ганарымся і з захапленнем гаворым аб гэтым. Нельга забываць, што пачалі мы будаваць сваё новае жыццё ад сахі і лучыны, сваю нацыянальную культуру — амаль ад суцэльнай непісьменнасці і цемры, пакінутых нам у спадчыну эксплуататарскімі класамі і былымі ўладарамі, якія забаранялі нам нават людзьмі звацца.

Лапці ды сярмягі —
Як абраз не боскі:
Гэта нашы людзі,
Людзі нашай вёскі.

Карчмы ды астрогі,
Крыжыкі, бярозкі:
Гэта наша доля,
Доля нашай вёскі...

Хто з нас не помніць гэтых горкіх, напісаных з болем у сэрцы радкоў верша бессмяротнага Янкі Купалы! Помнім мы і паказ дарэвалюцыйнага жыцця народа ў творах другога волата нашай літаратуры — Якуба Коласа.

Беларускі народ заўсёды будзе ўдзячны вялікаму рускаму народу і ўсёй ленінскай сям'і братніх народаў за іх неацэнную дапамогу ў барацьбе супроць класавых ворагаў і чужаземных захопнікаў. За дапамогу ў ажыццяўленні нашай мары — уз'яднанне ўсіх беларускіх зямель у адзінай сацыялістычнай дзяржаве. За дапамогу ў барацьбе супроць лютых фашысцкіх орд у гады Вялікай Айчыннай вайны. За дапамогу, дзякуючы якой мы змаглі ў кароткі тэрмін залячыць глыбокія раны вайны і выйсці на сённяшнія перадавыя рубяжы сваіх дасягненняў. Ленінскай інтэрнацыянальнай дружбай народаў, якая стала магутнай стваральнай сілай новага грамадства, азораны наша сучаснасць і наша будучыня.

Многія творы беларускіх пісьменнікаў і дзеячаў мастацтва займаюць пачэснае месца ў нашай шматнацыянальнай культуры. Аб гэтым пераканаўча гаворыць і тое, што многія з іх адзначаны высокімі ўсесаюзнымі і рэспубліканскімі прэміямі, заваявалі заслужанае прызнанне шматлікіх чытачоў, гледачоў, слухачоў нашай краіны і далёка за яе межамі. Радасна, што за апошнія гады прыкметна ўзмацнілася грамадзянскае гучанне літаратуры і мастацтва, павысіўся іх мастацкі і ідэйны ўзровень. Нашы творчыя саюзы няспынна папаўняюцца новай таленавітай моладдзю.

Вялікае выхаваўчае значэнне савецкага мастацтва і літаратуры. Дзякуючы жыццесцвярджальнаму пафасу, партыйнасці, народнасці яны фарміруюць эстэтычную культуру чалавечай асобы, яе ідэйную перакананасць і пачуццё адказнасці за жыццё. Літаратура і мастацтва дапамагаюць узводзіць масты дружбы паміж людзьмі, нацыямі, краінамі. Яны раскрываюць наш слых на музыку рэвалюцыі, нашы вочы — на сонца, а сэрцы — для сяброўства, братэрства, любві. Асаблівае значэнне яны маюць у наш час, калі навукова-тэхнічная рэвалюцыя і рост дабрабыту патрабуюць гарманічнага, усебаковага, ідэйнага і інтэлектуальнага развіцця, калі ў наш час — і мы заўсёды павінны помніць гэта! — ні на хвіліну не спыняецца барацьба на ідэалагічным фронце, супроць варожай прапагандысцкай дэмагогіі, супроць дэгуманізацыі культуры, супроць варожага жыццю ўпадніцкага мастацтва і літаратуры.

Партыя вучыць нас ніколі не задавальняцца дасягнутым ні на якім участку працы. Таму мы заўсёды павінны звяраць свае планы з планамі нашай партыі, нашага народа, нашай краіны.

«Мы ідзём наперад шырокім фронтам,—сказаў на лістападаўскім (1978 г.) Пленуме ЦК КПСС таварыш Леанід Ільіч Брэжнеў. — Краіна наша пераўтвараецца літаральна на вачах. Велізарныя маштабы нашых здзяйсненняў. Нямала ў нас і праблем. Мы іх ведаем, пастаянна працуем над іх вырашэннем і абавязкова вырашым».

У літаратуры і мастацтва ёсць яшчэ многа некранутых тэм, якія чакаюць свайго творчага ўвасаблення. Перад намі стаіць задача хутчэй іх асвоіць, шырэй і глыбей адлюстраваць ратныя і працоўныя подзвігі савецкага народа, яшчэ больш актыўна ўключацца ў жыццё і заўсёды быць на галоўным напрамку стваральнай працы, барацьбы за пабудову камунізму.

Цяпер па ініцыятыве ЦК КП Беларусі пачалася праца над зборам матэрыялаў да унікальнага «Летапісу народнай славы». Удзел у рабоце над стварэннем гэтай эпахальнай гераічнай эпапеі з'яўляецца высокім і ганаровым абавязкам для кожнага з нас.

Велізарнае палітычнае, мабілізуючае і выхаваўчае значэнне маюць вечна жывыя старонкі гісторыі нашага савецкага народа. Мы гэта асабліва адчуваем, калі з захапленнем чытаем выдатную трылогію Леаніда Ільіча Брэжнева — «Малая зямля», «Адраджэнне», «Цаліна», у якой з выключнай глыбінёй і праўдзівасцю расказана аб ратных і працоўных подзвігах савецкага народа і яго авангарда — Камуністычнай партыі.

Кастрычнік, гаварыў Леанід Ільіч Брэжнеў, гэта сцяг вялікіх перамен, узняты над дваццатым стагоддзем волі і рукамі працоўных.

Шэсцьдзесят гадоў гэты сцяг палымнее над намі. Хай жа ён вечна ззяе над нашай савецкай Радзімай, азараючы ўсяму чалавецтву шлях да шчасця, братэрства, свабоды і міру, ведучы нас у светлую будучыню — камунізм.

НА ПЕРАДАВЫХ РУБЯЖАХ

З выступлення першага сакратара праўлення Саюза пісьменнікаў БССР, народнага пісьменніка Беларусі Івана ШАМЯКІНА

Гісторыя беларускай савецкай літаратуры яскрава пацвярджае ленінскае палажэнне аб тым, што літаратурная справа з'яўляецца часткай агульнапралетарскай справы. З Кастрычніцкай рэвалюцыі, з пачатку якасна новага перыяду свайго развіцця літаратура, народжаная самой рэвалюцыяй, творчай энергіяй вызваленага народа, на ўсіх этапах сацыялістычнага будаўніцтва — з партыяй, з народам. Яна і сапраўды частка пралетарскай справы, агульнанароднай справы. Літаратура служыць народу.

Сувязь з жыццём, з мінулым і сённяшнім днём, з вытокамі народнай культуры, засваенне нацыянальных традыцый і традыцый сусветнай літаратуры, у першую чаргу, рускай — класічнай і савецкай, па-ленінску правільнае ўзаемадзеянне традыцый і наватарства — вось жыццятворная крыніца сталасці нашай літаратуры. Узброеныя марксісцка-ленінскай метадалогіяй, беларускія пісьменнікі ў сваёй творчасці выяўляюць сапраўды гістарычнае разуменне рэчаіснасці. У творах розных жанраў, розных стылявых напрамкаў і рознай — даволі шырокай па сваім дыяпазоне — тэматыкі

У зале пасяджэнняў.

сцвярджаецца высокі гуманізм савецкага ладу жыцця, раскрываецца патрыятызм і душэўная прыгажосць сучасніка, змагара за ідэі Вялікага Кастрычніка, за ленінскія ідэі, за новае жыццё, за новыя прынцыпы арганізацыі грамадства. Гэтыя прынцыпы знайшлі сваё ўвасабленне ў Канстытуцыях СССР і БССР, якія былі прыняты напярэдадні 60-годдзя Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі і 60-годдзя БССР і Кампартыі Беларусі.

Прыкметны рост майстэрства нашых пісьменнікаў. Гэта выяўляецца ў больш глыбокім пранікненні мастака ў прычынна-выніковыя сувязі жыцця, у дыялектыку развіцця грамадства, у складаныя праблемы ўзаемаадносін чалавека і прыроды, у тыя працэсы, якія адбываюцца ў палітычным, сацыяльным, эканамічным жыцці не толькі нашай краіны, але і ўсяго свету. Творчая пазіцыя пісьменніка робіцца ўсё больш наступальнай, актыўнай. Партыйная накіраванасць творчасці ўсведамляецца намі як эстэтычная якасць літаратуры.

Ідзе працэс абнаўлення традыцый з улікам дасягненняў усёй савецкай літаратуры, з улікам атмасферы часу, тых змен, якія адбываюцца ў грамадстве. Разам з тым мы застаёмся верныя пэўным, характэрным для нашай літаратуры, устойлівым заканамернасцям ідэйна-мастацкага даследавання жыцця. Гэта захоўвае ў літаратуры яе нацыянальную адметнасць, дае магчымасць пазбягаць нівеліроўкі. Пісьменнікі імкнуцца выявіць у духоўнай спадчыне беларускай нацыі ўсё каштоўнае, што не страціла свайго значэння, што можа ўдзельнічаць у стварэнні камуністычнай культуры. На гэтай аснове раскрываецца сучаснасць, выяўляецца сінтэз усіх аспектаў жыцця —маралі і палітыкі, прыроды і грамадства, асобы і калектыву. Беларуская літаратура традыцыйна асноўвалася на канкрэтным бытавым матэрыяле. Але калі ў некаторых творах мінулага бытавізм часам ператвараўся ў самамэту, у эстэтычную катэгорыю, то цяпер павышаная ўвага да бытавой асновы жыцця памагае выявіць тое новае, што з'явілася ў псіхалогіі людзей, узнята да філасофскіх абагульненняў. Сучасны пісьменнік абавязаны быць філосафам, мысліцелем, сацыёлагам, эканамістам. Тады ён здолее ахапіць усю складанасць і шматгранасць жыцця.

Аглядаючы сваё літаратурнае поле, радуючыся нашым здабыткам, мы з пачуццём удзячнасці ўспамінаем тых, хто стаяў ля вытокаў беларускай савецкай літаратуры. У першую чаргу ўспамінаем тых, хто не дайшоў да радаснага свята — свята ўраджаю з усіх ніў народнага жыцця, тых, хто, як салдат, упаў на полі бою і ляжыць у брацкай магіле. Помнікам ім няхай будзе слава роднай літаратуры, якая няспынна расце на радасць жывым — творцам яе і нашым чытачам. Асаблівае пачуццё любві, удзячнасці, пашаны мы выказваем бацькам і настаўнікам нашым — Янку Купалу і Якубу Коласу. Прыгадваем тых, хто быў разам з Купалам і Коласам у гады станаўлення Савецкай улады і савецкай літаратуры, хто сваёй творчасцю пакінуў у гісторыі культуры след, які не маглі замесці ніякія вятры часу. Па гэтай творчасці нашчадкі даведаюцца пра мінулае свайго народа, пра яго барацьбу, жыццё, быт, пра нашы радасці і пра нашы беды. Многія з паплечнікаў Купалы і Коласа не толькі трывала ўвайшлі ў гісторыю літаратуры, але творамі сваімі і сёння застаюцца ў баявым страі змагароў за новы свет, за новага чалавека, за высокія гуманістычныя ідэалы. Мы схіляем сёння галовы перад тымі нашымі таварышамі, якія ў суровыя дні вайны, трымаючы аловак і самаробны блакнот ці сшытак, не забывалі свайго прызвання і сваім мастацкім словам выконвалі патрыятычны абавязак. Яны ваявалі з вінтоўкай, з аўтаматам, з гранатай у руках. На палях баёў — ад Сталінграда да Берліна — ёсць магілы герояў, нашых таварышаў па пяру. Імёны іх выбіты залатымі літарамі на мемарыяльнай дошцы. Імёны іх — у нашых сэрцах. Добрым і ўдзячным словам успамінаем мы тых нашых таварышаў, каму ваеннае ліхалецце, раны, напружаная праца ўкарацілі жыццё і хто не можа асабіста сёння падзяліць нашу радасць.

У нашым даволі вялікім ужо літаратурным атрадзе сцяганосцамі з'яўляюцца ветэраны партыі, ветэраны беларускай савецкай літаратуры. Сярод іх — сапраўдныя героі працы, якім партыя і ўрад прысвоілі высокае званне Герояў Сацыялістычнай Працы,—Кандрат Крапіва, Пятрусь Броўка, Максім Танк. Слава вам, дарагія таварышы!

Беларускія пісьменнікі з партыйнай руплівасцю думаюць пра тыя задачы, якія вынікаюць з рашэнняў XXV з'езда КПСС, з рашэнняў пленумаў ЦК КПСС і ЦК КПБ, партыйных пастаноў па пытаннях народнай гаспадаркі і савецкай культуры. Мы ўсе знаходзімся пад уражаннем прамовы Л. І. Брэжнева на ліста падаўскім (1978 года) Пленуме ЦК КПСС — прамовы, у якой раскрыты выдатныя поспехі ў ажыццяўленні пяцігадовага плана і з высокай партыйнай прынцыповасцю і шчырасцю сказана пра недахопы ў планаванні, у прамысловасці, у будаўніцтве і сельскай гаспадарцы, у ідэалагічнай рабоце. З такой жа вастрынёй гаварыў аб праліках у пэўных сферах гаспадаркі нашай рэспублікі і П. М. Машэраў на нядаўнім пленуме ЦК КПБ. Гэтак жа і мы абавязаны прынцыпова гаварыць пра свае недахопы.

Я разумею ўмоўнасць тэматычных падзелаў літаратуры. Але нават тыя, хто адмаўляе такі падзел, не могуць не вылучыць у савецкай літаратуры і мастацтве тэму вайны, тэму гераізму народа ў барацьбе з фашызмам. Творамі аб вайне, аб усенародным супраціўленні фашызму беларуская літаратура заваявала шырокае ўсенароднае і сусветнае прызнанне. Творы гэтыя агульнавядомыя. Ёсць, аднак, і тут малаасвоеныя прасторы і глыбіні. Напрыклад, Мінскае падполле ў гады вайны, гераізм яго людзей, што сваім подзвігам заваявалі гораду права на высокае званне горада-героя, займае асобнае месца ў гэтай усенароднай барацьбе. Ды напісана аб гэтым пакуль што менш, чым аб іншых вядомых партызанскіх аперацыях. Трэба спадзявацца, што неўзабаве гэта тэма знойдзе новых летапісцаў.

Апошняе дзесяцігоддзе характарызуецца паваротам беларускіх празаікаў (і не толькі празаікаў) да даследавання жыцця і праблем гараджан. Да гарадской тэматыкі падступілі традыцыйна «сельскія» пісьменнікі. «Гарадскія матывы» гучаць зусім не прыглушана. Праўда, цэнтральным героем «гарадскіх» раманаў і аповесцей стаў пераважна інтэлігент —журналіст, урач, архітэктар, навуковы супрацоўнік. Часам гэта інтэлігент, які прыйшоў з вёскі і жыве яшчэ вёскай, не можа знайсці свайго трывалага месца ў гарадскім жыцці. Карацей кажучы, мы яшчэ не дайшлі да галоўнага гаспадара горада — да рабочага, кіраўніка буйнога завода, да начальніка цэха, да майстра, да тых людзей, што ствараюць індустрыяльнае аблічча рэспублікі, краіны. Тэма рабочага класа, безумоўна, генеральная для нашага часу. І каб яна заняла цэнтральнае месца ў творчасці, трэба настойліва і сур'ёзна працаваць нашай партыйнай арганізацыі і ўсім пісьменнікам.

Новы ўздым сельскай гаспадаркі — усенародны клопат. Гэта з выключнай сілай было падкрэслена на ліпеньскім (1978 г.) Пленуме ЦК КПСС, які вызначыў новы этап аграрнай палітыкі партыі. Выдатная кніга Л. І. Брэжнева «Цаліна» ўсімі сваімі глыбокімі і філасофскімі абагульненнямі і яркімі, я сказаў бы, мастацкімі прыкладамі пацвярджае думку аб тым, што ў барацьбе за хлеб не можа быць старонніх, абыякавых. Тут кожны з нас павінен усведамляць і выконваць высокі грамадзянскі абавязак з поўнай аддачай. Як трактарыст, што арэ зямлю, так і пісьменнік, які апрацоўвае сваю ніву за пісьмовым сталом.

Праблемы індустрыяльнай перабудовы сяла, тыя сацыяльныя працэсы, якія адбываюцца ў вёсцы і істотна змяняюць псіхалогію сённяшняга селяніна, пакуль што не знайшлі ў літаратуры такога глыбокага і шырокага адлюстравання, як адлюстравана жыццё селяніна-аднаасобніка або працэс калектывізацыі.

На ліста падаўскім Пленуме ЦК КПСС на поўны голас было сказана аб неабходнасці паляпшэння ідэалагічнай работы. Партыя называе нас, мастакоў, сваімі памочнікамі. Гэта вялікі гонар і вялікі абавязак. Мы — баявы атрад вялікай ідэалагічнай арміі. У нас вострая зброя — слова. І мы павінны выкарыстоўваць гэтую зброю на ўсю яго магчымасць — так, як гэта рабілі Горкі і Маякоўскі, Купала і Колас. Наш абавязак — крочыць у нагу з часам. Мастак не мае права адставаць ад народнай хады. З усведамленнем гэтага сустракаем мы юбілейную дату — 60-годдзе БССР і Кампартыі Беларусі.

МАШТАБНАСЦЬ І АБСЯГІ ТВОРЧАСЦІ

З выступлення старшыні праўлення Саюза мастакоў БССР, заслужанага дзеяча мастацтваў рэспублікі Віктара ГРАМЫКІ

Беларускае выяўленчае мастацтва, цесна звязанае з традыцыямі нацыянальнай мастацкай культуры, з рускай рэалістычнай школай, развіваецца ў агульным рэчышчы таго творчага метаду, які мы з гонарам называем сацыялістычным рэалізмам. Свой важкі ўклад у фарміраванне гэтага метаду ўнесла беларускае мастацтва. Пафас народнасці, грамадзянскасці і партыйнасці заўсёды прысутнічае ў розных мастацкіх з'явах і праходзіць магістральнай лініяй праз усё яго развіццё. Мы адзначаем паслядоўнасць узыходжання гэтай лініі ў жывапісе, скульптуры, графіцы і дэкаратыўным мастацтве. У апошнія гады больш адчувальнымі сталі вобразна-стылістычныя прыкметы беларускай выяўленчай школы. Яна складалася як вынік аб'ектыўнай патрэбы рэспублікі ў грамадска значных, сацыяльна накіраваных творах. Назіраецца і яркая тэндэнцыя да вывучэння і духоўнага засваення народных традыцый. Гэтымі фактарамі і тлумачацца такія характэрныя асаблівасці беларускага мастацтва, як узбуйненая маштабнасць яго вобразаў, імкненне да сінтэзуючай алегарычнасці, да адухоўленай фальклорнай сімволікі, цэласнасць і чысціня эмацыянальнага ладу мастакоўскай мовы. Дынаміка развіцця нашага мастацтва відавочная. Яно актыўна шукае новыя спосабы філасофскага асэнсавання рэчаіснасці — як гісторыі, так і складаных праблем сучаснасці.

Савецкія людзі нібы звяртаюцца да самога мастацтва з надзённымі пытаннямі, чакаючы вобразнага, па-грамадзянску сталага, яснага па ідэйных пазіцыях адказу. Гэта азначае, што фарміраванне асаблівасцей характару сучасніка, ладу яго думак і пачуццяў, увесь працэс самапазнання і развіцця асобы цяпер без удзелу мастацтва немагчымы.

Мы—нашчадкі вялікіх традыцый. І тых, якія бяруць пачатак у глыбінях стагоддзяў, і тых, якія склаліся пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі, і тых, якія аформіліся на нашых вачах. Гэтая пераемнасць неаддзяліма ад наватарскай думкі, неабходнай для выяўлення новых змястоўных аспектаў і форм, адэкватных дынамічнасці грамадскай свядомасці. Толькі бязмежныя магчымасці рэалістычнага метаду дазваляюць адгукацца на любыя запатрабаванні духоўнага жыцця грамадства.

А які плённы працэс узаемаўзбагачэння нацыянальных школ! Кожная актыўна ўбірае лепшае з рэалістычных традыцый мастацтва братніх рэспублік. Зразумела, мастак Беларусі не можа не адчуваць уплыву, да прыкладу, жывапісных традыцый Расіі, скульптурна-пластычнай культуры Грузіі, тэхнічнай дасканаласці прыбалтыйскіх графікаў, каларыстычнай культуры Украіны і Малдавіі... Мы пераконваемся, што ў выніку гэтага працэсу толькі яшчэ больш ярка адцяняюцца нацыянальныя рысы нашага мастацтва. Справядліва зазначыў Бялінскі, калі сказаў, што няшчасная тая народнасць, якая баіцца ўсялякай супольнасці з іншымі народнасцямі. Мы дужыя нашай дружбай, нашы сувязі з мастакамі братніх рэспублік пастаянна пашыраюцца і мацнеюць, маюць сапраўды творчы характар.

Непамерна ўзрос прэстыж беларускага мастацтва на ўсесаюзнай арэне. Ён—у жывой цікавасці да твораў беларускіх майстроў і да работ моладзі шырокай аўдыторыі буйнейшых выставачных залаў краіны; ён — у прысуджэнні найбольш значным творам Дзяржаўных прэмій СССР, дыпломаў і медалёў; ён— у той увазе да нашага мастацтва, што праяўляе цэнтральная прэса. Творы беларускіх мастакоў пастаянна ўключаюцца ў склад міжнародных выставак. Экспазіцыі беларускага жывапісу і графікі ў апошнія гады дэманстраваліся з вялікім поспехам у Балгарыі і Польшчы, у Даніі і Італіі, у Чэхаславакіі і Аўстрыі, у Анголе і Алжыры... Цяпер працягвае турнэ па сацыялістычных краінах усесаюзная выстаўка «Па ленінскім шляху». Адкрываючы экспазіцыю яе ў Празе, мне давялося пераканацца, з якой велізарнай цікавасцю сустракаў глядач гэтай краіны творы савецкіх і, у прыватнасці, беларускіх майстроў, які водгук у яго сэрцы знаходзіла вобразная адухоўленасць, гуманізм нашага мастацтва. Гэтыя якасці асабліва адчувальныя на фоне крызісу мастацтва ў капіталістычных краінах, на фоне розных штучных і пачварных форм паказу хворага ўяўлення заходніх аўтараў пра чалавека і пра жыццё. Агрэсіўны «вещизм» і бездухоўнасць урэшце і дыктуюць антыгуманістычны кірунак мастацтва ў краінах капіталу. На сусветнай арэне ўсё больш важка гучыць пераканальная сіла нашага мастацтва, яго філасофскі аптымізм і ўпэўненасць у будучыні.

Наш народ знаёміцца з творчасцю мастакоў не толькі ў выставачных залах. Усё менш застаецца сфер народнай гаспадаркі, дзе не стаяць праблемы эстэтычныя, дзе можна было б абысціся без працы мастака. У ёй зацікаўлены прамысловыя прадпрыемствы і канструктарскія бюро, выдавецтвы і праектныя арганізацыі, навуковыя ўстановы і вёска. Стала больш шматграннай і змястоўнай роля мастака ў эстэтычнай арганізацыі гарадскога і сельскага матэрыяльнага і духоўнага асяроддзя. Гэта высокая і адказная місія. І нас яшчэ чакае велізарная работа па ўкараненні комплекснага праектавання грамадскіх інтэр'ераў і экстэр'ераў, гарадскіх вуліц і ансамбляў. Задача гарманічнага збалансавання розных відаў мастацтва ў гэтым праектаванні, стварэння іх арганічнага сінтэзу, які вызначае стыль часу, патрабуе ўдасканалення нашых творчых і вытворчых адносін з архітэктарамі, выкарыстання ўсіх патэнцыяльных магчымасцей і рэзерваў. Неабходны трывалыя і пастаянныя сувязі і садружнасць з калгасамі і саўгасамі.



У перапынку паміж пасяджэннямі пленума сустрэліся народны пісьменнік Беларусі К. КРАПІВА і народны артыст СССР Л. РАХЛЕНКА.

Заслугоўвае шырокай прапаганды вопыт Мазырскага раёна па комплексным культурным будаўніцтве. Гэта унікальны выпадак, калі па ініцыятыве кіраўнікоў раёна, па мудрай і добрай задуме, на сяле ўзнікла карцінная галерэя як галоўнае і актыўна дзеючае звяно ў агульнай сістэме камуністычнага выхавання. Характэрна, што галерэя папаўняецца не толькі за кошт запаснікоў сталічнага музея, яна ўзбагачаецца работамі на мясцовым матэрыяле, што з гадамі вырасце ў мастацкі летапіс Мазырскага краю. І гэтым ужо вызначаецца арыгінальнае аблічча галерэі ў агульным працэсе станаўлення самабытнай і сапраўды сучаснай сельскай культуры.

Ад імя Саюза мастакоў БССР мы дзякуем раённаму камітэту партыі і працаўнікам раёна! Яны ў разгар летняй пары стварылі ўсе ўмовы для плённай работы нашых жывапісцаў. Трэба падтрымаць і калектыву школы ў пасёлку Крынічны, які на працягу двух гадоў на грамадскіх асновах забяспечваў работу галерэі. А гэта і дапамагло ёй набыць статус філіяла Дзяржаўнага мастацкага музея БССР. Сельская галерэя стымулявала стварэнне мастацкай школы ў Мазыры. І такія школы (пажадана школы-інтэрнаты) нам варта мець у раённых цэнтрах, каб сельскія дзеці маглі далучацца да сярэдняй мастацкай адукацыі, а пасля і працягваць яе ў вышэйшых навучальных установах. Ужо цяпер відаць, што музей у Крынічным — з'ява не лакальная. Яго значэнне не абмежавана толькі Мазырскім раёнам. Гэтым вопытам зацікавіліся многія кіраўнікі сельскіх гаспадарак.

Безумоўна, яшчэ больш мабілізуе творчыя сілы нашага калектыву і актыўная падрыхтоўка да выстаўкі «Зямля і людзі», якая будзе прысвечана сацыялістычнаму пераўтварэнню Палесся. На базе яе музей у Пінску зафіксуе на многія гады гэты перспектыўны вынік сапраўды камуністычных адносін да культурнага будаўніцтва на сяле.

Перад намі стаяць вялікія, адказныя задачы, вызначаныя XXV з'ездам КПСС. Адна з важнейшых — няўхільнае павышэнне ідэйна-мастацкага ўзроўню ствараемых твораў.

Наша творчая арганізацыя імкнецца спрыяць вырашэнню гэтай задачы ва ўсіх сферах дзейнасці: лепш наладзіць творчы працэс, стварыць спрыяльны маральны клімат, ліквідаваць праявы ўраўнілаўкі і спажывецкіх тэндэнцый. Кожны мастак павінен быць па-грамадзянску перакананы ў тым, што няма двух узроўняў мастацтва — «фондаўскага», «камбінатаўскага» і выставачнага, што яго праца заўсёды аднолькава адказная.

Творчы атрад мастакоў рэспублікі актыўна папаўняецца выпускнікамі Беларускага дзяржаўнага тэатральна-мастацкага інстытута. Яны ўносяць прыкметны ўклад у наш агульны мастацкі набытак. Моладзь — наш клопат і нашы спадзяванні, наша адказнасць за будучыню. Таму мы настойліва ставім пытанне аб удасканаленні мастацкай адукацыі на ўсіх яе этапах.

Наша агульная мэта—далейшае актыўнае развіццё новай сацыялістычнай культуры.

ПРЫЗВАННЕ І АБАВЯЗАК

З выступлення сакратара праўлення Саюза журналістаў БССР, рэдактар «Сельской газеты» Андрэя КОЛАСА

Друкаванае слова — гэта важнейшая частка духоўнага жыцця кожнага савецкага чалавека. Да Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі ў нашых гарадах і сёлах можна было па пальцах пералічыць пісьменных людзей. Газеты былі рэдкасцю, асабліва ў вёсцы. Цяпер на кожную тысячу чалавек у рэспубліцы друкуецца 1467 экземпляраў газет і часопісаў. Не адшукаць сёння такой сям'і, якая не атрымлівала б перыядычных выданняў. У Беларусі выходзіць 184 газеты, выдаецца дваццаць адзін часопіс і дзесяткі бюлетэняў часопіснага тыпу. Разавы тыраж газет — больш як 4 мільёны экземпляраў. Тэлебачанне і радыё пакрыла сваёй сеткай усю тэрыторыю рэспублікі. Прыцягальная сіла праўдзівага журналісцкага слова ўзрастае з кожным годам.

Савецкія журналісты разам з партыяй, разам з народам прайшлі ўсе выпрабаванні, якія выпалі на долю нашай краіны. З найбольшай паўнатой гэта праявілася ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Тады яны сталі ў адзін баявы строй абаронцаў Радзімы. Нашы перыядычныя выданні пад кіраўніцтвам партыйных камітэтаў ператварыліся ў грозную зброю барацьбы з ворагам.

Дастойная ацэнка заслуг савецкага друку — у высокіх урадавых узнагародах, якіх удастоены многія цэнтральныя, рэспубліканскія, абласныя газеты і часопісы. Высока цэніць Радзіма і працу работнікаў сродкаў масавай інфармацыі і прапаганды, аказвае ім вялікае давер'е.

Савецкія журналісты законна ганаруцца тым, што ля вытокаў іх творчага саюза стаяў Уладзімір Ільіч — стваральнік нашай партыі і Савецкай дзяржавы, страсны публіцыст, таленавіты рэдактар. Мы ганарымся тым, што членскі білет нашага саюза пад нумарам адзін выпісаны на імя Уладзіміра Ільіча Леніна. І сёння мы заўсёды адчуваем ленінскія клопаты аб сродках масавай інфармацыі і прапаганды, якія праяўляюцца Цэнтральным Камітэтам КПСС і асабіста Леанідам Ільічом Брэжневым. Можна было б назваць шэраг дакументаў, накіраваных на павышэнне майстэрства, паляпшэнне ўмоў працы і быту, матэрыяльнага дабрабыту журналістаў. Прыгадайце кнігу «Малая зямля» Л. І. Брэжнева. Гаворачы аб армейскай газеце, Л. І. Брэжнеў піша, што яе чакалі ў акопах і траншэях, перадавалі з рук у рукі. «Я прывык паважаць журналістаў, бо ведаў: у час баёў яны пастаянна знаходзіліся ў войсках, хадзілі ў дэсанты, удзельнічалі ў дыверсійных групах, у захопе «языкоў»,— так сказана ў кнізе. У другой сваёй кнізе «Адраджэнне» Л. І. Брэжнеў назваў нашага брата-журналіста таго часу «паўнапраўным удзельнікам» шматграннай дзейнасці партыі па развіцці сацыялістычнага спаборніцтва.

Указанні, рэкамендацыі і парады Леаніда Ільіча Брэжнева пакладзены ў аснову дзейнасці савецкай журналістыкі. Выказваючы волю журналістаў краіны, праўленне Саюза журналістаў СССР уручыла выдатнаму палітычнаму дзеячу нашага часу таварышу Л. І. Брэжневу членскі білет нашай творчай арганізацыі.

Саюз журналістаў рэспублікі пад кіраўніцтвам Цэнтральнага Камітэта КП Беларусі актыўна ўплывае на павышэнне якасці і эфектыўнасці сродкаў масавай інфармацыі і прапаганды, узмацненне іх ролі ў жыцці грамадства. У нашай дзейнасці трывала зацвердзіліся такія формы вучобы, як творчыя семінары, міжабласныя і рэспубліканскія лятучкі, прэс-канферэнцыі, стажыроўкі, творчыя конкурсы. Мацнеюць і паглыбляюцца нашы сувязі і кантакты з журналістамі братніх саюзных рэспублік, з калегамі ў сацыялістычных краінах.

Мабілізуючы працоўных рэспублікі на дастойную сустрэчу 60-годдзя БССР і Кампартыі Беларусі, газетныя палосы, тэле- і радыёперадачы расказалі мільёнам чытачоў, слухачоў і гледачоў пра гераічны шлях беларускага народа, пра кіруючую і накіроўваючую ролю нашай партыі, пра вялікія сацыяльна-эканамічныя заваёвы, пра лепшых людзей рэспублікі.

Але, аддаючы належнае зробленаму, нельга закрываць вочы на хібы і недахопы. Журналістам трэба будзе яшчэ нямала папрацаваць, каб стаць на ўзровень патрабаванняў партыі па далейшым развіцці сацыялістычнага спаборніцтва ў працоўных калектывах, па абагульненні і распаўсюджанні перадавога вопыту, па ўздыме ролі і дзейнасці крытыкі і самакрытыкі, па глыбокім пранікненні ў сутнасць сацыяльна-эканамічных працэсаў, па выхаванні новага чалавека.

ВЫСОКАЯ ТРЫБУНА—СЦЭНА

З выступлення старшыні прэзідыума праўлення Беларускага тэатральнага аб'яднання, народнага артыста БССР Мікалая ЯРОМЕНКІ

Беларускі савецкі тэатр стаў адным з перадавых атрадаў шматнацыянальнай тэатральнай культуры нашай сацыялістычнай Радзімы. Самым пераканаўчым прыкладам актыўнасці творчай інтэлігенцыі, яе адказам на клопаты партыі з'яўляецца сённяшні стан тэатральнага мастацтва. Тэатр сустракае юбілейную дату новымі сцэнічнымі творамі, у якіх гераічная гісторыя народа і наша сучаснасць атрымалі высокае ідэйна-мастацкае ўвасабленне. Толькі ў гэтым сезоне нашы гледачы ўбачаць шэраг новых арыгінальных твораў — п'есы «Напісанае застаецца» А. Петрашкевіча, «Кастусь Каліноўскі» У. Караткевіча, «Пайсці і не вярнуцца» паводле аповесці Васіля Быкава, інсцэніроўку рамана «Подых навальніцы» І. Мележа, новую сцэнічную рэдакцыю «Брэсцкай крэпасці» К. Губарэвіча. Адначасова з лепшымі пастаноўкамі мінулых гадоў яны будуць паказаны на фестывалі ў гонар 60-годдзя БССР і Кампартыі Беларусі.

Наш тэатр прайшоў слаўны шлях. Адным з першых мерапрыемстваў Савецкай улады ў галіне нацыянальнай культуры было стварэнне Беларускага дзяржаўнага — цяпер Акадэмічнага імя Янкі Купалы — тэатра. Многія ў тыя часы сустрэлі сам факт стварэння Беларускага дзяржаўнага тэатра як «чарговую выдумку» бальшавікоў. «Што гэта за тэатр на мужыцкай мове і хто туды пойдзе?» — пыталіся скептыкі. Калі ж са сцэны ў спектаклях «Паўлінка» Я. Купалы, «На Купалле» М. Чарота, «Машэка», «Кастусь Каліноўскі» Е. Міровіча загучала гэтая мова, дастаць білеты на прэм'еры стала немагчыма. Беларускі тэатр тады ж пачаў асвойваць рускую і зарубежную класіку, ставіць творы М. Горкага, Р. Ралана, Б. Шоў, Мальера. Гэтыя спектаклі выклікалі здзіўленне, павагу да нацыянальнага тэатра, гонар за яго. З самаахвярным імкненнем узбагаціць маладое беларускае тэатральнае мастацтва працавалі Фларыян Ждановіч, Еўсцігней Міровіч, Уладзімір Крыловіч, Кацярына Міронава, Генрых Грыгоніс, Лідзія Ржэцкая, Антук Крыніца, Барыс Платонаў, Ірына Ждановіч, Вольга Галіна, Глеб Глебаў, Уладзімір Уладамірскі, Вера Пола, Кастусь Саннікаў і многія іншыя нашы старэйшыя таварышы, заснавальнікі лепшых нашых традыцый.

Першы Беларускі дзяржаўны тэатр (цяпер купалаўскі) быў сапраўды першым ва ўсіх адносінах: у яго творчай лабараторыі праходзілі загартоўку першыя беларускія драматургі, рэжысёры, акцёры, тэатральныя мастакі і кампазітары. Пачынаючы з 20-ых гадоў, БДТ паказваў сваё мастацтва маскоўскаму гледачу і заслугоўваў высокую ацэнку грамадскасці. З мастацтвам нашага тэатра знаёміліся гледачы многіх гарадоў Савецкага Саюза. У лёсе гэтага калектыву, як у кроплі расы, адлюстраваліся тыповыя рысы і іншых тэатраў Беларусі. Сёння побач з ім плённа працуюць Дзяржаўны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета БССР, Акадэмічны тэатр імя Якуба Коласа, Рускі тэатр БССР імя М. Горкага і іншыя калектывы. Цяпер мы маем 15 прафесійных тэатраў, 2 філармоніі, харавыя і танцавальныя калектывы, аркестры, групы і ансамблі эстрады. Яны дастойна прадстаўляюць беларускае сцэнічнае мастацтва на многіх блізкіх і далёкіх маршрутах сваіх выступленняў.

Вельмі многа зроблена ў рэспубліцы для ўмацавання нашых тэатраў цікавымі, кваліфікаванымі рэжысёрскімі кадрамі, якія маюць такое вялікае значэнне ў сучасным сцэнічным мастацтве. І ўсё ж праблема гэтая ў некаторых калектывах пакуль яшчэ застаецца нявырашанай. Нам многае трэба зрабіць у гэтым напрамку, бо рэжысёр сёння з'яўляецца ідэолагам тэатра, вызначае яго эстэтычную праграму і стылявую адметнасць. Вопыт савецкага тэатра паказвае, што наватарства і арыгінальнасць рэжысёрскага мастацтва толькі тады вянчаюцца высокім мастацкім вынікам, калі дакладна і поўна выражана ідэйная сутнасць п'есы, калі аўтарскую задуму рэжысёр увасобіў у жывым мастацтве акцёра. Часам жа мы назіраем іншае: выяўленчыя сродкі, пошукі сучаснай сцэнічнай лексікі, бывае, вычэрпваюцца жаданнем дагадзіць сумніцельнай модзе. У гэтым выпадку акцёры становяцца механічнымі выканаўцамі волі пастаноўшчыка і ад спектакля павявае рэжысёрскім рэзанёрствам, а сутнасць твора застаецца раскрытай цьмяна, неакрэслена. Трэба імкнуцца да таго, каб нават у адным калектыве былі рэжысёры розных індывідуальнасцей, здатныя працаваць самастойна. Гэта садзейнічала б стварэнню ў тэатры атмасферы сапраўднага творчага спаборніцтва. І тут вельмі многае залежыць ад галоўных рэжысёраў, ад іх жадання ствараць такую атмасферу.

Пры БТА створана лабараторыя драматургаў. У яе ўвайшло 12 маладых літаратараў. Мы спадзяёмся, што нашы рэжысёры паставяцца да гэтага зацікаўлена, таму што ад іх у многім будзе залежаць лёс твораў, што народзяцца ў гэтай лабараторыі.

Спытайцеся ў любога акцёра, каго б ён хацеў сыграць, і вы пачуеце — сучаснага героя. Сучаснасць заўсёды была душою тэатра. У юбілейным годзе на сцэне нашых тэатраў, апрача прэм'ер гэтага сезона, якім яшчэ трэба будзе трымаць экзамен перад гледачом, ішло больш чым 20 спектакляў на сучасную тэму, і гэта вельмі добра. І ўсё ж трэба сказаць, што спектакляў, як і добрых п'ес пра сучаснасць, яшчэ недастаткова. Вобраз чалавека нашых дзён не атрымаў яшчэ свайго па-сапраўднаму ўсебаковага раскрыцця. Сцэна чакае новых глыбокіх вобразаў камуністаў і камсамольцаў — нашых сучаснікаў, герояў, пра якіх Леанід Ільіч Брэжнеў сказаў, што яны знаходзяцца сярод нас, кожную раніцу ідуць на работу і на сваіх рабочых месцах, не падазраючы самі, здзяйсняюць подзвіг — удзельнічаюць у пабудове камуністычнага грамадства.

Народны паэт Беларусі П. БРОЎКА, народны мастак СССР З. АЗГУР, вядомы паэт М. Лужанін, народны пісьменнік Беларусі І. ШАМЯКІН.

З КАСТРЫЧНІКАМ У СЭРЦЫ

З выступлення намесніка старшыні праўлення Саюза кампазітараў БССР, заслужанага дзеяча мастацтваў БССР Ігара ЛУЧАНКА

Ёсць у беларускага народа старадаўняя легенда. Ці то полем, ці то лесам ішлі тры падарожнікі. Ішлі яны тры дні і тры начы, ды яшчэ паўдня. Прытаміліся. Прыселі. Раптам чуюць — спявае нехта. Прыслухаўся першы: «Відаць, жаўранак». «Не, — кажа другі, — гэта лес шуміць». А трэці прыпаў вухам да зямлі і прашаптаў: «Ды гэта ж зямля наша спявае».

Поўная песнямі зямля беларуская! Але глыбока ў нетрах хаваліся яны, бо не ведаў чалавек на зямлі шчасця. Вякамі шукаў ён легендарную кветку шчасця, якая расцвітае ў ноч на Івана Купалу, ды так і не знайшоў. Сапраўднае шчасце прыйшло на зямлю нашу толькі з перамогай Вялікага Кастрычніка, які вызваліў народ з сацыяльнай і нацыянальнай няволі, адкрыў прастору для яго творчых сіл.

З Кастрычнікам звязваем мы і наша двайное свята, якое будзем адзначаць неўзабаве. — дзень нараджэння Беларускай ССР і баявога нашага авангарда — Камуністычнай партыі Беларусі.

З Кастрычнікам звязваем мы і нараджэнне прафесійнай беларускай музыкі, нашай музычнай культуры.

Дасягненні беларускай музыкі — гэта заканамерны вынік вялікага і нялёгкага шляху, які пачаўся 60 гадоў назад з вялікіх рэвалюцыйных пераўтварэнняў, што адбыліся на нашай зямлі. Са шчодрай дапамогай усіх братніх народаў СССР, асабліва вялікага рускага народа, мы стварылі музычную культуру, якую сёння добра ведаюць у нас і за рубяжом. Яркімі старонкамі ў нашым мастацтве сталі першыя нацыянальныя оперы — «Міхась Падгорны» Я. Цікоцкага і «У пушчах Палесся» А. Багатырова, «Кветка шчасця» А. Туранкова і першы наш балет «Салавей» М. Крошнера. У грозныя гады Вялікай Айчыннай вайны беларускія кампазітары ў тыле і франтавых акопах уносілі свой пасільны ўклад у агульную справу разгрому ворага. Яны напісалі творы самых розных жанраў, якія паказваюць стойкасць, мужнасць і духоўную веліч савецкага чалавека. Тэма, звязаная з гісторыяй беларускага народа, яго гераічным мінулым, тэма Вялікай Айчыннай вайны, тэмы барацьбы за мір і дружбу паміж народамі, савецкага патрыятызму і пралетарскага інтэрнацыяналізму з асаблівай сілай гучаць у творах пасляваеннага перыяду. Пералік імён і твораў склаў бы вялікі спіс.

Мабыць, усе ведаюць, што наша музыка мае на сваім рахунку творы, якія сталі прыкметнай з'явай у культурным жыцці не толькі нашай рэспублікі, а і ўсёй краіны. Толькі ў апошні час нашы кампазітары стварылі шэраг значных сачыненняў. І тут у першую чаргу хочацца назваць работы Дзяржаўнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета БССР — «Ціль Уленшпігель» (другая рэдакцыя) Я. Глебава, «Сівая легенда» Д. Смольскага і «Джардана Бруна» С. Картэса. Гэтыя спектаклі не выпадкова адзначаны журы Усесаюзнага конкурсу. Заканамерна, што якраз да нас у Беларусь не так даўно сабраліся з усёй краіны рэжысёры музычных тэатраў, каб абмеркаваць найбольш хвалюючыя і надзённыя праблемы гэтага віду мастацтва. Сёння ў тэатры вядзецца падрыхтоўка да пастаноўкі новых твораў беларускіх кампазітараў — оперы Г. Вагнера «Воўчая зграя» (па матывах аповесці В. Быкава) і оперы Ю. Семянякі «Новая зямля» (па класічнай паэме Якуба Коласа). На рэспубліканскім радыё завяршаецца запіс новай беларускай радыёоперы К. Цесакова па лібрэта В. Лукшы «Барвовае світанне» — аб станаўленні Савецкай улады ў Беларусі. Хочацца спадзявацца, што сумесныя намаганні кампазітараў і тэатраў будуць садзейнічаць узбагачэнню рэпертуару новымі нацыянальнымі операмі і балетамі. Яшчэ ў большай ступені такое пажаданне можна аднесці да нашага Дзяржаўнага тэатра музычнай камедыі БССР. Новыя творы з'явіліся і ў сімфанічным жанры — «Святочная паэма» А. Мдзівані, сімфанічныя паэмы і Чацвёртая сімфонія Ф. Пыталева, сімфонія У. Дарохіна... Актыўна распрацоўваецца героіка-патрыятычная тэматыка.

Нельга не спыніцца на самым масавым, самым любімым шырокай аўдыторыяй, але самым цяжкім жанры — песні. Сёння імёны вядучых беларускіх кампазітараў, якія працуюць у гэтым жанры, — У. Алоўнікава, Ю. Семянякі, Я. Глебава, Э. Ханка шырока вядомы не толькі ў нашай рэспубліцы, але і далёка за яе межамі. У апошні час шмат пачалі працаваць у гэтым жанры і нашы маладыя кампазітары — Л. Захлеўны, У. Буднік, Э. Зарыцкі, В. Іваноў. З імі ў беларускую песню прыйшлі новыя інтанацыі, новыя рытмы і вобразы.

Як правіла, поспех музычнаму твору забяспечаны тады, калі дакладна выбрана тэма, калі аўтар звяртаецца да выдатнай нацыянальнай літаратуры. Лепшае, што намі напісана ў апошні час, было падказна выдатнымі вершамі Я. Купалы і Я. Коласа, П. Броўкі і М. Танка, А. Куляшова і П. Панчанкі. Саюз музыкі і літаратуры нам трэба ўмацоўваць і далей!

Сёння аснову нашай кампазітарскай арганізацыі складае моладзь, якая атрымала адукацыю ў Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі імя А. В. Луначарскага. І мы з пачуццём глыбокай удзячнасці называем імёны кампазітараў, якія стаяць ля вытокаў высокапрафесійнай музычнай культуры рэспублікі, — Мікалая Чуркіна, Аляксея Туранкова, Яўгена Цікоцкага, Мікалая Аладава, Рыгора Пукста, Васіля Яфімава, Іосіфа Жыновіча, Рыгора Шырмы. Мы ўдзячны плеядзе выдатных музыкантаў, якія ўнеслі вялікі ўклад у развіццё нацыянальнай музычнай культуры, — А. Багатырову, П. Падкавыраву, Л. Абеліёвічу, Д. Лукасу, У. Алоўнікаву, Г. Цітовічу. Наша моладзь паспяхова развівае традыцыі беларускай прафесійнай музыкі і актыўна працуе ў многіх жанрах. Тут можна назваць новыя творы Л. Захлеўнага, В. Помазава, Л. Шлег, А. Залётнева і іншых. Выхаванню кампазітарскай моладзі вялікую ўвагу аддае камсамол рэспублікі. Дастаткова ўспомніць традыцыйныя семінары творчай моладзі, фестывалі, конкурсы, агляды. Асабліва актывізавалася гэтая работа пасля прыняцця пастановы ЦК КПСС «Аб рабоце з творчай моладдзю».

І вядома ж, сёння нельга не сказаць пра нашых знакамітых музыкантаў - выканаўцаў: Дзяржаўны сімфанічны аркестр БССР, Дзяржаўную акадэмічную харавую капэлу імя Р. Шырмы, Дзяржаўны народны аркестр БССР імя І. Жыновіча, Дзяржаўны народны хор БССР, папулярны ансамбль «Песняры», пра вядомых спевакоў Віктара Вуячыча і Валерыя Кучынскага... Калектыўнымі намаганнямі многае і небеспаспяхова робіцца, хаця можна яшчэ больш і лепш прапагандаваць нашу музыку па тэлебачанні, па радыё і з кінаэкрана. Ёсць у нас пажаданне работнікам кінастудыі і тэлефільма: далёка ад дома шукаюць яны часам кампазітараў для стварэння музыкі да сваіх стужак, кіруючыся пры гэтым незразумелымі меркаваннямі. Няўжо запрошаныя здалёк нашы калегі лепш за нас ведаюць нацыянальны мелас, нашы традыцыі?..

Кампазітарская арганізацыя наладзіла шэфскую работу. Выступленні ў заводскім цэху і на рыштаваннях будоўляў, на палявым стане і ў школе, на баявым караблі і ў далёкім гарнізоне даюць нам магчымасць не толькі пазнаёміць шырокую аўдыторыю з нашымі творамі — мы глыбей пазнаём жыццё, якое з'яўляецца невычэрпнай крыніцай натхнення і творчага пошуку. Геаграфія нашых выступленняў дастаткова шырокая. Гэта і прадпрыемствы горада-героя Мінска, і меліярацыйныя трасы Палесся, і шахты Салігорска, і пляцоўкі нафтагігантаў. Цяпер маршруты пашырыліся да магістралі веку — БАМа, да будоўляў Сібіры і Далёкага Усходу. З якой цікавасцю сустракаюць пакарыцелі сібірскіх нетраў кожнае наша выступленне! Работу гэтую трэба працягваць і далей. І не толькі нам, кампазітарам, але і прадстаўнікам іншых творчых саюзаў рэспублікі карысна падумаць пра аб'яднанне намаганняў у гэтым кірунку.

Мы жывём і працуем у выдатны час, калі савецкі народ будуе самае светлае на планеце камуністычнае грамадства. Лёс надзяліў нас, музыкантаў, вялікім шчасцем пражыць за адно жыццё дзесяткі чалавечых жыццяў, бо музыка, як і іншыя віды мастацтва, — гэта чалавеказнаўства. Дазвольце ж з гэтай высокай трыбуны запэўніць родную партыю, што кампазітары Беларусі заўсёды будуць высока несці сцяг савецкага мастацтва і талент свой прысвецяць высакароднай справе будаўніцтва камуністычнага заўтра!

Народны мастак БССР А. БЕМБЕЛЬ, міністр культуры рэспублікі Ю. МІХНЕВІЧ і народны паэт Беларусі Максім ТАНК.

У БУДАЎНІЧЫХ РЫТМАХ

З выступлення старшыні праўлення Саюза архітэктараў БССР, заслужанага архітэктара рэспублікі Івана БОЎТА

Архітэктура Беларусі, як састаўная частка ўсёй савецкай архітэктуры, дасягнула бясспрэчных поспехаў. Аб гэтым сведчыць новае аблічча нашых гарадоў і вёсак. У наш час архітэктура наогул робіцца важным фактарам сацыяльна-эканамічнага прагрэсу, росту культуры і дабрабыту народа. Гэтым вызначаюцца яе задачы. Дойлідам неабходна па-новаму вырашаць праблемы рацыянальнага размяшчэння прадукцыйных сіл, фарміравання ўзаемазвязанай сеткі населеных месцаў, рэгулявання росту гарадоў, аховы навакольнага асяроддзя.

У першыя гады пасля Вялікага Кастрычніка, грамадзянскай вайны, а пасля ў выніку разбуральнай варожай акупацыі нашай тэрыторыі нямецка-фашысцкімі захопнікамі ўсе сілы і сродкі накіроўваліся на аднаўленне народнай гаспадаркі. І задачы архітэктуры зводзіліся да ліквідацыі слядоў разбурэння. Перавольвалі мы і недахопы планавання і забудовы гарадоў, якія пакінуў капіталізм. Асабліва вялікая і планамерная рэканструкцыя гарадоў і вёсак БССР разгарнулася ў трыццатыя гады. Мінск, Віцебск, Магілёў і іншыя населеныя пункты сталі прамысловымі цэнтрамі. Былі распрацаваны генеральныя планы забудовы гэтых гарадоў. Сярод яркіх твораў беларускага дойлідства варта назваць такія, як Дом урада, оперны тэатр, акруговы Дом афіцэраў, будынак Вышэйшай партыйнай школы, будынак ЦК КПБ у Мінску, гасцініца «Дняпроўская» ў Магілёве. Палац культуры імя У. І. Леніна ў Гомелі і іншыя пабудовы. Яны — характэрныя прыклады адметнасці і пэўнай накіраванасці архітэктурнай творчасці ў Беларусі ў перадваенныя гады. Калі ж гаварыць пра аднаўленне гарадоў і вёсак пасля нашай перамогі над гітлераўскай Германіяй, то тут трэба адзначыць бяспрыкладны і масавы гераізм аднаўленчай працы. Факт ператварэння Беларусі ў адну з індустрыяльных рэспублік СССР сведчыць аб вялікіх намаганнях і значнай перамозе нашага народа ў пасляваенным будаўніцтве. Такая перамога забяспечана была братэрскай дапамогай усёй краіны, усіх народаў Савецкага Саюза. Побач з беларускімі дойлідамі добра папрацавалі архітэктары Масквы, Ленінграда і іншых гарадоў. Асабліва бліскучы прыклад творчай садружнасці — сучасны Мінск у яго архітэктурным абліччы.

Нас, мінчан, як і ўсіх жыхароў Беларусі, вельмі радуе тая высокая ацэнка, якую даў архітэктуры беларускай сталіцы Генеральны сакратар ЦК КПСС, Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР таварыш Леанід Ільіч Брэжнеў на ўрачыстым пасяджэнні, прысвечаным уручэнню ордэна Леніна і медаля «Залатая Зорка» гораду-герою Мінску.

Ленінскі праспект у нашым горадзе стаў сапраўдным помнікам адраджэння горада з руін і попелу. Глыбока сімвалічным з'яўляецца прысуджэнне высокай прэміі ў галіне архітэктуры дойлідам нашай рэспублікі і Масквы, якія выканалі ганаровы заказ часу. Ансамблевы характар уласцівы пасляваеннай забудове асноўных магістралей у Віцебску, Магілёве, Гомелі і іншых гарадах. Адказныя задачы архітэктары і будаўнікі рэспублікі вырашаюць паспяхова дзякуючы клопату аб капітальным будаўніцтве нашай партыі і ўрада.

У практыку масавага жыллёвага будаўніцтва шырока ўводзяцца метады буйнапанельнага і аб'ёмна-блочнага домабудавання, ствараюцца комплексныя жылыя масівы. Узбагачаюцца элементы фасадаў, укараняюцца розныя тыпы фактур, інтэнсіўна распрацоўваецца колер, уводзяцца элементы манументальна-дэкаратыўнага мастацтва. І ўсё гэта надае індывідуальны характар будынкам заводскай вытворчасці. Шмат новага ёсць і ў галіне жыллёвага камфорту.

Жыллёвае будаўніцтва вядзецца з улікам комплекснага вырашэння пытанняў функцыянальнай узаемазалежнасці жыцця, сферы абслугоўвання і ландшафту. У многіх гарадах рэспублікі ўжо сёння мы бачым контуры гэтых масіваў, якія абяцаюць быць цікавымі прыкладамі ансамблевай забудовы. Перш-наперш да іх трэба аднесці жылыя раёны «Усход», «Зялёны Луг» і «Серабранка» ў Мінску.

Аблічча нашых гарадоў складаецца з уліцам грамадскіх будынкаў і пабудоў. Лаканізм сучасных архітэктурных форм, максімальнае выяўленне функцыянальнага прызначэння, акрэсленая пэўнасць

планіровачных вырашэнняў, улік навакольнага асяроддзя, — вось якасці, якія характарызуюць наш сённяшні дзень у гэтай галіне. Праўда, у стварэнні унікальных грамадскіх будынкаў мы зрабілі пакуль што мала. Тут — вялікае поле дзейнасці беларускіх дойлідаў і нашага творчага саюза.

Прамысловае будаўніцтва цяпер спалучаецца з карэннымі якаснымі зменамі ў аб'ёмна-планіровачных і архітэктурна-мастацкіх вырашэннях. Добрыя прыклады ў галіне прамысловага будаўніцтва даюць пабудовы ў Мінску, Брэсце, Віцебску, Барысаве і іншых гарадах.

Інтэнсіўнае развіццё архітэктуры сяла. Мы маем шмат населеных пунктаў, якія па сваіх архітэктурных якасцях і па ступені добраўпарадкавання не адрозніваюцца ад гарадскіх. Варта назваць калгас імя Калініна і саўгас «Волма» Мінскай вобласці, калгасы «Аснежыцкі» і «Савецкая Беларусь» на Брэстчыне, саўгас «Навадворскі» і калгас «Прагрэс» у Гродзенскай вобласці.

Вопыт эксперыментальна-ўзорнага будаўніцтва, які цяпер вядомы далёка за межамі Беларусі, дазваляе нам праверыць на практыцы і вызначыць найбольш арыгінальныя прыёмы планіроўкі і забудовы сельскіх населеных пунктаў. Выяўляюцца і новыя метады ў вырашэнні ўсёй праблемы сельскага будаўніцтва.

Усе ведаюць, што цяпер вядзецца вялікая работа па ажыццяўленні комплекснай праграмы асваення забалочаных зямель. Ідзе эканамічнае і культурнае абнаўленне нашага Палесся. І тут мы рыхтуем комплексныя праекты ўсіх раёнаў. Распрацоўваюцца тэхніка-эканамічныя асновы забудовы гэтага рэгіёна.

Вялікае значэнне маюць творы манументальнага мастацтва, якія пабудаваны на нашай зямлі. Варта толькі прыгадаць такія комплексы, як Хатынь, мемарыял у Брэсцкай крэпасці, Курган Славы, помнік Маці ў Жодзіне і іншыя такога маштабу пабудовы, каб мець права сказаць, што задачы манументальнай прапаганды гераізму і подзвігу выконваюцца планамерна. Мастакам і дойлідам Беларусі, іх творчым саюзам варта і надалей замацоўваць садружнасць, паглыбляць супрацоўніцтва, каб сумесна ствараць высокамастацкія творы манументальнай прапаганды.

Мы, дойліды, разумеем, што ў нас яшчэ ёсць недахопы. Мае месца аднастайнасць прыёмаў забудовы жылых раёнаў, часам непрадумана вызначаецца паверхавасць асобных будынкаў, можна на больш высокім архітэктурна-эстэтычным узроўні будаваць школы і дзіцячыя ўстановы, прадпрыемствы гандлю і грамадскага харчавання. Трэба ствараць больш ансамблевых грамадскіх цэнтраў у раёнах, пасёлках, саўгасах і калгасах, якія мелі б сучасны і дасканалы выгляд. Нам варта пераадольваць спрошчанасць архітэктурна-мастацкіх вырашэнняў. Гэтыя задачы мы разумеем і, усведамляючы іх, робім агляд нашых здабыткаў і нашага вопыту напярэдадні 60-годдзя БССР і Кампартыі Беларусі. Мы прыкладзём усе сілы і творчыя парыванні, каб унесці варты нашага часу ўклад у развіццё сучаснай архітэктуры.

За сяброўскай гаворкай — народны паэт Беларусі П. ПАНЧАНКА і В. БЫКАЎ.

ШЫРЫНЯ І ГЛЫБІНЯ ЭКРАНА

З выступлення сакратара праўлення Саюза кінематаграфістаў БССР, кінарэжысёра Аляксандра КАРПАВА

Пачну выступленне спасылкай на словы Аляксандра Даўжэнкі, якія выяўляюць, на маю думку, асноўную сутнасць савецкага кінамастацтва: глыбокая павага да чалавечай асобы — вызначальная рыса савецкага кінамастацтва, і ні разу яно не прынізіла чалавека пагардай да сваіх задач або мізэрнасцю патрабаванняў да сябе. Так, наш экран не ганяўся за колькасцю карцін з гандлярскіх меркаванняў, не даваў юнацтву ўрокаў грабяжу, не вучыў бандытызму і эгацэнтрызму, не бэсціў моладзь грубымі сцэнамі гвалту і сексу і ніколі не закранаў сюжэтаў, якія нараджаюць пустых летуценнікаў. У эпоху барацьбы народаў за нацыянальнае вызваленне наш экран не атручваў чалавечы розум расізмам, не прыніжаў ні жоўтага, ні чорнага чалавека, ніколі не быў зброяй нацкоўвання народа на народ. Тым наша мастацтва стала ў авангардзе перадавога мастацтва свету, падняўшы чырвоны сцяг сацыялістычнай рэвалюцыі, як гэта паказана ў вялікім фільме «Браняносец «Пацёмкін».

Характэрна, што беларускае экраннае мастацтва нараджалася ў садружнасці з роднай літаратурай. Фільмам «Лясная быль» паводле аповесці Міхася Чарота пачалася гісторыя нашага кінематографа. І далейшыя крокі былі звязаны з імёнамі Якуба Коласа, Змітрака Бядулі, Янкі Маўра і іншых беларускіх пісьменнікаў.

На жаль, сёння, калі наш кінематограф штогод выпускае на экраны пяць або сем фільмаў і дзесяць для тэлебачання, такія кантакты не зусім паслядоўныя. Нас хвалюе сцэнарная праблема. Кінематограф як вытворчасць можа быць забяспечаны самымі сучаснымі тэхнічнымі навінкамі — камерамі, прыладамі, кранамі, трансфакатарамі і ультратрансфакатарамі, нават і добрай плёнкай. Кадры студыі могуць вырасці да высокай ступені прафесійнага майстэрства. І ўсё ж фільм стане сапраўдным мастацкім творам толькі тады, калі аснова яго — добрая, высакаякасная літаратура. Поспех у мастацтве магчымы толькі тады, калі прадметам даследавання мастака становіцца гісторыя і лёс народа. Усё лепшае, усё багацце і чысціня беларускага народа найбольш яскрава праявіліся ў цяжкія гады ваенных выпрабаванняў. Аб гэтым кінематограф сказаў свае слова ў такіх фільмах, як «Канстанцін Заслонаў», «Гадзіннік спыніўся апоўначы», «Альпійская балада», «Праз могілкі», «Іван Макаравіч», «Руіны страляюць», «Полымя», «Доўгія вёрсты вайны», «Чорная бяроза». Ёсць удачы, і яны сталі прыкметнай з'явай у савецкім кінематографе. Затое поспехі ў адлюстраванні сучаснай тэмы ў нас больш сціплыя. Таму мы ўсе асабліва ўдзячныя тым нашым майстрам кіно, якія сёння вядуць настойлівы пошук увасаблення гэтай тэмы. Аўтары такіх розных па відах і жанрах фільмаў, як «Вуліца без канца», «Час яе сыноў», «Сын старшыні», «Нядзельная ноч» і іншых, імкнуцца паказаць унутраны свет чалавека нашага часу, раскрыць сутнасць асобы як будаўніка новага грамадства.

Пісьменнік У. ЮРЭВІЧ, галоўны рэжысёр Дзяржаўнага рускага тэатра БССР імя М. Горкага Б. ЛУЦЭНКА і народны пісьменнік Беларусі А. МАКАЁНАК.

Чаму тут поспехаў менш? Часам, беручыся за работу над сцэнарыем на сучасную тэму, мы бачым, што ў ім ёсць толькі адны аксесуары сённяшняга дня, а меладраматычны сюжэт — учарашні, камедыйныя перыпетыі ўзяты напракат са старога вадэвіля. Ніякія спробы «асучасніць» старое на здымачнай пляцоўцы не могуць памагчы. Персанажы ходзяць у сённяшніх касцюмах, гучаць песні сённяшняй манеры выканання, у цэху збіраюць «Жыгулі», на сцяне вісіць каляндар 1978 года, а фільм — стары, з даўно адпрацаваным сюжэтам, пазбаўлены глыбокай праблематыкі. Абыякавасць гледача да фільма зразумелая, але мастаку балюча, бо ён аддаў шмат сіл і здароўя працэсу здымак і шчыра спадзяваўся, што робіць патрэбную справу.

Трэба заўсёды быць на вышыні сучасных патрабаванняў да мастацтва і паграмадзянску адказна ставіцца да сваёй справы.

У нас вялікі абавязак перад людзьмі, якія пераўтвараюць аблічча зямлі, вырошчваюць хлеб. Засяроджваючы творчыя сілы, рыхтаваліся мы да паказу на экране новага Палесся. Цяпер мы можам сказаць, што прыступілі да ажыццяўлення гэтай задумы. Мы хочам ва ўсёй мастацкай і гістарычнай паўнаце расказаць з экрана, якім быў гэты край, край балотаў і пяскоў, як ён дзякуючы намаганням партыі і народа пераўтвараецца сёння, якім ён будзе. Першы фільм «Людзі на балоце» будзе экранізацыяй рамана І. Мележа, які раскажа пра калектывізацыю на Палессі. Другі — пра пераўтварэнне Палесся сёння (над сцэнарыем для яго працуе творчая група пісьменнікаў і кінематаграфістаў). Пасля гэтага мы паглыбім раскрыццё новага жыццёвага далягляду ў новых фільмах.

На маю думку, «Чорная бяроза» ўзнімае новую тэму для беларускага кінематографа — вяртання пераможцы з вайны да мірнага жыцця. Гэта фільм пра людзей, якія, прайшоўшы ўсе выпрабаванні вайны, узнімаюць з руін родны горад, будуюць буйнейшы ў рэспубліцы аўтазавод. Гэтую новую тэму — адраджэння — наш кінематограф мае намер прадаўжаць і развіваць.

Сярод хвалюючых нас праблем назаву так званую акцёрскую праблему. У нас у рэспубліцы шмат добрых акцёраў у тэатрах і так мала іх у нашых фільмах. Што за парадокс? Бывае, акцёр з новасібірскага тэатра лічыць адлегласць да павільёна нашай студыі блізкай, а наш акцёр дарогу ад тэатра імя Янкі Купалы да студыі — далёкай. А кіно ж робіць яшчэ і рэкламу — у тэатр пачынаюць хадзіць не толькі «на спектакль», а і «на акцёра», якога палюбіў кінаглядач.

Як бачым, у нас ёсць клопаты і праблемы. Але ёсць і здабыткі, якімі мы ганарымся. Студыя «Беларусьфільм» расце і ўдасканальваецца. Сведчанне гэтаму — трэці квартал запар студыя трымае пераходны Чырвоны сцяг Дзяржкіно СССР і ЦК прафсаюза работнікаў культуры. Гэта пры такіх сапернікаў, як «Масфільм», «Ленфільм», студыя імя Горкага... Кажу не дзеля пахвальбы, а як пацвярджэнне таго, што мы не стаім на месцы, рухаемся наперад і маем вопыт, каб вырашыць праблемы сцэнарныя і акцёрскія. У нашых поспехах немалы ўклад кінадакументалістаў, якія зрабілі шэраг цікавых фільмаў. Дакументалісты аб'яднання «Летапіс» адчуваюць рабочы пульс рэспублікі, яны заўсёды на гарачых пунктах нашых працоўных будняў — у машынабудаўнікоў Мінска, у меліяратараў Палесся, у шахцёраў Салігорска, у Магілёве, Гродне, Наваполацку, на сяле. Яны — баявы атрад беларускага кінематографа.

У нас у творчым саюзе і на студыі склалася дзелавая творчая атмасфера таварыскай узаемадапамогі і патрабавальнасці. Да нас вельмі ўважліва, добразычліва і зацікаўлена адносяцца партыйныя і ўрадавыя органы рэспублікі. Мы будзем імкнуцца ствараць фільмы, дастойныя нашага часу. Заклікаем усе творчыя саюзы рэспублікі развіваць і ўмацоўваць нашы кантакты на дзелавой і творчай аснове. Не замыкацца ў вузкія рамкі рамяства, а дапамагаць адзін аднаму ў нашым узаемным творчым росце, у ідэйна-палітычнай загартоўцы. Да гэтага нас заклікае партыя. Гэтага патрабуе нашае прызванне — служыць нашаму шматнацыянальнаму савецкаму мастацтву.

ЧАС ПАТРАБУЕ, ЧАС АБАВЯЗВАЕ

З выступлення народнага мастака СССР Міхаіла САВІЦКАГА

Прадаўжаючы выдатныя традыцыі, якія склаліся ў савецкім выяўленчым мастацтве, — прысвячаць свае выстаўкі знамянальным датам, мастакі ставяць мэтай стварэнне твораў, якія б з'явіліся якасна новай ступенню ў развіцці мастацтва. Творчая і арганізацыйная работа Саюза мастакоў БССР была звязана з падрыхтоўкай выстаўкі «У сям'і адзінай», прысвечанай 60-годдзю БССР і Кампартыі рэспублікі. Цяпер вядзецца работа па фарміраванню выстаўкі, і, ня-

гледзячы на тое, што мы яшчэ не пазнаёміліся з усімі творамі, можна сказаць, што праца беларускіх мастакоў была плённай.

Мы ганарымся нашымі дасягненнямі за апошнія дзесяцігоддзі. Многія творы дастойна прадставілі беларускае мастацтва на ўсесаюзных і замежных выстаўках. Шэраг твораў, створаных за гэты час, увайшлі ў скарбонку савецкага мастацтва. Шырока разгорнута выставачная работа. Дастойнае месца займаюць у экспазіцыях творы савецкіх мастакоў, што, вядома, прываблівае гледача, з'яўляецца важным укладам у справу ідэйнага, патрыятычнага і эстэтычнага выхавання народа.

Тым не менш гэтыя дасягненні ў пэўнай меры не вырашаюць задач, пастаўленых Камуністычнай партыяй перад мастакамі — задач глыбокага пранікнення выяўленчага мастацтва ва ўсе сферы дзейнасці савецкіх людзей. Намі вельмі мала зроблена для размяшчэння сапраўдных твораў мастацтва ў дамах культуры прадпрыемстваў, саўгасаў, калгасаў і іншых грамадскіх будынках. Станковыя ж творы выяўленчага мастацтва на заводах, у калгасах і саўгасах могуць шмат расказаць аб жыцці іх працоўных калектываў, аб важнейшых падзеях у гісторыі краіны, аб сённяшняй сацыялістычнай рэчаіснасці. Трэба ствараць партрэтныя галерэі герояў працы і вайны ў тых месцах, дзе яны жылі і жывуць.

Вялікая роля тут належыць станковай графіцы, паколькі ёсць магчымасць тыражыраваць творы. Стварэнне тэматычных выставак з 20—30 эстампаў, якія б расказвалі пра перамогу Кастрычніцкай рэвалюцыі, пра Вялікую Айчынную вайну, гісторыю ВЛКСМ ці пра важнейшыя падзеі сучаснасці ў колькасці 500—1000 экземпляраў, аказала б неацэнную дапамогу піянерскім і камсамольскім работнікам, прапагандыстам, агітатарам у афармленні пастаянных экспазіцый.

Шмат трэба зрабіць Саюзу мастакоў рэспублікі і іншым творчым арганізацыям у вырашэнні праблем прадметнага асяроддзя, той своеасаблівай «другой прыроды», якую стварае вакол сябе чалавек, пераўтвараючы прыроду сапраўдную. У гэтым кірунку важная роля надаецца мастацкай творчасці, і яе нельга звесці толькі да задавальнення эстэтычных патрэб.

Мы ганарымся нашай адноўленай сталіцай — горадам-героем Мінскам. Вырашаны паспяхова многія жыццёва важныя праблемы горада, які ўжо даўно перайшоў свой мільённы рубеж. Аднак будаўніцтва новых жылых раёнаў вядзецца цяпер толькі так, што асноўная ўвага ўдзяляецца паляпшэнню жылых умоў. Мастацкае ж афармленне інтэр'ераў будынкаў, узвядзенне пабудоў па індывідуальных праектах практыкуецца яшчэ не заўсёды.

У пэўнай меры з'яўляецца паказальным абмен думкамі прадстаўнікоў саюзаў мастакоў і архітэктараў за «круглым сталом» у сувязі з перадавым артыкулам газеты «Правда» ад 17 верасня сёлетняга года. Вось як, напрыклад, разумеюць архітэктары «патрабаванне сучаснасці» ў цяперашнім горадабудаўніцтве: для іх усё зводзіцца да вырашэння толькі тэхналагічных патрабаванняў таго ці іншага аб'екта. Станцыя метро— гэта перш-наперш платформа для пасажыраў, тэатр — сцэнічная пляцоўка з максімумам месцаў для гледачоў, жылы раён — забеспячэнне нармальных камунальных паслуг. А дзе ж прадметнае фарміраванне асяроддзя? Дзе эстэтычнае афармленне яго?

Думаецца, станоўчую ролю ў гэтым меў бы спецыяльны орган, у склад якога павінны ўвайсці ідэалагічныя і савецкія работнікі, архітэктары, мастакі, вучоныя-сацыёлагі, інжынеры і іншыя спецыялісты. Яго задачай павінна стаць распрацоўка тэматычнай накіраванасці ў фарміраванні прадметнага асяроддзя, як тых жылых раёнаў, якія ўжо існуюць, так і новых.

Для практычнага ажыццяўлення пастаўленых задач неабходна вырашэнне важнай праблемы — падрыхтоўкі спецыялістаў — як праекціроўшчыкаў, так і майстроў - выканаўцаў. Вострая патрэба ў дызайнерах павінна пакуль што вырашацца падрыхтоўкай іх у тэхнічных ВНУ. У далейшым жа, думаецца, неабходна адкрыць мастацкі інстытут і шэраг сярэдніх спецыяльных мастацкіх навучальных устаноў.

Усё гэта будзе садзейнічаць далейшаму набліжэнню мастацтва да жыцця, да запатрабаванняў народа.

Народны мастак СССР М. САВІЦКІ і паэт Н. ГІЛЕВІЧ.

ПРЫЯЗДЖАЙЦЕ ДА НАС НА ПАЛЕССЕ!

З выступлення эканаміста калгаса «Беларусь» Ляхавіцкага раёна Н. ДРАЧАН

Дарагія таварышы! Шчыра дзякую, што запрасілі мяне на гэты ўрачысты пленум. Калі сказалі, што трэба ехаць у Мінск, крыху разгубілася. І не дзіва што. Тут такое сузор'е і пісьменнікаў, і мастакоў, і кампазітараў, і журналістаў... Словам, трывогу маю можна зразумець. Хоць вельмі ўжо трывожыцца падстаў няма.

Наш калгас «Беларусь» да першай гадавіны Канстытуцыі СССР выканаў планы трох гадоў дзесятай пяцігодкі па ўсіх відах сельскагаспадарчай прадукцыі. Ураджай збожжавых сёлета склаў 36,8 цэнтнера з гектара, бульбы — 240, ільновалакна — 9 цэнтнераў. Другі год трымаем пераходны Чырвоны сцяг ЦК КПСС. Словам, добрыя падарункі падрыхтавалі мы юбілею рэспублікі і Кампартыі Беларусі. Высокія паказчыкі і ў шмат якіх іншых гаспадарках.

Праўда, ёсць у нас і пэўныя недахопы. Кіраўніцтва наша, вядома, бачыць іх і крытыкуе. Толькі крытыка гэта прыемная, бо цяпер нас усё больш і больш крытыкуюць не за надоі, не за ўраджай, а за культуру сяла. За арганізацыю адпачынку людзей. За недастатковы, як пішуць газеты, «рост маральна-эстэтычнага ўзроўню».

Наконт маральнага росту можаце не сумявацца. А вось з эстэтычнага боку— тут сапраўды трэба крыху падцягнуцца. І без вашай дапамогі, дарагія таварышы, тут у нас можа быць няўпраўка. Хочаце— крыўдуйце, хочаце — не крыўдуйце, але не частыя вы госці ў нас на Палессі. Не прыязджаеце нават тады, калі вас запрашаюць.

А Іван Паўлавіч Мележ часценька наведваўся на Палессе, і без асобага запрашэння. Вось прыедзе—і жыве тыдзень-другі. Сэрца, відаць, клікала. А сэрца нездарма кліча. Да яго толькі прыслухацца трэба.

Некаторыя пісьменнікі з верталёта з Палессем знаёмяцца. Канечне, з верталёта многае відно. І хоць раз трэба на наш край глянуць зверху. Я колькі гадоў жыву на Палессі, а як глянула на яго зверху — сэрца захапіла ад яго шырыні, ад блакіту, ад прыгажосці. Цікава глядзець з верталёта. А пешшу ўсё ж цікавей. І карысней. Успомнім, напрыклад, Я. Коласа: ён ведаў і любіў Палессе — меў звычку пешшу хадзіць, з людзьмі знаёміцца. А якія творы цікавыя пісаў!

Я запрашаю да нас у госці і мастакоў, і кампазітараў, і пісьменнікаў, і архітэктараў, і журналістаў, хоць яны і часцей бываюць. У нас вы і палятаеце, і паездзіце, і пешшу паходзіце. І за сталом пасядзіце. Яно іншы раз не пашкодзіць з палешуком за сталом пасядзець. За добрым сталом ды цікавай бяседай ён такое вам раскажа, што на праспектах вы ніколі ў жыцці не пачуеце.

Мележ так і рабіў. Пагутарыць з цікавым чалавекам, а потым словы яго — у кніжку! І ніхто не скажа, што словы тыя не да месца. Ой як да месца! Так да месца, што кніжкі тыя бессмяротнымі застануцца.

Дарэчы, пра бессмяротнасць, ці лепш сказаць, пра след на зямлі. Што застанецца пасля нас? Справы нашы застануцца. А праз справы — і людзі. Справы, добрыя і мудрыя справы навечна запісалі ў нашай памяці імёны нашага любага Васіля Захаравіча Каржа, палымянай Веры Харужай. А якім славутым чалавекам стаў на палескай зямельцы старшыня з Аснежыцаў — Уладзімір Антонавіч Ралько!

Двойчы Герой Сацыялістычнай Працы... Я так разумею: званне гэтае дала яму Радзіма за яго вялікае сэрца, за яго чалавечую дабрату, за яго адказнасць, за яго партыйнасць. Многа ў нас на Палессі такіх самаадданых, такіх цікавых людзей.

Скажу вам шчыра: можа, сёння якраз і пачаўся на Палессі сапраўдны гоман-гоман. Палессе ўздыблена. Палессе ў новабудоўлях.

Абнаўляецца працаю рук нашых, працаю палешукоў, працаю тых, хто прыехаў на Палессе, каб абнавіць гэты край. Гут і саўгасы новыя будуюцца, і рыбгасы, новыя фермы, новыя фабрыкі. Гэта ўсё трэба паглядзець, гэтага ўсяго не пералічыш.

Галоўнае — мяняецца чалавек на Палессі. Ужо няма таго Палесся, калі чалавек не мог даехаць да бальніцы, калі ён дзяцей не мог у школу адправіць. І трэба было за многія вёрсты плыць на лодцы і па соль, і па хлеб. Усё гэта ў мінулым.

Цяпер Палессе другое. І нам іншы раз крыўдна, і не толькі крыўдна, але троху і злосць бярэ. Некаторыя вельмі шкадуюць старое Палессе. Не трэба шкадаваць старое Палессе. Вядома, вучоныя павінны рабіць усё з вялікай адказнасцю, каб нічога не пашкодзіць, каб засталася прырода, каб радавала вока прыгажосць нашага Палесся. А старога Палесся не трэба шкадаваць. Цяжка жылося там людзям. Вельмі цяжка жылося людзям на Палессі раней.

І цяпер яшчэ шмат у нас праблем. І чым хутчэй перабудуем Палессе, тым будзе лепш. Лепш для нас з вамі. Лепш для людзей. Усё ж робім для людзей.

Пра будоўлю скажу. Будуем мы многа. Часам многа дарагога і непрыгоднага. Трэба, ой як трэба Палессю таленавітыя архітэктары! Часам кажуць: будуем навек. То і на вякі будаваць трэба добра. Мы не супроць таго, што паляшуцкія хаты шматпавярховымі сталі, але і не ўсё там прадумана. Не кожны архітэктар ведае, што ж трэба нашаму сялянскаму дому.

А ўзяць нашы вясковыя клубы, дамы культуры. Што праўда, то праўда: любяць некаторыя старшыні выхваляцца, у каго Палац культуры большы. Давайце падумаем разам, можа, і не трэба сялу абавязкова гмах, на які сотні тысяч рублёў вылятае. А яшчэ нярэдка ён пустуе затым. Можа, сялу іншыя праекты культурных комплексаў патрэбны? Давайце падумаем разам...

Дарэчы, пра тое, што часам пустуюць дамы культуры. Бадай што толькі філармонія не забылася пра тое, што ёсць на свеце палескія вёскі, меліярацыйныя аб'екты. Не памятаем мы, каб наведаліся да нас у Ляхавічы калектывы драматычных тэатраў, альбо мастакі, скульптары.

Я чула, у наступным годзе будзе цікавая мастацкая выстаўка «Зямля і людзі». То добра б было, каб яна пабывала і на той зямлі, пра якую раскажа.

Нам радасна было чытаць у дакладзе Пятра Міронавіча Машэрава на XIV пленуме Цэнтральнага Камітэта Кампартыі Беларусі пра тое, што праблема комплекснага развіцця Палесся займае ў дзяржаўным плане важнае месца. Вялікую задачу паставіла партыя: на Палессі будуць створаны буйныя аграпрамысловыя комплексы. Толькі ялавічыны яны павінны будуць даваць у год не менш як адзін мільён тон! Вялікі размах! А вялікі размах нараджае моцныя характары. Такія характары, пра якія высокім мастацкім словам гаварыць хочацца. І мы даўно чакаем, дарагія таварышы з «Беларусьфільма», глыбокага мастацкага ўвасаблення тых з'яў і тых праблем, якімі жыве ўзнятая палеская цаліна.

Наперадзе ў нас — шырокія далягляды. Ліпеньскі Пленум Цэнтральнага Камітэта нашай партыі вызначыў вялікую праграму пераўтварэння сяла. Пераўтварэння эканамічнага і сацыяльнага.

Калі палескія хлебаробы праводзілі мяне на сустрэчу з вамі, то сказалі: перадай удзельнікам пленума — мы не шкадуем сіл, каб наш каравай быў самы важкі. Але здаўна ў народзе прынята каравай упрыгожваць. Упрыгожваць і добрай песняй, і мудрым словам. А слова за вамі, дарагія таварышы!

НАША АГУЛЬНАЯ СПРАВА

З выступлення народнага артыста СССР Расціслава ЯНКОЎСКАГА

Усім нам добра вядома думка Уладзіміра Ільіча Леніна, што найлепшы спосаб адзначыць юбілей — гэта скіраваць сваю ўвагу на нявырашаныя яшчэ пытанні. Рыхтуючыся да сённяшняга выступлення, я зноў перачытаў выступленне таварыша Л. І. Брэжнева на нядаўнім, лістападаўскім Пленуме ЦК КПСС, і словы гэтыя адразу мне ўспомніліся. Асабліва ўсхвалявала тая частка даклада Леаніда Ільіча Брэжнева, дзе ён дае прынцыповую, вострую ацэнку ідэалагічнай работы ў краіне. У выступленні, праўда, гаворыцца пра радыё і тэлебачанне, але, вядома ж, гэта мае непасрэднае дачыненне і да нас, работнікаў тэатра.

Поспехі тут, як і ў іншых галінах творчай дзейнасці, відавочныя. Асабліва яскрава бачацца яны сёння, калі мы падводзім вынікі сваёй работы напярэдадні 60-годдзя Беларусі і Кампартыі рэспублікі. І ўсё ж, як мне здаецца, яшчэ трэба зрабіць нямала, каб тэатр стаў цікавейшым, больш неабходным для гледача.

Ёсць такі неафіцыйны тэрмін — жывы тэатр. Што гэта азначае? Гэта такі тэатр, які адклікаецца на сённяшнюю праблему не фармальна, а па-сапраўднаму. І тут наўрад ці можна планаваць тыя ці іншыя спектаклі, на тую ці іншую тэму. Тут трэба браць такія творы, якія варты велічы самога часу, а не проста падыходзяць да пэўнай кампаніі. Інакш тэатр, як тэатр, па сутнасці перастае існаваць.

Творы ж глыбокія, значныя па сваім ідэйным і мастацкім гучанні прываблівае увагу самага шырокага гледача. Лепшы прыклад гэтаму — балет «Ства-

рэнне свету», пастаўлены нашым Акадэмічным тэатрам оперы і балета. Пры дапамозе музыкі і харэаграфіі ў ім хвалююча, пераканаўча вырашаецца такая важная тэма, як небяспека чалавецтва перад пагрозай атамнай вайны.

Калі мы гаворым праўду, гаворым страсна, публіцыстычна — мы патрэбны гледачу, ён чакае з нецярпеннем новых з намі сустрэч. Ён любіць тэатр і жыве тэатрам. Прыемна, што Міністэрства культуры рэспублікі дапамагае нам у гэтай важнай справе — знайсці свайго гледача. Гэта тычыцца і падбору рэпертуару, і работы з драматургамі. Таму лепшыя спектаклі нашага тэатра імя М. Горкага, тэатраў імя Я. Купалы і Я. Коласа з цікавасцю сустракаюцца не толькі беларускімі гледачамі, яны з поспехам праходзяць і ў час шматлікіх гастроляў за межамі рэспублікі.

Нам патрэбна сапраўдная драматургія, каб вырашаць праблемы часу, ставіць іх востра і надзённа. Праўда, тут справа складаная, бо добрую п'есу не заўсёды знойдзеш. Благая ж не прываблівае гледача, не выхоўвае яго, а, наадварот, як бы адпіхвае яго. Дзе ж выйсце? Па-ранейшаму не варта забываць класіку, бо яна таксама працуе на наш час, узнімаючы агульначалавечыя праблемы, якія ніколі не старэюць. Ёсць таксама і цудоўная літаратура. І ўся савецкая, і беларуская. Чаму б не рабіць часцей інсцэніроўкі цікавых твораў? Вопыт такой работы ў нашым тэатры таксама ёсць. Мы паставілі спектаклі па творах А. Адамовіча, В. Быкава.

На жаль, часам дужа інертнай бывае наша тэатральная крытыка. Як ні дзіўна, яна калі-нікалі не дапамагае акцёру, а, наадварот, як бы заблытвае яго. Не разумеючы таго, што робіць канкрэтны акцёр, увесь калектыў тэатра, некаторыя з рэцэнзентаў пачынаюць нешта дадумваць, даасэнсоўваць. Наўрад ці ёсць ад гэтага якая-небудзь карысць тэатру.

А аператыўнасць рэцэнзавання? Тут ужо сапраўды часам дзіўная заспакоенасць. Рэцэнзіі на некаторыя спектаклі з'яўляюцца ў друку праз 4—6 месяцаў, а то і праз год.

Аднабаковасць ацэнак, павярхоўнасць іх заўважаецца тады, калі крытыкі не здолелі правільна зразумець як задуму рэжысёра, так і задуму самога акцёра. Слізганне па паверхні з'яў, суб'ектывізм у ацэнках — усё гэта не прыносіць карысці ні тэатру, ні гледачам.

Мастацтва — наша агульная справа, наша ідэалагічная работа. Быць памочнікамі партыі ў справе выхавання народа —задача, значнасць і неабходнасць якой асабліва ўзрастае сёння. І мы ўпэўнены, што работнікі тэатра з ёй паспяхова справяцца.

СПЛАЧВАЦЬ НАРОДУ ДОЎГ

З выступлення заслужанага дзеяча мастацтваў БССР, кінарэжысёра Віктара ДАШУКА

Кожны з нас мае свае абавязкі ў калектыве, у сям'і, на рабоце. Увогуле гэтым і жыве чалавек.

Чым вызначаецца ўраджайнасць хлебнай нівы? Якасцю хлеба. Каштоўнасць жа чалавека, як асобы, вызначаецца той карысцю, якую ён прыносіць людзям, свайму народу. Таму сёння, калі ў наш дом прыходзіць свята, і хочацца гаварыць аб абавязку перад народам, разважаць аб нашым укладзе, як дзеячаў культуры, у агульную справу.

Не мне вам напамінаць, якая цяжкая і адказная місія мастака, асабліва кінадакументаліста. Але яна не толькі адказная, але і пачэсная. І наш найпершы абавязак перад людзьмі — паспець за часам, паказаць яго імклівы наступ, бо ў першую чаргу па нашых работах будуць меркаваць нашы ўнукі і ўнукі нашых унукаў, як жылі, як адзначалі святы, як працавалі, як ваявалі мы — савецкія людзі ў дваццатым стагоддзі.

Аглядваючыся сёння назад, можна з упэўненасцю сказаць, што дакументальны экран нашай рэспублікі за ўсе гады існавання беларускага кіно быў, як кажуць, на перадавой. І сёння, ва ўсе гэтыя святочныя і ўрачыстыя дні, словы ўдзячнасці мы гаворым нашым ветэранам-аператарам, якія захавалі для нас летапіс першых пяцігодак, народнага змагання з фашызмам, пасляваеннага аднаўлення разбуранай вайной гаспадаркі.

У нас сотні цікавых карцін аб героях нашага часу, часу вялікіх выпрабаванняў і вялікіх дасягненняў. У кожнай з іх — яркія, непаўторныя характары савецкіх людзей, чые мірныя і ратныя подзвігі варты ўсенароднай увагі і прызнання. З многімі з такіх людзей давялося сустракацца і мне за семнаццаць гадоў сваёй працы кінадакументалістам. Лёсы іх цесна звязаны з лёсам усяго народа.

Поспехі нашы відавочныя, і ўсё ж яшчэ трэба зрабіць нямала, каб кожны твор (і не толькі кінадакументалістыкі) гучаў па-грамадзянску страсна і адкрыта. Перашкаджае ў нашай працы часам боязь, няўпэўненасць, ці зможам мы раскрыць спаўна тую ці іншую праблему, якая стаіць у дадзены момант перад мастацтвам.

Мастацкая смеласць якраз і заключаецца ў тым, каб рашуча выкрываць недахопы, тое адмоўнае, што перашкаджае нашаму руху наперад. На жаль, некаторым творам не хапае пераканаўчасці. Аднак не варта забываць, што нам, дзеячам культуры, дадзены ганаровы абавязак быць не толькі мастакамі, а і прапагандыстамі.

Сучаснага гледача ўжо не здзівіш знешняй праўдападобнасцю, яму патрэбны творы шырокага грамадзянскага гучання, такія, як, скажам, новы спектакль «Трывога» ў Рускім тэатры БССР імя М. Горкага.

Хацелася б пажадаць менавіта смеласці, смеласці творчай і чалавечай тым, хто прысвяціў сябе служэнню мастацтву, а значыць—і народу.

Паэты Г. БУРАЎКІН і Б. СПРЫНЧАН.



СЕЙЦЕ РАЗУМНАЕ, ДОБРАЕ, ВЕЧНАЕ

З выступлення слесара-інструментальшчыка вытворчага аб'яднання «Інтэграл» А. ПАРАХНЕВІЧА

Далучэнне народа, кожнага савецкага чалавека да культуры, мастацтва, духоўных багаццяў, выпрацаваных усім чалавецтвам, стала сёння дзяржаўнай задачай, поспех у вырашэнні якой залежыць ад усіх нас. Гэта асабліва яскрава бачна на прыкладзе нашага вытворчага аб'яднання «Інтэграл».

Сярэдні ўзрост нашых рабочых — 28 гадоў. Штогод у калектыў прыходзяць сотні юнакоў і дзяўчат, якія закончылі сярэднюю школу ці тэхнічнае вучылішча, большасць з іх — учарашняя сельская моладзь. І наша задача заключаецца ў тым, каб зрабіць з іх сапраўдных рабочых — культурных, адукаваных, высокакваліфікаваных працаўнікоў.

Аднак адукаваны чалавек яшчэ не значыць культурны, таму не выпадкова паўстала перад намі пытанне аб усеагульным духоўным развіцці нашых людзей. З гэтай мэтай на прадпрыемстве створаны народны універсітэт культуры, дзе вывучаюцца праблемы камуністычнай маралі, этыкі і эстэтыкі. Заняткі вядуць высокакваліфікаваныя спецыялісты — выкладчыкі Мінскага інстытута культуры. Ва універсітэце займаецца 200 чалавек.

Яшчэ больш складаныя праблемы ўзнікаюць у сувязі з выхаваннем культуры ўзаемаадносін. Прымітыўнасць пачуццяў, чэрствасць, жорсткасць, няздольнасць суперажываць — гэта не прыродныя задаткі. Няёмка за кіраўніка, які грубіяніць свайму падначаленаму, павышае голас. Горка і крыўдна, калі ў цябе на вачах зневажаюць жанчыну. А такое ж яшчэ нярэдка можна ўбачыць у нашым жыцці. Таму культуру пачуццяў, паводзін чалавека можна і неабходна выхоўваць.

У гэтых адносінах у нас у аб'яднанні робіцца шмат. У заводскіх інтэрнатах, працоўных калектывах часта праходзяць дыспуты і вечары на тэмы «Этыка ўзаемаадносін», «У чалавеку ўсё павінна быць прыгожым», «Калі інтэрнат — твой дом», «Твой любімы горад» і г. д. І тут лепшым памочнікам з'яўляюцца кнігі, кінафільмы, спектаклі. Частымі гасцямі ў нас бываюць беларускія пісьменнікі, кампазітары, артысты, музыказнаўцы. Па сённяшні дзень мы помнім сустрэчы з Н. Гілевічам і Г. Бураўкіным, І. Шамякіным і В. Быкавым, кампазітарам І. Лучанком, артыстамі Г. Чарнышовым, В. Сінайскім, Ю. Смірновым, М. Жылюком, Ю. Сідаравым, мужам і жонкай Стрыжовымі, Б. Уладамірскім, З. Стомам, музыказнаўцамі В. Сізко і Ю. Смольскім, мастакамі-мадэльерамі мінскага Дома мадэлей.

Вялікая ўвага ў нашым калектыве ўдзяляецца народнай творчасці. Мы ганарымся сваім хорам, якому ў маі сёлетняга года прысвоена званне народнага. У аб'яднанні працуе аматарская кінастудыя, фільмы якой неаднаразова адзначаліся на гарадскіх, абласных, рэспубліканскіх і нават усесаюзных аглядах. Карыстаецца папулярнасцю студыя бальнага танца, духавы аркестр, танцавальны ансамбль, драматычная студыя, чатыры вакальныя групы, шэсць вакальна-інструментальных ансамбляў, у якіх займаецца звыш 700 рабочых, інжынераў, тэхнікаў і служачых прадпрыемства.

На нашых вачах карэнным чынам змяніўся сам воблік рабочага. Адыходзіць у мінулае рабочы старога тыпу, які займаўся ў асноўным цяжкай фізічнай працай, мала клапаціўся аб пашырэнні свайго кругагляду. Цяпер рабочы высокаадукаваны, ініцыятыўны, перад ім адкрыты шырокія шляхі прафесійнага развіцця, перспектывы сацыяльнага росту, далучэння да высокай культуры. Большасць маіх таварышаў па працы ідуць менавіта гэтым шляхам. Напрыклад, слесар нашага цэха Уладзімір Пятровіч Ляўковіч — ударнік камуністычнай працы, слесар-універсал, вельмі любіць сваю справу. Гэты чалавек тое, чаго дасягнуў сам, шчодра перадае іншым. Уладзімір Пятровіч — лепшы настаўнік моладзі, узначальвае савет настаўнікаў цэха. Яго любяць, яго думкамі даражаць, да яго парад прыслухоўваюцца.

Ляўковіч — актыўны ўдзельнік мастацкай самадзейнасці, спявае ў хоры, рэгулярна ходзіць на рэпетыцыі. Любіць песню і сябруе з ёй усё жыццё. Прызнаюся шчыра, жыццё гэтага цудоўнага чалавека з'яўляецца для мяне прыкладам. Я таксама люблю песню, захапляюся турызмам, спортам. І без харошых спектакляў, кніг, песень не ўяўляю сабе жыцця.

Ці ўзяць іншых удзельнікаў нашага хору — Канстанціна Нічыпаравіча Чумічова, Мікалая Крота, Зінаіду Астапюк, Ганну Шуляк, Уладзіміра Цімашука. Ім песня таксама «жыць і будаваць памагае». Усе яны заслужаныя людзі ў рабочых калектывах, перадавікі і наватары вытворчасці, выдатныя спецыялісты, а мастацтва дапамагае ім пашыраць свой кругагляд, ісці ў нагу з часам, духоўна расці, сачыць за палітычнымі і культурнымі падзеямі. Захапленне музыкай, песняй, танцам, эстэтычнае любаванне прыродай, помнікамі даўніны вызваляе нас, рабочых, ад дробных эгаістычных пачуццяў, умацоўвае дух калектывізму і таварыскасці, садзейнічае выпрацоўцы грамадскай думкі і традыцый, але галоўнае — дазваляе мець сапраўдных сяброў, духоўна блізкіх людзей.

І ўсё гэта залежыць у канечным выніку ад таго, як здолелі мы размеркаваць свой час. Час, праведзены разумна, з карысцю, прыносіць добрую радасць на працягу ўсяго жыцця. Час, растрачаны па дробязях, абернецца прагаламі ў адукацыі і выхаванні, надзеямі, якія так і не ажыццявіліся.

Сёння, карыстаючыся выпадкам, ад імя ўсяго нашага шматтысячнага калектыву я выказваю словы шчырай прызнанасці і ўдзячнасці вам, дзеячы літаратуры і мастацтва. І надалей сейце вы ў нашых душах разумнае, добрае, вечнае. Вынікі вашай працы не праходзяць бясследна, яны знаходзяць жывы, гарачы водгук у нашых сэрцах, дапамагаюць нам плённа працаваць і радасна, хораша адпачываць.

ВЫСОКАЯ МІСІЯ МАСТАЦТВА

З выступлення намесніка начальніка Палітупраўлення ЧБВА М. ШАПАЛІНА

Зусім нядаўна, напярэдадні 60-годдзя БССР і Кампартыі рэспублікі, адсвяткавала сваё шасцідзесяцігоддзе і наша Чырванасцяжная Беларуская ваенная акруга. Вельмі прыемна ўспомніць сёння, што на працягу ўсіх гадоў жыве, мацуецца цесны і добры саюз паміж творчай інтэлігенцыяй рэспублікі і абаронцамі Радзімы.

Цяжка назваць прозвішча беларуска-

га празаіка, драматурга, паэта, які б не пісаў аб воінах Савецкай Арміі, не прысвячаў ім сваіх натхнёных радкоў. Многія пісьменнікі, якія сёння з'яўляюцца гонарам беларускай літаратуры, свае першыя творы друкавалі ў салдацкай шматтыражцы ці на старонках франтавых газет.

Заўсёды вызначалася баявой скіраванасцю, глыбокай павагай да абаронцаў Радзімы і творчасць беларускіх мастакоў, кампазітараў, архітэктараў, дзеячаў кіно, тэатра.

Таму хочацца перадаць вам, дарагія сябры, ад імя шматтысячных чытачоў у ваенных шынялях найвялікшую ўдзячнасць за вашу вернасць ваенна-патрыятычнай тэме, выказаць удзячнасць за тое, што сваёй творчасцю, талентам вы ствараеце тую магутную духоўную зброю, без якой немагчыма ўявіць выхаванне верных, мужных і ўмелых абаронцаў Радзімы.

Мастацтва ў наш час становіцца ўсё больш значным, фарміруючым фактарам у падрыхтоўцы войск, у выхаванні ўмелых і надзейных байцоў. Радасна, што сярод твораў, якія валодаюць такім моцным, вялікім духоўным зарадам, важнае месца займаюць творы А. Адамовіча, І. Мележа, М. Кругавых, І. Шамякіна, П. Броўкі, А. Куляшова, М. Танка, П. Панчанкі і многіх іншых цудоўных беларускіх пісьменнікаў, а таксама лепшыя фільмы кінастудыі «Беларусьфільм», музыка І. Лучанка, Я. Глебава, Ю. Семянякі, У. Алоўнікава... Новыя творы аб баявой гісторыі Савецкіх Узброеных Сіл, аб мінулай вайне вызначаюцца дакладнай партыйнай пазіцыяй аўтараў, навуковым падыходам да гістарычнага матэрыялу, правільным асвятленнем розных бакоў вайны і подзвігу савецкіх людзей. Мы вельмі і вельмі ўдзячны творчым саюзам і арганізацыям не толькі за тое, што яны ствараюць найвялікшыя каштоўнасці духоўнага ўзбагачэння воінаў, але і шмат робяць, каб гэтая моцная духоўная зброя знаходзілася ў дзеянні, знаходзіла дарогу да людзей. А як не сказаць добрае слова ў адрас рэспубліканскага друку, кіно, тэлебачання, якія хораша і праўдзіва гавораць аб ратнай працы воінаў, іх баявой гатоўнасці! Хацелася б таксама падкрэсліць вялікую ролю прафсаюза работнікаў культуры, рэспубліканскай ваенна-шэфскай камісіі на чале з яе старшынёй, народнай артысткай СССР Аляксандрай Іванаўнай Клімавай, якую яны праводзяць сярод воінаў акругі па ідэйна-мастацкім выхаванні.

У нас, воінаў, ёсць цвёрдая ўпэўненасць у тым, што і надалей творчыя работнікі рэспублікі будуць лічыць сваім найпершым, святым абавязкам падтрымліваць цесную сувязь з арміяй, аказваць яшчэ большую ўвагу распрацоўцы сучаснай ваеннай тэмы, мастацкаму асэнсаванню ратнай працы воінаў, гэтаксама неабходнай, як праца слесара, праца будаўніка, праца механізатара.

ЗАЎТРАШНІ ДЗЕНЬ БАЧЫЦЦА СЁННЯ

З выступлення лаўрэата Ленінскай прэміі архітэктара Юрыя ГРАДАВА

Непазнавальна змянілася Беларусь за гады Савецкай улады. Асабліва гэтыя змены адчувальныя ў Мінску. Замест маленькага, глухога правінцыяльнага гарадка ўзнік сучасны прыгожы горад, што смела глядзіць у сваю будучыню. Паспрабуем жа і мы ўявіць цэнтр горада-героя такім, якім ён будзе праз дзесяць гадоў.

Вось мы знаходзімся на Прывакзальнай плошчы. Цяпер гэта плошча 1905 года. Тут узведзены новы камфартабельны будынак чыгуначнага вакзала, узвышаецца помнік ахвярам Курлоўскага расстрэлу. Па новым пешаходным пераходзе метрапалітэна выходзім на галоўную плошчу сталіцы — плошчу Леніна. Пасля рэканструкцыі яна пераўтварылася, з'явіліся новыя унікальныя пабудовы. У святочныя дні тут, на плошчы, гучыць у запісе голас Ільіча.

На Ленінскім праспекце адкрыліся новыя фірменныя магазіны, па-сучаснаму аформлены інтэр'еры будынкаў, абнавілася ўстарэлая газасветлавая рэклама.

Цэнтральная плошча таксама атрымала новую назву — плошча Кастрычніцкай рэвалюцыі. Тут прыцягвае ўвагу будынак-манумент — музей У. І. Леніна. Вобразная трактоўка яго арганічна звязана з помнікам барацьбітам за Савецкую ўладу. Пасля праведзеных работ па рэканструкцыі трыбун і Музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, устаноўкі перад будынкам ЦК КПБ бюстаў К. Марксу і У. І. Леніну плошча стане яшчэ больш урачыстай.

Адбудуцца вялікія змены і на плошчы Свабоды. Побач са старымі пабудовамі прыгожа будзе выглядаць новы будынак тэатра імя Я. Купалы. Тут жа мяркуецца ўзвесці абеліск гораду-герою. З завяршэннем забудовы дзвюх сумежных плошчаў — Кастрычніцкай рэвалюцыі і Свабоды — гэты важны горадабудаўнічы ансамбль атрымае новае эмацыянальнае і ідэйна-мастацкае гучанне.

Тэму горада-героя дадаткова будуць раскрываць і ўстаноўленыя памятныя знакі-ўказальнікі аб дзейнасці Мінскага партыйнага падполля ў гады Вялікай Айчыннай вайны, а таксама афармленне станцый метрапалітэна. Адказ на пытанне, якім будзе мастацкае вырашэнне станцый, дапаможа адкрыць конкурс, які праводзіцца цяпер. Вялікая ўвага гэтаму пытанню ўдзяляецца Дзяржбудам БССР, дзе сумесна з гарвыканкомам і грамадскасцю шырока абмяркоўваецца праект першай станцыі — парк Чалюскінцаў.

Да 100-годдзя з дня нараджэння народнага песняра завершацца работы ў скверы імя Я. Купалы. Тут, развіваючы тэму існуючага помніка, з'явіцца новы фантан.

У парку імя М. Горкага ля вады будзе ўстаноўлены помнік Буравесніку рэвалюцыі.

Новае арыгінальнае вырашэнне атрымае зона, якая прылягае да будынка цырка. У ёй размесціцца гарадскі кірмаш, а ўздоўж Ленінскага праспекта, у напрамку плошчы Перамогі, — алеі герояў.

Цікавыя змены адбудуцца і ў іншых раёнах горада. Напрыклад, інстытутам «Мінскпраект» з удзелам вялікага атрада праекціроўшчыкаў вырашаецца важная горадабудаўнічая задача — фарміраванне цэнтраў, планаванне новых раёнаў горада.

Мікрараён «Усход-1» мы лічым адным з лепшых прыкладаў не толькі для Мінска, але і для іншых гарадоў. Тут пасапраўднаму вырашаюцца пытанні комплекснага будаўніцтва і добраўпарадкавання...

Вядома, у нашых творчых саюзах архітэктараў і мастакоў ёсць таксама шмат складаных, важных пытанняў, якія нам неабходна разгледзець у бліжэйшы час. Вось толькі некаторыя з іх: ансамблевае завяршэнне забудовы і якасць будаўнічых работ, узвядзенне унікальных будынкаў і пабудоў, праблемы жанравай, тэматычнай скульптуры і зялёнай архітэктуры горада, пытанні эстэтыкі ўвасаблення палітычнай рэкламы і наглядная агітацыі горада і г. д.

Вырашэнне гэтых і іншых праблемных творчых пытанняў павінна стаць нашым пастаянным клопатам.

Пісьменнікі П. КАВАЛЕЎ, М. ЛУЖАНІН, кінарэжысёр А. КАРПАЎ і народны артыст СССР Г. ЦІТОВІЧ.

ПРЫГОЖАЕ — ВАКОЛ НАС

З выступлення студэнткі Мінскага інстытута культуры С. ЯФРЭМАВАЙ

Мы, сённяшняя моладзь, студэнты, жывём і працуем у цудоўны час. Нам пашанцавала! Падумаць толькі, колькі прыгожага вакол нас. Яно ўздзейнічае на нашу свядомасць, фарміруе нашу асобу, выхоўвае ўсебакова і гарманічна развітага чалавека, чалавека камуністычнай будучыні. Гэта цудоўная паэзія Я. Купалы, свет вобразаў Я. Коласа, выдатныя творы П. Броўкі, М. Танка, А. Куляшова, І. Мележа, І. Шамякіна, В. Быкава. Гэта драматургія К. Крапівы, А. Макаёнка і многіх іншых беларускіх літаратараў, творчасць якіх вядома далёка за межамі нашай краіны. Ці ж не да нас, сённяшняй моладзі, звернуты заклік Я. Купалы: «Гэй, узвейце, арляняты, сваім крыллем буйна, бурна!»

Пісьменнік А. КАРПЮК і мастацтвазнавец А. АЛАДАВА.

Фота У. КРУКА.

Фарміруе нашы густы і дойлідства. Прыгожыя ансамблі нашай роднай сталіцы і многіх іншых гарадоў, мемарыялы, узведзеныя на месцах гераічных бітваў. Я і мае равеснікі не бачылі вайны, але Айчынная вайна апякла не адно пакаленне. Рэха яе да гэтага часу пранізвае душы горыччу і болем.

Родныя майго бацькі перажылі такую трагедыю, што і жыхары Хатыні, таму мяне не могуць не хваляваць сіла журбы і горычы Хатынскага комплексу, мужнасць М. Гастэлы, увасобленага А. Бембелем як факел адплаты. І вядома, адгукаюцца ў маёй душы, напаўняюць гонарам за свой народ вобразы М. Савіцкага, В. Грамыкі, што, як мне думаецца, такія блізкія творам В. Быкава. Мы бясконца ўдзячны гэтым мастакам за тое, што іх талент далучыў нас да сапраўднай мужнасці і гераізму, да высокай чалавечнасці.

Студэнтам нашай групы пашчасціла пабываць у майстэрні М. Савіцкага. Мы бачылі яго новы цыкл работ пра фашысцкія канцлагеры. Узрушаныя да глыбіні душы стаялі мы каля гэтых палотнаў.

Яшчэ адно здаецца мне вельмі значным у нашым мастацтве—сувязь прафесійных мастакоў з народнай творчасцю. Для мяне песні І. Лучанка і «Песняроў» гучаць адзінай гармоніяй, таксама як і танцы «Харошак». Я ўспрымаю пяшчотнае па колеры нёманскае шкло, як нешта спрадвечна беларускае. Для мяне залатая беларуская саломка, неглюбскія ручнікі, алаўскія куфры—усё гэта ніці аднаго дывана, імя якому—народная творчасць.

А музыка! Ці ж можа яна не хваляваць, не ўзвышаць нашы душы? І празрыстыя па гучанні песні У. Алоўнікава, і эпічныя па сваім ладзе оперы А. Багатырова і С. Картэса, і палымяныя, гераічныя балеты на музыку Я. Глебава, і творы Г. Вагнера і Д. Смольскага. А спектаклі акадэмічных тэатраў імя Я. Купалы, Я. Коласа, Рускага драматычнага тэатра імя М. Горкага, якія становяцца для нас падзеяй, выклікаюць гарачыя абмеркаванні і дыскусіі. Спадчына Е. Міровіча, Д. Арлова, Б. Платонава, Г. Глебава абавязвае нас захоўваць і памнажаць дасягненні і традыцыі выдатнай школы рэжысёрскага і акцёрскага майстэрства. Мы ўспрымаем гэта як запавет нам, як бясцэнны дар вялікіх майстроў сцэны.

Нам, студэнтам творчых навучальных устаноў, будучым работнікам культуры, радасна і адказна быць прапагандыстамі савецкага мастацтва, несці яго ў масы. Мы яшчэ скажам сваё слова ў беларускай савецкай культуры, якая народжана Вялікім Кастрычнікам і прайшла 60-гадовы шлях развіцця пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі, у культуры, якая ўпісвае сваю адметную, значную і яркую старонку ў шматнацыянальную культуру народаў нашай краіны. Г верце нам — мы зробім усё, каб сказаць яго.

СКАРБ

Не бійтесь заглядати ў словник: Це пишний яр, а не сумне провалля.

М. РЫЛЬСКІ.

На маім стале — два важкія, падрыхтаваныя Інстытутам мовазнаўства імя Якуба Коласа АН БССР і выдадзеныя Галоўнай рэдакцыяй Беларускай Савецкай Энцыклапедыі тамы «Тлумачальнага слоўніка беларускай мовы» (т. 1, А — В, рэдактар М. Лобан; т. 2, Г — К, рэдактар А. Баханькоў). Гартаю іх, а на памяць прыходзяць радкі верша Кастуся Цвіркі «Перлы роднай зямлі»:

Абрус — абцас — азярод — арэлі...
Вясёлка — вырай — вярба — ваўчкі...
Як міла пазвоньваюць, сэрца грэючы,
Чыстых бацькоўскіх слоў ланцужкі!

І гэтыя, прыгаданыя паэтам, словы, і яшчэ ледзь не трыццаць восем тысяч слоў, тэрміналагічных і фразеалагічных словазлучэнняў, «пазвоньваюць, сэрца грэючы» на старонках кніг, якіх мы з такім нецярпеннем чакалі і якія цяпер, перад слаўнай гадавінай 60-годдзя БССР і Кампартыі Беларусі, пачалі з'яўляцца ў свет. Усяго ж у пяці тамах Слоўніка, як дакляруе яго рэдакцыйная калегія (А. Баханькоў, П. Гапановіч, М. Лобан, М. Суднік, на чале з акадэмікам К. Крапівой), мае быць каля ста тысяч слоў і фразеалагізмаў. Гэта менш, чым, скажам, у вядомым «Толковом словаре живого великорусского языка» У. Даля (200 тысяч слоў і 30 тысяч прыказак), але набагата больш, чым у многіх слоўніках сучасных славянскіх моў і літаральна ва ўсіх беларускіх перакладных і тлумачальных слоўніках, што надрукаваны да гэтага часу.

Учытваючыся ў шматлікія артыкулы Слоўніка (а яны падчас успрымаюцца з не меншай цікавасцю, чым белетрыстыка), даходзім да яснай думкі, што з'яўленне такога, першага ў гісторыі беларускай лексікаграфіі, шматтомнага выдання стала магчымым дзякуючы перш за ўсё нястрымна-бурнаму развіццю самой нацыянальнай мовы ў XIX, пачатку XX ст. і асабліва — у апошнія шэсцьдзесят савецкіх гадоў. За гады Савецкай улады канчаткова склалася літаратурная норма беларускай мовы, надзвычай папоўніўся яе лексічны склад (за кошт уласных рэсурсаў і запазычанняў, пераважна з рускай мовы), развіліся розныя стылявыя пласты яе (літаратурна-мастацкі, грамадска - палітычны, навукова - тэхнічны, дзелавы), мова набыла статус дзяржаўнай, раўнапраўнай у сям'і іншых моў краіны. Разам з тым яшчэ большай павагай праймаешся да кожнага, хто рупліва, па слоўду збіраў народны скарб — па бярвенцу, па вянку ўзводзіў зруб беларускай лексікаграфіі, падрубы якой паклалі Ф. Скарына і Л. Зізаній. Гэта (калі мець на ўвазе XIX ст.) К. Калайдовіч («Краткий словарь белорусского наречия», 1822), П. Шпілеўскі («Словарь белорусского наречия», 1845), Я. Чачот («Slownik wyrazów krewickich», 1846), С. Мікуцкі («Белорусские слова», 1853—1856) і асабліва — І. Насовіч з яго «Словарем белорусского наречия», што, дарэчы, даўно просіцца на фотатыпічнае перавыданне (1870; тут растлумачана звыш 30 тысяч арыгінальных беларускіх слоў), а таксама Я. Ціхінскі з яго унікальным рукапісным беларуска-руска-польскім слоўнікам (звыш 150 тысяч слоў). Самага добрага слова заслугоўваюць і лексікографы савецкага часу, пачынаючы з М. Гарэцкага, М. Байкова і С. Некрашэвіча і канчаючы сучаснымі мовазнаўцамі, найперш супрацоўнікамі Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа АН БССР, якія ўклалі вядомыя «Русско-белорусский словарь» (1953) і дзевяностатысячны «Белорусско-русский словарь» (1962), а цяпер працуюць над пяцітомным тлумачальным слоўнікам. А як тут не згадаць працавіты калектыў рэдакцыі беларускага слоўніка БелСЭ на чале з кандыдатам філалагічных навук Я. Саламевічам, які шмат робіць для таго, каб кожны том Слоўніка быў і грунтоўным, і навукова дакладным!

«Тлумачальны слоўнік беларускай мовы» — несумненна, праца этапная ў беларускай і ўсёй славянскай лексікаграфіі, падзея вялікага культурнага значэння. Як падкрэсліваюць яго аўтары, «важнейшай задачай Слоўніка з'яўляецца шырокае і дастаткова поўнае адлюстраванне лексічнага стану сучаснай беларускай літаратурнай мовы. Яго галоўнае прызначэнне заключаецца ў тым, каб тлумачыць сэнсавы бок лексічных адзінак, словазлучэнняў і марфем, а таксама служыць нарматыўным даведнікам па стылістычнай, граматычнай і акцэнтуацыйнай характарыстыцы кожнага асобнага слова». З усімі гэтымі задачамі Слоўнік у цэлым спраўляецца добра. Ён увогуле поўна фіксуе сучасную беларускую літаратурную лексіку. Слоўнік дае ў большасці выпадкаў вычарпальную семантычную характарыстыку слоў і фразеалагізмаў. Гэтаму спрыяюць і шматлікія моўныя прыклады — цытаты з розных літаратурных крыніц (шкада толькі, што не ўсе словы праілюстраваны прыкладамі). Даволі грунтоўна апісаны многазначныя словы, паказана сінтаксічнае багацце беларускай мовы, не абыдзены ўвагай не толькі асноўныя, але і дапаможныя, службовыя часціны слова — злучнікі, прыназоўнікі, часціцы, выклічнікі. Так, вытлумачана па 9 значэнняў слоў «жывы» і «кола», па 12 — «вольны» і «вабіць», 18 — «біць» і г. д. Прыназоўнік «да», згодна Слоўніку, ужываецца ў 18 значэннях, а прыназоўнік «з» («са») — нават у 38 (!).

Асабліва неабходна адзначыць, што ў Слоўніку, бадай, упершыню такая ўвага надаецца тэрміналагічным і фразеалагічным словазлучэнням, пададзена шмат прыкладаў з такімі словазлучэннямі. Скажам, словы «адзін» і «бачыш» уваходзяць у 60 асобных словазлучэнняў, «галава» — у 95(!), «вока» — ажно ў 160(!!!).

Нарматыўнасць Слоўніка ўвасабляецца як у адборы лексічнага матэрыялу, так і ў грунтоўна распрацаванай сістэме стылістычных памет: абл. (абласное слова), высок. (высокі стыль), гіст. (адносіцца да гісторыі, гістарычны тэрмін), зневаж. (зневажальнае слова), іран. (у іранічным сэнсе), кніж. (кніжны стыль), лаянк. (лаянкавае слова), паэт. (паэтычнае слова), уст. (устарэлае слова) і да т. п. Такім чынам, Слоўнік — нагляднае пацвярджэнне агромністага лексіка - стылістычнага багацця сучаснай беларускай літаратурнай мовы, здольнай выяўляць самыя тонкія нюансы чалавечай думкі і пачуцця, абслугоўваць патрэбы чалавека ў розных сферах матэрыяльнай і духоўнай дзейнасці.

Многа добрага можна было б яшчэ сказаць пра Слоўнік. Зрэшты, пра яго, я ўпэўнены, будуць гаварыць не раз, гаварыць прафесійна і грунтоўна, асабліва тады, калі ён цалкам пабачыць свет. Мае ж нататкі ні ў якім разе не прэтэндуюць на поўную характарыстыку Слоўніка. Я проста хачу падзяліцца сваёй чытацкай радасцю ад сустрэчы з яго першымі двума тамамі. Разам з тым, рупіць сказаць і пра тое, што мяне ў Слоўніку не задаволіла ці нават засмуціла. Сказаць таму, што напярэдадні яшчэ тры тамы Слоўніка, некалькі гадоў працы і складальнікаў, і рэдактараў, і, магчыма, хаця б некаторыя з маіх заўваг будуць улічаны.

Як мне здаецца, Слоўнік траціць ад таго, што ў ім цалкам ігнаруецца слова перакладной літаратуры (за выключэннем асобных грамадска-палітычных выданняў). У спісе выкарыстанай літаратуры, які падаецца ў 1-ым томе, не названа **ніводная** мастацкага перакладу, прыкладамі з літаратурна - мастацкіх перакладных выданняў не ілюструецца **ніводнае** слова. У той жа час, як мы ведаем, нішто так, як высокамастацкі пераклад таленавітага іншамоўнага слова, не актывізуе рэсурсы роднай мовы, не прымушае «абшарыць кішэні свае памяці» (Я. Колас). Сведчанне гэтаму — шматлікія пераклады А. Куляшова, Ю. Гаўрука, М. Лужаніна, Я. Семяжона, Р. Барадуліна, В. Сёмухі і іншых нашых лепшых перакладчыкаў. Падчас менавіта ў перакладах ужываюцца словы ці іх асобныя значэнні, якія ў мове арыгінальнай літаратуры сустракаюцца вельмі рэдка, а таму і не трапілі ў Слоўнік.

Вось толькі адзінкавыя прыклады.

У Слоўніку не зафіксавана пераноснае значэнне слова «бязмен» (размоўнае, зневажальнае; так кажуць пра чалавека пыхлівага, але разумова недалёкага). Аднак паглядзіце, як умела здабывае з гэтага слова яго пераносны сэнс Я. Семяжон у перакладзе верша Р. Бёрнса «Чэсная беднасць»):

Вось той БЯЗМЕН — прыродны лорд,
Ад пыхі ажно пеніцца;
Кавалак мяса, чым ён горд?
БЯЗМЕН — без змен, не зменіцца.

А. Вялюгін у перакладзе ўрыўка са «Слова аб палку Ігаравым», а таксама Я. Семяжон ва ўзнаўленні «Песні пра зубра» М. Гусоўскага ўжылі архаізм **вой** (воін, ратнік). І гэтага слова з высокага моўнага стылю ў слоўніку не аказалася. Няма ў ім і такіх слоў, як **двабой, землятрус,** што знайшлі пашырэнне ў арыгінальнай і перакладчыцкай творчасці У. Караткевіча і некаторых іншых пісьменнікаў. А ўзвышаны ж паэтычны пласт лексікі ў сучаснай беларускай літаратурнай мове надзвычай абмежаваны, і таму трэба было б з ашчаднасцю паставіцца да кожнага такога слова.

У савецкі час, у тым ліку за пасляваенныя гады, дзякуючы прыходу ў літаратуру шэрагу таленавітых пісьменнікаў з розных куткоў Беларусі літаратурная мова адчувальна абагацілася. Сам Слоўнік наглядна пацвярджае гэта (дастаткова параўнаць яго хаця б з «Белорусско - русским словарем» 1962 года). Аднак і ў ім я не знайшоў асобных слоў, што больш ці менш шырока выкарыстоўваюцца зараз у творах прозы, паэзіі, драматургіі і крытыкі і без ведання якіх нельга ні зразумець усёй ідэйна - мастацкай глыбіні гэтых твораў, ні правільна перакласці іх на іншыя мовы. Я не маю на ўвазе індывідуальныя наватворы тыпу танкаўскіх **адмыславаты, вершаруб;** панчанкаўскага **грыбазбір** або барадулінскіх **калодна** і **вульна.** Відавочна, месца такіх слоў — у спецыяльных слоўніках мовы пісьменнікаў. Гаворка пра іншае — лексемы, што прыйшлі ў мову мастацкай літаратуры перш за ўсё з народных гаворак і ўзбагачаюць яе сінаніміку, пашыраюць лексічны склад, абазначаюць паняцці, не вядомыя літаратурнай мове.

Назаву толькі паасобныя словы, што не ўвайшлі ў першыя тамы Слоўніка і якія, на маю думку, варта будзе растлумачыць у спецыяльным дадатку да ўсяго выдання.

Абвучаць (аб'язджаць каня, дрэсіраваць звяроў. ...У Смаргонскай акадэміі ты медзвядзёў **абвучаў.** М. Танк. «Роздум караля»).

Абечка (сценкі рэшата. Усе тры бабы... ляпалі далонямі па гладкім жоўтым **абечку,** нібы забаўляліся. В. Адамчык. «Чужая бацькаўшчына»).

Баравішнік (збіральнік і прадавец баравікоў. І вось спаткалася аднаго разу на вуліцы... з вядомым трудзянскім **баравішнікам.** М. Гарэцкі. «Віленскія камунары»).

Безвач (не задумваючыся, не гледзячы. І кідаюцца **безвач...** услед за русалкамі ў бездань апосталы і мужчыны. П. Макаль. «Дунайскія русалкі»).

Бесталанны (пазбаўлены таленту, няўмека ....Пад ношай гэтай бязважкасці ніц упаду, **бесталанны.** Я. Семяжон, з перакладу «Песні пра зубра» М. Гусоўскага).

Блакітнець (дзеяслоў ад «блакітны». **Блакітнелі** вадапоі і папаратнікі цвілі. М. Танк. «Мядзельскі вецер»).

Гаркуша, келб (невялікія рыбы прэснаводных рэк. Раман пасмяяўся з такога ўлову: дзве плотачкі, акунь і — трынаццаць **келбікаў** — печкуроў. Я. Брыль. «Золак, убачаны здалёк»).

Блот, блоціць (глум, глуміць. Пускаць няспелае ды ў **блот** за грэх цяжкі яна лічыла. П. Броўка. «Слёзы». Мы ад зняваг яе заслонім, не **зблоцім** — божа барані! Р. Барадулін. «Алегу Лойку»).

Зводы (чужыя нагаворы, намовы. І жылося б, як у людзей, каб не чужыя **зводы.** В. Адамчык. «Чужая бацькаўшчына»).

Хацелася б бачыць у Слоўніку вытлумачэнне і некаторых іншых слоў (ці паасобных іх значэнняў), больш ці менш пашыраных у сучаснай літаратурнай мове: **бязглузда, вывадзгацца, галавасцік, дзядоўшчына, дзякла** (гістарызм; від колішняга падатку), **вершазнавец, кніганоша** (гістарызм; чалавек, які патаемна пераносіў праз граніцу забароненыя кнігі, гл. апавяданне У. Караткевіча «Кніганошы»); **жычка** (від крапівы, якая асабліва моцна пячэцца) і г. д. Асобныя з такіх слоў нясуць у творах сучаснай беларускай літаратуры не толькі звычайную семантычную ношу, але і маюць выразнае мастацка - выяўленчае значэнне. Вось як, напрыклад, «заіграла» слова **вадзіцца** ў гумарыстычным чатырохрадковіку Н. Гілевіча, уступіўшы ў паранімічны перагук з іншымі словамі верша:

Хоць віном, а не вадзіцай
Поіш мяне, сваціца, —
Не хачу з табой вадзіцца,
Бо ты любіш ВАДЗІЦЦА.

Тут, зразумела, я назваў толькі словы, якія па алфавіту маглі б падысці для двух першых тамоў Слоўніка. Разам з тым з хваляваннем думаю пра лёс і некаторых іншых надзвычай каларытных, хоць і рэдкіх, найменняў, якім не знайшлося месца ў папярэдніх руска - беларускім (1953) і беларуска - рускім (1962) слоўніках. Гэта такія словы, як **лажэчнік** (чалавек, які выробляе і прадае лыжкі), **падліковец** (той, хто займаецца падлікам чаго-небудзь, напрыклад, удзельнік усесаюзнага перапісу насельніцтва — аналог рускага слова «счетчик»), **неўталоннік** (ненатольнае немаўля. — **Неўталоннік** мой ты, **неўталоннік,** — ушчувае праўнука старая. А. Пысін. «Неўталоннік») і г. д. Магчыма, хваляванне маё дарэмнае, і ўсё ж, мяркуючы па першых тамах Слоўніка, не беспадстаўнае...

Падчас мяне, як зацікаўленага чытача Слоўніка, не зусім задавальняюць тлумачэнні асобных слоў. Вось як, у прыватнасці, тлумачыцца слова «веснік»: «Тое, што і вястун». Адгортваю Слоўнік на старонцы, дзе тлумачыцца «вястун»: «Той, хто сваім з'яўленнем нагадвае пра набліжэнне чаго-небудзь». Але як жа тады разумець назву часопіса «Веснік БДУ імя У. І. Леніна»?

Альбо вось артыкул «Верш». Тут паказаны тры значэнні гэтага слова, прычым адно недакладнае (у беларускай мове слова «верш» у значэнні «вершаваны радок» не ўжываецца, у адрозненне ад рускага «стих»). У той жа час не сказана, што гэтым словам называюць, апрача ўсяго, сістэму арганізацыі вершаванай мовы нейкага вялікага паэта (напрыклад, купалаўскі **верш**). Але гэта яшчэ не ўсё. Даходзім да тлумачэння асобных тэрміналагічных словазлучэнняў. Тут даводзіцца толькі здзіўляцца. Вось паслухайце: **«Белы верш** — тое, што і вольны верш... **Вольны верш** — верш, які характарызуецца адсутнасцю рыфмы і няпэўнай колькасцю стопаў у радку; **верлібр».** Аўтар артыкула, як бачым, пераблытаў тры зусім розныя паняцці, для абазначэння якіх існуюць тры асобныя тэрміны: белы верш, вольны верш і верлібр (або свабодны верш). Здзіўленне большае ад таго, што ў БелСЭ, якая толькі што выйшла з друку, тэрміны гэтыя выразна размежаваны і ў цэлым дакладна вытлумачаны (гл. т. 2, с. 281; т. 3, с. 156; т. 9, с. 433—434).

...Перагорнута апошняя старонка другога тома «Тлумачальнага слоўніка беларускай мовы». Напярэдадні яшчэ тры сустрэчы з асобнымі тамамі гэтага грунтоўнага і карыснага выдання. Сустрэчы, якіх так прагнуць усе шанавальнікі і даследчыкі роднага слова, а таксама мовазнаўцы і перакладчыкі беларускай літаратуры за межамі рэспублікі. Сустрэчы, якія, верыцца, стануць яшчэ больш радаснымі.

Вячаслаў РАГОЙША.

Яніна Казіміраўна ГЛЕБАЎСКАЯ

Беларускае тэатральнае мастацтва панесла цяжкую страту. На 78-ым годзе жыцця памерла актрыса Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра імя Якуба Коласа, народная артыстка БССР Яніна Казіміраўна Глебаўская. Я. К. Глебаўская нарадзілася ў 1901 годзе ў Мінску. У 1926 годзе, пасля заканчэння Беларускай драматычнай студыі пры Маскоўскім тэатральным вучылішчы, улілася ў склад БДТ (цяпер Акадэмічны тэатр імя Якуба Коласа), назаўсёды звязаўшы свай творчы лёс з гэтым калектывам. На сцэне тэатра імя Я. Коласа былі створаны лепшыя ролі Я. К. Глебаўскай. Сярод іх — Мальвіна ў «Несцерцы» В. Вольскага, Любоў Яравая ў аднайменнай п'есе К. Транёва, Малання ў «Ягоры Булычове» М. Горкага, Гурмыжская ў «Лесе» А. Астроўскага, Забеліна ў «Крамлёўскіх курантах» М. Пагодзіна, Матруна ва «Уладзе цемры» Л. Талстога і інш.

У перыяд Вялікай Айчыннай вайны, знаходзячыся разам з тэатрам ва Уральску і Арэхава-Зуеве, Я. К. Глебаўская актыўна ўдзельнічала ў шматлікіх канцэртах у шпіталях перад воінамі Савецкай Арміі, у воінскіх падраздзяленнях.

Талент Я. К. Глебаўскай увабраў у сябе лепшыя рысы беларускай школы акцёрскага мастацтва, узбагаціўшы сваёй індывідуальнасцю творчае аблічча тэатра імя Я. Коласа. Многа сіл і энергіі аддала яна выхаванню маладой творчай змены. Сярод акцёраў тэатра імя Я. Коласа нямала яе вучняў і паслядоўнікаў.

Я. К. Глебаўская была не толькі таленавітай актрысай, але і прынцыповым, чулым таварышам. Яе заслугі перад беларускім мастацтвам высока ацэнены партыяй і ўрадам. У 1970 годзе ёй было прысвоена ганаровае званне народнай артысткі БССР. Яна ўзнагароджана ордэнам «Знак Пашаны», медалямі і Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР.

Светлая памяць аб Я. К. Глебаўскай — выдатнай актрысе, чулым таварышы — назаўсёды застанецца ў сэрцах тых, хто ведаў яе, працаваў з ёю, хто бачыў яе выдатныя работы ў спектаклях Акадэмічнага тэатра імя Якуба Коласа.

Міністэрства культуры БССР

Беларускае тэатральнае аб'яднанне

Беларускі дзяржаўны акадэмічны ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга драматычны тэатр імя Якуба Коласа.

Беларускі дзяржаўны акадэмічны ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга драматычны тэатр імя Якуба Коласа і Віцебскае абласное аддзяленне БТА з глыбокім смуткам паведамляюць аб смерці старэйшай актрысы калектыву коласаўцаў, народнай артысткі БССР Яніны Казіміраўны ГЛЕБАЎСКАЯ і выказваюць спачуванне родным і блізкім нябожчыцы.

ПАМЯЦІ ТАВАРЫША

З далёкага Петрапаўлаўска-Камчацкага прыйшла сумная вестка: на 57-ым годзе жыцця памёр пісьменнік Уладзімір Варно.

Ён нарадзіўся ў Мінску, тут, у Мінску і на Міншчыне, жыў і працаваў да пачатку сямідзесятых гадоў, тут стаў паэтам, тут прынялі яго ў Саюз пісьменнікаў. Але спачатку, яшчэ да вайны, ён быў рэпарцёрам БЕЛТА, у гады вайны працаваў на будоўлях і заводах Пермскай вобласці, у рэдакцыі газеты Пермскай чыгункі. Пасля вяртання ў Беларусь працаваў у рэдакцыі газеты «Зорька», быў літаратурным кансультантам акруговай газеты «Во славу Родины», дзесяць гадоў працаваў у рэдакцыі маладзечанскай газеты «Красное знамя», некалькі год з'яўляўся спецыяльным карэспандэнтам «Літаратуры і мастацтва».

Ён быў неспакойны, няўрымслівы чалавек, любіў людзей-непаседаў, тых, хто шукае, дзе цікавей, хоць і цяжэй, хто імкнецца туды, дзе найбольш напружана б'ецца пульс часу, пульс жыцця. Гэтая любоў і паклікала яго на Далёкі Усход, на Камчатку, дзе ён пісаў аб працы маракоў рыбалавецкага флоту і сам пастаянна хадзіў з імі на пуціну, гэтая любоў прадыктавала яму некалькі кніжак добрых вершаў — «На стрежень», «Весна продолжается», «Сквозь тучи», некалькі кніжак нарысаў аб людзях працы — хлебаробах, рабочых.

Апошняя кніжка — «Сколько у нас под килем. Судовой журнал поэта» — выйшла зусім нядаўна ў Петрапаўлаўску-Камчацкім. Кніжка сведчыць аб узросшым майстэрстве Уладзіміра Варно, аб тым, што ён дасягнуў сапраўднай сталасці таленту, аб тым, што застаўся верным сабе.

Няхай гэтыя словы развітання будуць жменькай роднай беларускай зямлі, якую даводзіцца кідаць у яго заўчасную магілу...

Валянцін ТАРАС.

НА АБСЯГАХ КУЛЬТУРЫ

Крыніца святла і ведаў

З ГІСТОРЫІ ПАЎЛЕНКАЎСКАЙ БІБЛІЯТЭКІ Ў АСТРАМЕЧАВЕ

Восенню 1905 года ў невялікай вёсачцы Астрамечава Брэсцкага павета Гродзенскай губерні была створана адна з першых на Беларусі народных бібліятэк. Яна была заснавана на сродкі вядомага прагрэсіўнага выдаўца Ф. Ф. Паўленкава, які завяшчаў адкрыць на выдзелены ім фонд 2000 народных бібліятэк-чытальняў. У Беларусі на працягу 1905—1906 гг. было адкрыта ўсяго толькі 11 такіх бібліятэк.

Адной з іх і была Астрамечаўская. З расказаў старажылаў вёскі, першых чытачоў бібліятэкі і асабліва аднаго з яе стваральнікаў — настаўніка мясцовай школы Антона Паўлавіча Зянькевіча, з якім я двойчы сустракаўся пасля яго прыезду ў Астрамечава з Масквы, нарэшце, з наяўных (на жаль, нямногіх) дакументаў можна прасачыць, як пачыналася яе дзейнасць.

Паводле завяшчання Ф. Паўленкава скарыстаць яго фонд можна было толькі ў тым выпадку, калі ёсць памяшканне і сродкі на існаванне бібліятэкі. Да таго ж патрабавалася, каб да пачатку яе работы ў ёй налічвалася б не менш чым 50 кніг.

Добрую дапамогу ў гэтым аказалі студэнты — члены беларускага гуртка ў Пецярбургскім універсітэце. Яны сабралі патрэбную колькасць кніг, дабіліся ад улад памяшкання. Неацэнная была падтрымка і саміх сялян. Па капейцы, па грыўні яны збіралі на набыццё кніг, каб сваімі сродкамі падтрымаць небывалую для беларускай вёскі справу — адкрыццё народнай бібліятэкі.

Хутка расла папулярнасць яе ў Астрамечаве. Пра бібліятэку даведаліся многія сяляне навакольных вёсак. У цесны пакойчык прыходзілі жыхары Сарозавіч, Цюпрык, Баяр, Лышчыц, Кошылава. Большасць з іх былі непісьменныя. Антон Паўлавіч чытаў ім уголас.

У 1907 годзе кніжны фонд Астрамечаўскай бібліятэкі налічваў 1.039 кніг, чытачоў было 220 чалавек. Спашлёмся на такі дакумент. У газеце «Наша ніва» № 21 за 1908 год была змешчана заметка, у якой гаварылася, што ў 1907 годзе Паўленкаўская бібліятэка налічвала больш за тысячу экземпляраў кніг, імі карысталіся жыхары пяці вёсак.

Астрамечаўскую бібліятэку падтрымлівалі сваімі кнігамі многія пісьменнікі. Асабліва радаснай падзеяй, якая запомнілася надоўга, была пасылка Максіма Горкага.

Аўтару гэтых радкоў давялося ў 1955 годзе быць на ўрачыстым вечары, прысвечаным паўвекавому юбілею Паўленкаўскай бібліятэкі. Антон Паўлавіч Зянькевіч, які спецыяльна прыехаў сюды з Масквы, дзе ён тады жыў і працаваў, расказаў, што, даведаўшыся пра існаванне народнай бібліятэкі, Максім Горкі прыслаў у Астрамечава некалькі сваіх кніг. Каштоўным укладам у бібліятэчны фонд былі горкаўскія «Песня пра Сокала» і «Песня пра Буравесніка». Гэтымі кнігамі зачытваліся, яны заклікалі да барацьбы, неслі народным масам праўду жыцця.

З дапамогай бібліятэкі сяляне мелі магчымасць знаёміцца з творамі Купалы, Цёткі, Багушэвіча і іншых беларускіх пісьменнікаў, з «Нашай нівай». Шэраг народных бібліятэк Беларусі, у тым ліку і Астрамечаўская, меў у сваіх фондах творы Л. Талстога, Серафімовіча, Горкага і іншых пісьменнікаў.

Царскі ўрад устанавіў нямала абмежавальных правіл для народных бібліятэк. якія зводзіліся да таго, каб усяляк затармазіць рост нацыянальнай самасвядомасці беларускага насельніцтва, развіццё яго духоўнай культуры.

...Ішлі гады. Рос уплыў і аўтарытэт народнай бібліятэкі. Пашырылася кола яе чытачоў, павялічваўся кніжны фонд. У нядзельныя і святочныя дні тут дэманстраваліся «туманныя карціны», як часам называлі тады кінематограф, праводзіліся лекцыі, гутаркі. Вакол бібліятэкі групавалася не толькі моладзь, але і ўсё дарослае насельніцтва вёскі.

Бібліятэка прыйшла на дапамогу сялянам і ў іншай вельмі важнай справе — займалася прапагандай медыцынскіх ведаў, вяла санітарна-асветную работу. Была адкрыта невялікая аптэчка, у якой меліся самыя неабходныя медыкаменты.

Сем гадоў — з 1905 па 1912 — рознабаковай работай Астрамечаўскай бібліятэкі кіравалі Антон Паўлавіч Зянькевіч і беларускія студэнты, якія прыязджалі з Пецярбурга на канікулы. У 1912 годзе Антон Паўлавіч паехаў у Пецярбург, каб паступіць у вышэйшую навучальную ўстанову.

Пра далейшы лёс народнай бібліятэкі няма, на жаль, дадзеных. Вядома толькі, што яна праіснавала да 1915 года, затым была знішчана немцамі, якія акупіравалі Гродзенскую губерню. У канцы 20-ых гадоў па ініцыятыве жыхароў вёскі яна нанава адраджаецца. Але праз дзесяць гадоў яе разграмілі пілсудчыкі. Пасля ўз'яднання заходніх абласцей Беларусі ў адзінай Савецкай дзяржаве ў 1939 годзе пачала ствацца бібліятэка новага тыпу. Прыйшла вайна, Брэстчыну акупіравалі фашысты і бібліятэка ў каторы ўжо раз спыніла сваё існаванне.

Пасля Вялікай Айчыннай вайны, з 1948 года, пачынаецца найбольш яркі і значны этап у слаўнай гісторыі Паўленкаўскай бібліятэкі ў Астрамечаве. Тройчы знішчаная і тройчы адроджаная, яна пачала будаваць усю сваю работу на сацыялістычнай аснове.

У Астрамечаве, Кашылаве, Рудаўцах і ў іншых населеных пунктах, якія ўваходзяць у склад калгаса «Памяць Ільіча», за гады Савецкай улады адбыліся вялікія перамены. У дамы сялян прыйшоў матэрыяльны дастатак. З асаблівым пачуццём задаволенасці гавораць у Астрамечаве пра нябачаны росквіт культуры. І ў якасці аднаго з яркіх сведчанняў працаўнікі сяла прыводзяць у прыклад сваю бібліятэку, чыёй слаўнай гісторыяй яны законна ганарацца.

У новы цагляны будынак, у якім размяшчаецца Паўленкаўская бібліятэка, уваходзіш з пачуццём прыўзнятасці, усхваляванасці. Тут беражліва захоўваюць усё, што звязана з яе гісторыяй. На сцяне першага паверха — вялікі стэнд з партрэтамі Янкі Купалы, Ф. Паўленкава, першага бібліятэкара-энтузіяста А. Зянькевіча. Экспануецца фотарэпрадукцыя газетнай старонкі «Нашай нівы» № 2 за 1908 год, на якой апублікавана заметка пра Астрамечаўскую бібліятэку і змешчана фота невялікага будынка школы, дзе ў маленькім пакойчыку размяшчалася хата-чытальня. Актывісты, загадчыца бібліятэкі Святлана Лявонцьева робяць захады па пошуку новых дакументаў пра гістарычнае мінулае народнай бібліятэкі.

Бібліятэка перайшла на цэнтралізаваную сістэму абслугоўвання чытачоў. Што гэта дае? Пашырылася зона абслугоўвання, палепшыліся магчымасці для задавальнення іх запатрабаванняў. Кніга стала бліжэй да чытача, яшчэ больш эфектыўна ўздзейнічае на павышэнне яго палітычнага і культурнага ўзроўню. Цяпер кніжны фонд бібліятэкі складае больш за дзесяць тысяч экземпляраў.

Бібліятэка пашырае межы сваёй дзейнасці, ахоплівае сваім уплывам не толькі цэнтр калгаса — Астрамечава, але і многія іншыя населеныя пункты.

Умела выкарыстоўвае бібліятэка наглядную агітацыю. Тут добра афармлены тэматычныя кніжныя выстаўкі, прысвечаныя знамянальнай даце — 60-годдзю БССР і КПБ. Шырока прапагандуюцца творы маладых паэтаў і празаікаў Брэстчыны. Спецыяльны раздзел прысвечаны вобласці, яе сацыяльна-эканамічнаму развіццю, росту культуры.

З дапамогай актыву бібліятэка праводзіць канферэнцыі чытачоў. Асабліва памятнымі былі для сельскіх працаўнікоў калектыўныя чытанні кніг Л. І. Брэжнева «Малая зямля» і «Адраджэнне».

З. ІЛЬЕЎСКІ.

Брэсцкі раён.

РЭХА ЗМАГАННЯ

Споўнілася пяцьдзесят гадоў з дня прэм'еры спектакля «Браняпоезд 14-69» па п'есе У. Іванава ў БДТ-1 (цяпер Акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы). Газета «Звязда» 15 лістапада 1928 года пісала, што гэты твор «стане сапраўдным укладам у беларускае тэатральнае мастацтва». Пасля фурманаўскага «Мяцяжу» беларуская сцэна зноў раскрывала сурвую праўду і рэвалюцыйную рамантыку змагання ўзброенага народа за Савецкую ўладу. Да значных дасягненняў акцёрскага майстэрства ўзнімаліся работы Уладзіміра Крыловіча (Мікіта Вяршынін), Флярыяна Ждановіча (кіраўнік бальшавіцкага падполля Пекляванаў), Уладзіміра Уладамірскага (кітаец Сін Бін-у), Сцяпана Бірылы (палонны амерыканец). Спектакль выклікаў вядомую ў гісторыі тэатра дыскусію аб шляхах развіцця і рэпертуары тагачаснай беларускай сцэны. 17 снежня 1928 года Бюро ЦК КП(б) Беларусі прыняло пастанову «Аб выніках дыскусіі па тэатральных пытаннях», якая падтрымлівала арыентацыю творчых работнікаў на пашырэнне рэпертуару і ўзбагачэнне яго творамі пісьменнікаў братніх рэспублік СССР. Сярод лепшых спектакляў былі названы «Мяцеж» і «Браняпоезд 14-69». Неўзабаве пасля гэтага БДТ-1 пазнаёміў гледачоў са спектаклямі «Запяюць верацёны» па п'есе Е. Міровіча і «Мост» Я. Рамановіча, дзе змаганне народа за ўмацаванне Савецкай улады раскрывалася праз вобразы герояў працоўных будняў на сучасных вытворчых аб'ектах.

К. ЛЯШЧЭНЯ.

«...НА ТВАЁЙ НЕЗАБЫЎНАЙ ЗЯМЛІ, НАВАГРУДЧЫНА»

ДА 180-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ АДАМА МІЦКЕВІЧА

Паездка надарылася нечакана і—на вялікую маю радасць—была вельмі дарэчы. З Саюза пісьменнікаў пазванілі і папрасілі «за кампанію» з групай прадстаўнікоў радыё і тэлебачання Польскай Народнай Рэспублікі зрабіць падарожжа на Навагрудчыну — радзіму Адама Міцкевіча.

Сябры з братняй краіны знарок прыехалі да нас, каб зняць тэлефільм аб сённяшняй Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспубліцы і паказаць усяму польскаму народу і веліч здабыткаў беларускага народа за гады Савецкай улады, і гістарычныя помнікі, якія сведчаць аб культурных сувязях паміж суседзямі. Зрабіць гэта напярэдадні нашай вялікай юбілейнай даты — 60-годдзя БССР і Кампартыі Беларусі. Як не быць удзячнымі за ўвагу! Мясціны Навагрудчыны, звязаныя з памяццю геніяльнага Міцкевіча, па задуме стваральнікаў тэлефільма, павінны жывымі кадрамі сучаснасці і сведкамі мінулага арганічна ўвайсці ў карціну. І гэта зусім заканамерна: наша Навагрудчына — радзіма найвялікшага з польскіх паэтаў; вядомасць і слава польскай паэзіі ва ўсім свеце ў першую чаргу прыйшла праз яго і дзякуючы яму.

...Адкладаю ўбок пяро, загортваю том твораў Міцкевіча ў арыгінале. Не крыўдуй, шаноўны пане Тадэвуш, — расстаёмся не надоўга. К вечару вярнуся, і зноў мы сустрэнемся пры настольнай лямпе. І калі размова будзе спорыцца, праседзім сам-насам да позняй ночы.

А пакуль што мы з тваімі нашчадкамі ў цябе дома, на тваёй «незабыўнай зямлі Навагрудчыны».

Па шашы на Навагрудак — ён ужо відзён мачтамі электраліній і спічастай вежай касцёла з-за ўзгоркаў — спыняемся ў Завоссі, каля яго калыскі. І тут першы снег. Зазімак на каменным трохкутным слупе з мемарыяльнай дошкай. Пух і на галінах выноснай таполі. Толькі яна і засталася з цэлай прысады сваіх сясцёр, што акружалі хутарок. Тут у сям'і небагатага шляхціца-адваката роўна 180 гадоў таму назад у такое ж снежаньскае ранне нарадзіўся хлопчык, якому наканаваў лёс стаць сусветнавядомым Адамам Міцкевічам. Таполя Міцкевіча. Гэта аб ёй і яе не дажыўшых да нашага часу густалістых сяброўках паэт будзе ўспамінаць у «Пане Тадэвушы»: «Пасадкі дзедаўскай выносныя таполі прысадаю густой, як шчытам, год ад году затульвалі і дом, і двор у непагоду». На вялікі жаль, цяпер, акрамя гэтага дрэва, на хутары больш нічога не засталося. Але недалёка той час, калі па макету хутара, які збярогся і захоўваецца ў мемарыяльным музеі паэта ў самім Навагрудку, далёкія патомкі — землякі паэта — узвядуць усе пабудовы: і дом, і знадворныя будынкі, і платы, пасадзяць прысады—усё, як было ў пару маленства і юначых год жыцця Адама. У знак удзячнай памяці і дружбы. Час ідзе, краявіды змяняюцца, а краса прыроды застаецца. І мы, і нашы госці з глыбінь памяці прыгадваем, як яно было, магло быць пры ім. І, мабыць, падабенства ўсё ж ёсць. І яно, гэтае падабенства, хвалюе. Вось хоць бы і яны—камяні, як печышчы каля дарогі, руіны замка, курганы на ўзгорках—і сінеча лясоў на далягладзе. Нездарма суайчыннік і сабрат Міцкевіча па пяру, ужо наш сучаснік Юльян Пшыбась, які, к слову сказаць, таксама нарадзіўся на Навагрудчыне, пабываў тут пасля вайны і ў вершы «Вяртанне з Навагрудка» пісаў, маючы на ўвазе агульныя старонкі гісторыі двух суседніх народаў: «Тут абломкі яе (гісторыі. — Я. С.), як руіны Пампеі: што ні камень—то помнік з міцкевічаўскай эпапеі».

Эпапея — гэта паэма «Пан Тадэвуш».

Паэма, задуманая спачатку як сельская ідылія, была паэтам у працэсе творчага ўзлёту і настойлівай працы над ёй непазнавальна пашырана і паглыблена ў сваім ідэйна-тэматычным змесце. І так як у класічнай рускай літаратуры «Яўгеній Анегін» А. С. Пушкіна, і яна стала ва ўсёй класічнай польскай літаратуры энцыклапедыяй нацыянальнага жыцця. У адным са сваіх публіцыстычных артыкулаў, напісаных у эміграцыі незадоўга да сваёй смерці, Міцкевіч выказваў думку аб вытоках сваёй творчасці з глыбінь жыцця, з акаляючага пісьменніка асяроддзя простага люду. Ён заўважыў, што ў яго разуменні народ — гэта тыя, што працуюць самі, хто крывавым потам і мазалём здабывае свой хлеб надзённы. І менавіта гэтаму народу ў першую чаргу аддаў «пясняр Літвы» не толькі ўсё лепшае ў сваёй творчасці, а і сваё складанае, поўнае высокіх радасцей і найглыбейшых пакут жыццё.

Напісаўшы ў 1832—1834 гг. «Пана Тадэвуша», як ён прызнаваў сам, «на парыжскім бруку, замкнуўшы дзверы ад шуму Еўропы», Міцкевіч як паэт замоўк назаўсёды. Паэма была яго лебядзінай песняй. Але якою песняй! Трыбун свайго народа — ён па паходжанні быў сынам нязначнага па тагачасных рангах судовага служачага-адваната, — Міцкевіч адлюстраваў у гэтым сваім вялікім творы быт, норавы і звычаі, філасофскія погляды і палітычныя ідэалы шляхты з такой паўнатой і ў такіх цёпла-насмешлівых тонах, што гэты твор, як шэдэўр знакамітага жывапісца, на вякі застаецца непераўзыдзеным помнікам культуры. Культура і мова гэтай шляхты была польская. Але ж навокал яе калыхалася і жыло сваім працавітым жыццём мора простага народа, блізкага па мове, быту і звычаях — у пераважнай большасці беларусаў. І ён, гэты народ, гэтае акаляўшае паэта асяроддзе, не мог у пэўнай меры не ўвайсці ў «чыстыя пакоі шляхецкай гісторыі 1811—1812 гадоў». Пры глыбокім і ўдумлівым прачытанні паэмы мы з поўным правам можам сказаць — увайшоў! Сляды, што сведчаць аб такім уваходзе, мы знаходзім у многіх радках і паасобных раздзелах твора. І больш таго, гэтыя ж радкі і раздзелы сведчаць, што візіцёры-суседзі гасцінна і хлебасольна прымаліся гаспадаром. Знаходзячыся ў эміграцыі, як незагойную рану ў сэрцы, паэт насіў тугу па родным краі, аб чым шчыра прызнаваўся ў першых радках першай кнігі паэмы: «тугою па табе я вобраз твой ствараю».

Ды што даказваць агульнавядомыя ісціны!.. Усё гэта і больш доказна, больш красамоўна і пераканаўча можа сказаць сам паэт радкамі з «Пана Тадэвуша». Над перакладам гэтага твора я цяпер працую і прапаную ўвазе чытачоў два ўрыўкі з перакладзеных першых шасці кніг твора.

Язэп СЕМЯЖОН.

Дом Міцкевіча ў Навагрудку.

Возера Свіцязь.

Туганавічы. Дом Марылі.

Адам МІЦКЕВІЧ

ПАН ТАДЭВУШ

СТАРОНКІ З ПАЭМЫ

«ЛЯСЫ СВАЁЙ ЛІТВЫ...»

З КНІГІ III-ЯЙ

...І Тэлімены з Графам, хвалячы бясконца
Блакіт нябёс чужых, сінь мора, шчодрасць сонца
І ганячы сваё ўсё спрэс — о край нявінны!—
Вярнулі на цябе і горы, і даліны.

А глянуць бы наўкол — як вока скіне
Стаяць у марыве блакітна-сінім
Лясы сваёй Літвы, дзе хмель зялёны
Абвіў вянком чарэмшыны і клёны;
Там і рабіны ў гронках, як пастушкі
Ў чырвоных пацерках, пруты-вітушкі
Ляшчэўніку, чібы жазлы менады,
Убраныя ў арэшкі для прынады.
Скрозь па лагчынах—драбяза лясная:
Ажына чарнавусная ўгінае
Калючы куст, каб цмокнуцца з малінай,
А глог абняўся голлямі з калінай.
Атожылкамі, суччам і вярхамі
Спляліся дрэвы з хмызам, як рукамі
Сплятаюцца і хлопцы, і дзяўчаты
Ў народным танцы ў храмавае свята.
Паводдаль, выдзяляючыся станам
І ўборам, па абліччы падабраным,
Стаіць бяроза з ясенем, аж люба
Глядзець — пад ручку, парачка да шлюба!
Узбоч, нібы дзяды — з пацехі ўнукаў,
Любуюцца гурты паважных букаў
На гэты карагод; з ускрайку поля
Мажныя і цікаўныя таполі
Сюды, каб змога, беглі б па-суседску;
І дуб на ўзлессі чуб па-маладзецку
Устапырыў — зараз гайсану к гулякам,
Хсць векам пяцісотгадовы з гакам!

«МІЖ ТЫХ ПАЛЁЎ...»

З КНІГІ VI-АЙ

Бы спадцішка, наплывам над зямлёю
Ўстае світальная зара. За ёю
Бярэцца з прыцемку дзянёк нясмела,
Яшчэ ахутаны туманам белым.
Імгла вісіць, як навісь стрэх замшэлых
Над вокнамі хацінак па надзелах
Вакольных вёсак, што ў нямой маркоце
Шарэюць, нібы купіны ў балоце.
Але штораз ясней, ясней на ўсходзе
І, прадракаючы — не быць пагодзе
Над гэтым кутам сумным, занядбаным!—
Зірнула сонца позіркам заспаным.

Заспала сонца, то і ўсе заспалі:
Кароў на пашу позна выганялі,
І зачакалася трава ў расіцы
Рагуль, красуль; дазволілі спазніцца
Сабе і ўсім сваім патомкам шэрым
Зайцы, што ў градах познюю вячэру
Да самага світання расцягнулі
І зацемна ў кусты не сіганулі.
Сядзяць, хрумсаюць моркву і капусту,
Але пара, пара канчаць распусту.
Пакуль не гаўкнуў недзе ля дарогі
Сабака пастухоў — дай, божа, ногі!

І ў лесе каб што шорхнула ад страху.
Лес анямеў, як быццам горлы птахаў
Застуджаны начною прахалодай.
Аднак вунь там, дзе за гнілой калодай
Блішчыць выжарына, і жыраванне
Спусціўся жораў і бязмоўнасць рання
Парушыў, закурлыкаўшы сяброўцы.
Услед за ім сарокі з куп ядлоўцу
Ўзяліся стракатаць. Праз трэск сарочы
Ужо чуваць: вароны гразь прарочаць.
Але хоць птаства непагадзь вяшчуе,
Благіх прароцтваў сельскі люд не чуе.

Пакуль касьба, жніво — не ведай зморы
І не чакай пагоды яснай з мора.
Сцямна з сярпом у полі ці з касою
Не лузе ўсе — стары, малы. З расою
Кладуцца жменькі ў сноп на перавясла.

Хоць ранак затуманены, няясны,
А песня з постацей над беднай нівай
Тужліва льецца. Лірай гаварлівай
Жалкуе песня жніўная, што стала
Душою той жняі, якая склала
Яе за прасніцай ці ў жытнім полі,
Журботную, а мілую — да болю!

Пераклаў з польскай
Язэп СЕМЯЖОН.

НА ПАШТОЎКАХ— ЯГО РОДНЫЯ МЯСЦІНЫ

Пра жыццё і творчасць Адама Міцкевіча, пра яго радзіму — Навагрудчыну—выдадзена шмат кніг і альбомаў з фотаздымкамі і рэпрадукцыямі твораў мастакоў. Адным з самых каштоўных матэрыялаў гэтай мастацкай Міцкевічыяны з'яўляецца серыя паштовак, выпушчаная ў пачатку XX стагоддзя выдавецтвам Стадзіевіча ў Вільні.

На адной з іх—дом, у якім прайшлі дзіцячыя і юнацкія гады паэта. Будынак не адрозніваецца ад цяперашняга, аднаўленага пасля разбурэння яго фашысцкімі захопнікамі. Вось толькі газавыя ліхтары на слупах ля ганку ды старыя будынкі побач гавораць пра мінулае гэтых мясцін.

На другой паштоўцы — краявід возера Свіцязь у ваколіцах Туганавіч. На ёй на польскай мове надрукаваны ўрывак з балады «Свіцязь». У перакладзе А. Бялевіча ён гучыць так:

Калі навагрудскія ўбачыш
прасторы,
Ракітнік разгалісты, нізкі,—
Каня супыні між
плужынскага бору,
Каб глянуць на возера
зблізку.
Гушчар лесу пахне чаборам
і мёдам,
Жывіцы настоем смалістым.
Там возера Свіцязь,
як шыбіна лёду,
Ляжыць паміж дрэваў
цяністых.

Вось паштоўка «Дом Марылі ў Туганавічах». У гэтым доміку сярод ліп, бяроз ды дубоў жыла Марыля Верашчака, якая запаліла вялікую любоў у сэрцы паэта. На жаль, будынак таксама знішчаны ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Не меншую каштоўнасць мае паштоўка з бярозай А. Міцкевіча ў Туганавіцкім парку. Тут паэт упершыню сустрэўся з Марыляй, тут яны не раз чыталі разам Русо. Пра гэта гавораць радкі з паэмы «Дзяды», прыведзеныя на паштоўцы.

У гэтай серыі выдавецтвам Стадзіевіча былі выпушчаны яшчэ некалькі паштовак: альтанка Міцкевіча, дарога з Туганавіч да Свіцязі і інш.

Вячаслаў ЦЕЛЕШ.

г. Рыга.

Міцкевічава бяроза ў Туганавіцкім парку.

Рэпрадукцыі паштовак з калекцыі аўтара.

ТУДЭМА—СЮДЭМА...

ДЗІВАК–ЧАЛАВЕК...

Мал. П. КОЗІЧА.

БОЕПРЫПАСЫ ЗАЎСЁДЫ ПАТРЭБНЫ

З паляўнічых баек *Януша АРЫНІЧА*

Неяк мой Бобік прыхварэў. А на вуліцы такое надвор'е, што ніяк не ўтрымацца дома. Ускінуў на плячо ружжо трохствольнае і пакрочыў я ў бліжэйшы лясок. З бліжэйшага ляска ў наступны, а потым яшчэ далей падаўся. Дзічыны навокал поўна-поўна. То цецярук уздымецца на ўзлеску, то шарак у полі з-пад куста ўсхопіцца, то рыжуха дарогу перабяжыць. Толькі душой я адчуваў, што галоўнае яшчэ наперадзе. Іду, іду і рыхтуюся ў думках да галоўнай баталіі, значыць. Хадзіў, хадзіў, у роце перасохла зусім. Успомніў, недзе крынічка ёсць тут. Адшукаў сцяжынку. Набліжаюся да крынічкі. Іду і адчуваю насалоду, як гэта мне зараз лёгка стане ад гаючай вады.

Вось і яно, люстэрка незамярзаючае. Паклаў я стрэльбу. Лёг на хваёвыя лапкі і да вады — п'ю, не нап'юся. Прыпаў раз, потым другі. А затым і трэці. Ад асалоды вочы зажмурыў...

Адчуваю — нехта стаіць каля мяне. Адкрываю вочы — ажно нейкі барадач стаіць. Абрадаваўся я. Думаю, у глухім лесе з чалавекам спаткаўся. Кожнаму прыемна.

— Піце, калі ласка,— гавару, падымаючыся. Падняўся на ногі, гляджу: што за дзіва — гаспадар лесу перада мной, мядзведзь, значыць. Я да стрэльбы. Ды не тое тут было. Прыгледзеўся: ружжо маё трохствольнае мядзведзь трымае. Думаю: брэшаш, хоць ты і ўзброены, а страляць не ўмееш. Я яго за правую лапу ўхапіў, ды праз сябе. На гарошыннi звер рассыпаўся. У прыгаршчы яго б не сабраў. Я за стрэльбу ды дадому.

Добра, што бярог боепрыпасы.

Запісаў М. МІНЧАНКА.

ФРАЗЫ

Прадмовамі дабіўся месца наперадзе аўтара.

●

Разводзіць можна не толькі кветкі, але і плёткі. Апошнія больш жывучыя.

●

Археолагу пустата часам гаворыць аб каштоўным скарбе.

●

Калі пісьменнік звёў канцы з канцамі, атрымаўся добры пачатак.

Д. НАХАМКЕС.

МІЖ ІНШЫМ

Проба пяра? 960-ая!

●

Замоўчванне крытыкі — самая гучная інфармацыя для роздуму.

●

Выйшла з друку нецікавая кніга? Шукай падтэкст...

●

Не ведаеце, чаму ў графаманскіх вершах часцей за ўсё выкрываюцца графаманы? Бо кожны піша аб тым, што добра ведае.

●

Паэтычныя знаходкі на дарозе не валяюцца. Іх можна накалупаць у фаліянтах продкаў. Але класікаў ігнаруйце: іх ведаюць.

●

Сачыце, каб на творчай кухні была такая колькасць солі, пры выпадковым ужыванні ўсёй наяўнасці якой не атрымаўся б перасол. Цукру павінна захоўвацца стольні, каб у аварыйных сітуацыях страва, якую вы рыхтуеце, не зрабілася прытарна салодкай. Найбольшай жа ўвагі заслугоўвае перац: ён узбуджае апетыт спажыўца. Калі першае добра паперчана, дык і перасоленае другое і перасалоджанае трэцяе заглынецца без усялякіх прэтэнзій.

М. ШКЛЯР.

Віктар ШЫМУК

ПАРОДЫЯ

БАЛОТЦА

Было яшчэ балотца, дзе лавілі
Мы за хвасты цяжкіх
цецерукоў,
Кашамі выграбалі журавіны,
Знаходзілі пазіцыі грыбоў.

Уладзімір КАРЫЗНА.

А мы былі, браткі, такія
хлопцы,
Усё было тады нам ні па чым.
Цягнулі мы, што трапіла,
з балотца —
І каламуць, і ціну і карчы,

Баброў і жаб, і п'явак,
і трытонаў,
Стракоз, жукоў, мурашак,
камароў.

Яшчэ ў кашы мы рвалі мох
зялёны,
І я ж кажу, цягнулі ўсё дамоў.

Назаўтра зноў мы беглі
да балотца,
Каб выграбсці пазіцыі грыбоў.
І вось пішу пра гэта вершы,
хлопцы,
Лаўлю іх за хвасты,
што будзь здароў!

Віктар ШАЎЧЭНКА

СОННІК

Калі вам прыснілася шыкоўная закуска і заморская выпіўка, чакайце рэвізора.

●

Калі вам прыснілася разбітае шкло, не пазбегнуць вам выкліку ў школу.

●

Калі вам прысніўся вялікі натоўп людзей, то гэта к таму, што ў краму завязуць дзіцячыя калготкі.

●

Калі вам прыснілася, што вы гадзіну едзеце ў тралейбусе, потым перасядаеце ў прыгарадны аўтобус, потым дваццаць кіламетраў крочыце пехам, то гэта значыць, што раніцой вам давядзецца быць у сваім гаражы.

ТЛУМАЧАЛЬНЫ СЛОЎНІК

МАЛАТОК — ток малой сілы.
АТАМАН — вучоны, які займаецца атамнай фізікай.
ЧАКАНКА — жанчына, якую чакаюць.
ЦЯМНІЛА — ноч.
ПАКАЗЧЫК — манекен.
РУЧНІК — прыручаны звер.
ЦЫРКУЛЬ — артыст цырка.
РОЛІК — акцёр тэатра і кіно.

Леанід ПРАНЧАК.

Васіль ЖУКОВІЧ

За сцяной

За камунальнаю сцяной,
Нібы прасцінка, тонкай,
Суседзі, хворыя адной
Мяшчанскай завядзённай.

Як забрынчыць магнітафон —
Ратуйце перапонкі!..
Стварае так «культурны» фон
Сямейка — муж і жонка.

Матывы бойкія чуваць
Ажно да позняй ночы.
«Суседзяў трэба паўшчуваць,
Сказаць адкрыта ў вочы...»

Змагаюся — не ўтаймаваць
Ні жартамі, ні кпінам.
«А што, калі паспрабаваць
Па метаду: клін клінам?..»

Крыніцу гукаў трэба мне,
Ды не які там мізэр!
І на ўсю моц я — пры сцяне—
Уключаю тэлевізар.

Дапамагло! Дальбог!
(Адно
З бядой другой як справіцца?)—
Так стала ціха, аж чутно,
Як за сцяною сварацца.

Як сустрэў Піліпка свята

Была прычына: заўтра свята.
Піліп сустрэў, ды ранавата.
Сустрэў, вядома, не адзін —
Былі сябры. Было іх многа.
Было кафэ. Быў магазін.
Была ў калдобінах дарога,
Былі завулкі і вуглы,
І нават быў сабака злы.
Пазней не стала ні душы,
І толькі ліпка пры шашы.
Зялёненькую, маладую
Піліпка моцненька абняў,—
За жонку мілую прыняў,
Шаптаў, між іншым:
«Расцалую!
Цябе... адной мне нестае!..»
Так і прачнуўся ля яе.

ДЗІВАК–ЧАЛАВЕК...



Мал. М. ШЫШЛОВА.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

«ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА»

Выходзіць па пятніцах на шаснаццаці старонках.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

Індэкс 63856 12345678910 12345678910 АТ 07488

Адрас рэдакцыі: 220600, ГСП, Мінск, вул. Захарава, 19.

Тэлефоны: прыёмнай рэдакцыі — 33-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 33-25-25, адказнага сакратара — 33-44-04, аддзела грамадска-палітычнага жыцця і інфармацыі — 33-22-04, аддзела прозы і паэзіі — 33-24-62, аддзела крытыкі і бібліяграфіі — 33-24-62, аддзела тэатра, кіно і музыкі — 33-21-53, аддзела выяўленчага мастацтва, архітэктуры і вытворчай эстэтыкі — 33-21-53, аддзела культуры — 33-24-62, аддзела пісем і масавай работы — 33-22-04, выдавецтва — 23-52-85, бухгалтэрыі — 23-77-65.

Рукапісаў рэдакцыя не вяртае.

Галоўны рэдактар Алесь АСІПЕНКА.

Рэдакцыйная калегія:

Заір АЗГУР, Ефрасіння БОНДАРАВА, Барыс БУР'ЯН, Мікола ГІЛЬ (адказны сакратар), Уладзімір ГНІЛАМЁДАЎ, Юрый ГРЫГОР'ЕЎ, Канстанцін ГУБАРЭВІЧ, Васіль ІВАШЫН, Віктар КАВАЛЕНКА, Аляксандр КАПУСЦІН (намеснік галоўнага рэдактара), Уладзімір НЯФЁД, Нічыпар ПАШКЕВІЧ, Аляксей ПЫСІН, Міхаіл САВІЦКІ, Барыс САЧАНКА, Язэп СЕМЯЖОН, Юрый СЕМЯНЯКА, Мікола ТКАЧОЎ, Юлія ЧУРКО.